22 чэрвеня — не толькі дзень летняга сонцастаяння. Гэта дзень пачатку Вялікай Айчыннай і дзень смерці народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава: сёлета ўжо 10 гадоў, як яго не стала. СТАР. 5

На «Беларусьфільме» распачаліся здымкі дзіцячай стужкі «Палескія рабінзоны, альбо Цуда-востраў». Разам з вядомымі акцёрамі ў фільме здымаецца і юны варатар футбольнага клуба «БАТЭ-2». СТАР. 5

Клаўдзіі Андрэевай было толькі 17, калі пачалася вайна. Дзяўчына спатрэбілася ў арміі, бо ўмела друкаваць на машынцы. Разам з гэтай машынкай яе і забралі ў 122-гі знішчальны авіяцыйны полк. СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

22 ЧЭРВЕНЯ 2013 г. СУБОТА № 114 (27479) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

УЗНАГАРОДЫ ЗА ПЛЁННУЮ ПРАЦУ

Ордэнаў, медалёў і ганаровых званняў удастоены 77 прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці за шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў і высокае прафесійнае майстэрства. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 20 чэрвеня падпісаў указ № 279 «Аб узнагароджанні дзяржаўнымі ўзнагародамі».

Ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджаны генеральны дырэктар беларуска-германскага сумеснага прадпрыемства «Санта Імпэкс Брэст» Аляксандр Машэнскі і генеральны дырэктар ТАА «Трайпл» Юрый Чыж.

Начальнік упраўлення дэлімітацыі і дэмаркацыі дзяржаўнай граніцы Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Аляксандр Архіпаў узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» II ступені.

У ліку ўзнагароджаных ордэнам Пашаны — першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Віктар Садоўскі, ордэнам Францыска Скарыны — мастак-жывапісец член Беларускага саюза мастакоў Віктар Грамыка, медалём «За працоўныя заслугі» — вадзіцель аўтамабіля гродзенскага гарадскога ўнітарнага вытворчага прадпрыемства «Спецыялізаваная аўтамабільная гаспадарка» Мечыслаў Амяльянчык, медалём Францыска Скарыны — старшыня савета грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд культуры» Уладзімір Гілеп.

Ганаровае званне «Народны артыст Беларусі» прысвоена артысту-вакалісту (салісту) — вядучаму майстру сцэны Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь Васілю Кавальчуку.

У ліку тых, хто ўдастоены ганаровага звання «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь» — артыст-вакаліст, вядучы майстар сцэны заслужанага калектыву «Нацыянальны акадэмічны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь» Наталля Тамела.

Ганаровага звання «Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь» удастоены мастак-жывапісец член Беларускага саюза мастакоў Уладзімір Гардзеенка.

Прафесару кафедры лагістыкі і цэнавай палітыкі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Ірыне Паляшчук прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь».

Заслужаным работнікам адукацыі Рэспублікі Беларусь стаў прафесар кафедры аграбізнесу Беларускай дзяржаўнай ордэнаў Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчай акадэміі Віктар Абуховіч.

Першаму намесніку старшыні Гродзенскага аблвыканкама Івану Жуку прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь».

Прэзідэнт таксама прысвоіў ганаровае званне «Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь» трэнеру-выкладчыку па веласпорце Гомельскай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву № 1 Беларускага фізкультурна-спартыўнага таварыства «Дынама» Анатолю Барцу.

Акрамя таго, у адпаведнасці з распараджэннем кіраўніка дзяржавы аб'яўлена падзяка Прэзідэнта Беларусі старшыні Докшыцкага райвыканкама Алегу Пінчуку і 6 супрацоўнікам Камітэта дзяржкантролю.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

БУКЕТ ДА СЁМУХІ

Жыхары вёскі Дзятлавічы Лунінецкага раёна Мікалай і Алена ЯСКЕВІЧЫ рыхтуюцца ўпрыгожваць сваю сядзібу напярэдадні праваслаўнай Сёмухі.

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ЛАСІЦКІ, намеснік міністра аховы здароўя:

«Міністэрства аховы здароўя працуе над паляпшэннем сістэмы дыферэнцыраванай матэрыяльнай ацэнкі якасці і ўзроўню спецыялістаў не толькі ў частцы выканання імі высокатэхналагічных аперацый, але і ведання замежнай мовы, выканання навуковых праектаў, клінічных выпрабаванняў, напісання навуковых прац. Мы пастаянна ўзнімаем пытанне аб павышэнні ўзроўню заработнай платы як урачоў, так і сярэдніх медыцынскіх работнікаў. Сёння на разгляд і ўзгадненне з міністэрствамі эканомікі і фінансаў вынесены тры розныя прапановы па сістэме стымулявання і павышэння заработнай платы медыкам».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.06.2013 г.

Долар ЗША	8740,00	▲
Еўра	11550,00	▼
Рас. руб.	267,00	■
Укр. грыўня	1072,92	▲

Міхаіл ГУСМАН:

«ІНТЭРНЭТ — ТОЛЬКІ СРОДАК КАМУНІКАЦЫІ...»

Спачатку ён пазнаёміўся з нашай газетай. Пасля мы пазнаёміліся асабіста. Міхаіл Гусман, адказны сакратар Сусветнай асацыяцыі рускай прэсы, вельмі зацікавіўся выставай падпольнага друку ў Беларусі ў 1941-1944 гадах, што адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы, калі там праходзіла пленарнае пасяджэнне Сусветнага кангрэса рускай прэсы. Таму, калі я падышоў да мэтра журналістыкі і прадставіўся як карэспандэнт «Звязды», Міхаіл Саламонавіч паляпаў па маім плячы і з усмешкай папытаўся: «Гэта тая газета, што выходзіла ў вайну?» Кажу, што так: газета-партызанка. Гэта вельмі спадабалася майму новаму знаёмаму, і ён з ахвотай згадзіўся пагутарыць. Аднак размова ішла аб Беларусі, сучасным стане журналістыкі і яе будучыні.

— Цікава, як часта вы бывалі ў Беларусі? Якое ў вас уражанне ад нашай краіны?

— Бываю я тут па меры магчымасці і па закліку сэрца. Часта, вядома, не атрымліваецца, але адзін-два разы на год мае прафесійныя інтарэсы прыводзяць мяне ў Беларусь.

— А чым абумоўлена тое, што Сусветны кангрэс рускай прэсы праходзіць у Мінску?

— Па-першае, тым, што тут яго яшчэ не праводзілі... Кангрэс праводзіўся ўжо ў чатырнаццаці гарадах і краінах, але тое, што ў Беларусі яго яшчэ не было ні аднаго разу, на маю думку, несправядлівасць. Таму можна сказаць, што, нарэшце, ён праводзіцца ў Мінску.

— У вас з Мінскам звязаны якія-небудзь асабістыя ці прафесійныя ўспаміны?

— Мінск — сам па сабе выдатны горад. Я яго любіў і ў савецкі час, і зараз люблю. Гэта чароўны, чысты, добры горад, з добрай аўрай, таму да Мінска сэрца заўсёды імкнецца.

— Ці знаёмы вы з беларускай журналістыкай? Як да яе ставіцеся?

— Журналістыка — шырокае паняцце. Не магу сказаць, што я вялікі знаўца беларускай прэсы, але часам чытаю вашы газеты, гляджу тыя ці іншыя тэлепраграмы. Мне здаецца, што журналістыка ў Беларусі жыве дастаткова актыўным жыццём. І журналісты тут заўсёды былі і ёсць вельмі прафесійныя і моцныя. Для мяне Беларусь — адно з самых моцных месцаў рускамоўнай журналістыкі. СТАР. 2

■ Адкрый Беларусь!

БРЭСЦКАЯ КРЭПАСЦЬ: тут кожны камень — помнік героям

Прыцягненне як мага большай колькасці турыстаў у Беларусь — імкненне добрае. Што толькі дзеля гэтага не робім!.. Будуем інфраструктуру, даводзім да ладу тэрыторыі, рамантуем будынкі, рэанімуем і ствараем легенды... Але пры гэтым заўсёды не задумваемся над тым, што не менш важна ведаць сваю краіну самім. На жаль, нашы суайчыннікі, за рэдкім выключэннем, мала ведаюць пра яе славутасці і наўрад ці адразу ўзгадаюць больш за два-тры знакавыя месцы. Хаця насамрэч іх у нашай краіне (як, прынамсі, у любой іншай) вельмі шмат. Прычым, гэта зусім не абавязкова велічныя будынкі «з гісторыяй» накшталт храмаў і палацаў. Сціплы помнік Соф'і Гальшанскай у Ашмянскім раёне ці Блакітная крыніца пад Слаўгарадам не менш цікавыя, чым неагатычны касцёл у Гервятах ці Свята-Сімяонаўскі сабор у Брэсце.
З дапамогай новай рубрыкі мы пастараемся «адкрыць» для вас як мага больш такіх — цікавых і незвычайных — месцаў у роднай краіне. Адкрыць Беларусь. Паказаць яе такой, якой, магчыма, вы яе яшчэ не бачылі. Расказаць пра яе палацы, храмы і помнікі, пра дзіўныя ландшафты, пра цуды, створаныя самой прыродай... Мы запрашаем кожнага з вас у гэта дзіўнае і захапляльнае падарожжа. Таму што менавіта з ведання, з разумення сваёй краіны і пачынаецца патрыятызм — простае і адначасова вялікае пачуццё любові і прывязанасці да месца, дзе ты з'явіўся на свет...

Брэсцкую крэпасць ведаюць у многіх краінах свету. Тут пачыналася вайна. Тут вораг адчуў першае супраціўленне на нашай зямлі. Звыш дваццаці мільёнаў чалавек наведалі мемарыяльны комплекс за гады яго існавання. Усё большую папулярнасць у турыстаў набывае мерапрыемства, якое праходзіць у чатыры гадзіны раніцы штогод 22 чэрвеня.

А палове чацвёртай, калі з розных канцоў абласнога цэнтра пачынаюць падцягвацца сюды гараджане, яшчэ стаіць начны змрок, не пяюць птушкі. Цішыня падаецца напружанай і трывожнай. Пачуццё нарастае, калі з дынаміка манумента «Зорка» даносіцца голас Левітана з такімі знаёмымі словамі «Сёння, 22 чэрвеня 1941 года, у чатыры гадзіны раніцы...»

Гэтая фанаграма заўсёды ўзнаўляе ў маёй памяці аднойчы прачытаны ў музеі крэпасці і занатаваны фрагмент мемуараў нямецкага гісторыка Карэла, дзе ёсць апісанне апошніх хвілін перад вайной. Чалавек, які пазней стаў пісьменнікам, прыйшоў у Брэст з тымі, якія прынеслі смерць і разбурэнне. Аўтар кнігі «Вайна Гітлера з Расіяй» апісвае доўгія імгненні перад пачаткам вайны. «Было тры гадзіны 12 мінут. Кожны глядзеў на цыферблат. У кожнага быў камяк у горле. У кожнага пачашчана білася сэрца. Цішыня была невыноснай. Тры гадзіны 13 мінут. Яшчэ было не позна змяніць ход падзей. Пачатак незваротнага яшчэ не адбыўся. Але далей паўзлі па цыферблаце мінутныя стрэлкі, і вайна супраць Савецкага Саюза, які ляжаў наперадзе, у мёртвай цішыні, набліжалася няўхільна. Тры гадзіны 14 мінут. Як прывід, драўляная вежа Вулькі Дабрыньскай вызначалася на фоне неба. Першае бледнае святло з'явілася на гарызонце. Мёртвая цішыня ўсё яшчэ панавала па ўсім участку групы армій «Цэнтр». Лясы спалі. Палі былі спакойныя... Роўна ў 3.15 пачаўся ўраган і пранёсся над нашымі галовамі з такой сілай, якой мы ні разу не адчулі ні да гэтага, ні ва ўсім наступным ходзе вайны. Гэты гіганцкі канцэнтраваны агнявы вал літаральна скалануў зямлю. Над цытадэллю, як грыбы, выраслі густыя чорныя фантаны зямлі і дыму». СТАР. 3



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

НА АКЦЫІ ПРАТЭСТУ Ў БРАЗІЛІІ ВЫЙШЛА БОЛЬШ ЗА МІЛЬЁН ЧАЛАВЕК

Масавыя пратэсты ахапілі больш за сотню гарадоў у Бразіліі. Колькасць дэманстрантаў перавысіла мільён чалавек, перадаюць інфармагенцтвы. Падчас пратэстных выступленняў у бразільскай сталіцы, горадзе Бразіліа, маніфестанты спрабавалі прарвацца да парламента і прэзідэнцкага палаца. Аднак паліцыі і ваенным удалося адціснуць іх. Пасля гэтага пратэстанты паспрабавалі ўзяць штурмам будынак Міністэрства замежных спраў, закідваючы яго камянямі і петардамі. Паліцыя, якая ахоўвала знешнепалітычнае ведамства, выкарыстала дубінкі і слёзатачывы газ. У выніку два чалавекі былі арыштаваны, каля дзесяці атрымалі раненні. Масавыя акцыі пратэсту супраць карупцыі і сацыяльна-эканамічнай палітыкі ўлад пачаліся пасля таго, як на пачатку чэрвеня ў Сан-Паўлу і Рыа-дэ-Жанэйра былі павышаны цэны на квіткі ў грамадскім транспарце. Пад націскам масавых выступленняў улады двух мегаполісаў прынялі рашэнне знізіць кошт праезду да майскага ўзроўню, аднак акцыі пратэсту працягваюцца. Удзельнікі маніфестацый цяпер прад'яўляюць больш шырокія сацыяльна-эканамічныя патрабаванні, у тым ліку і паляпшэнне сістэм аховы здароўя і адукацыі, супрацьдзеянне карупцыі ва ўладных колах.

У ПОЛЬШЧЫ ПРЫ СУТЫКНЕННІ ТРАМВАЯЎ ПАЦЯРПЕЛІ 25 ЧАЛАВЕК

У горадзе Вроцлаў, што знаходзіцца ў паўднёва-заходняй частцы Польшчы, адбылося лабавое сутыкненне двух трамваяў. У выніку каля 25 пасажыраў пацярпелі і былі накіраваны ў бальніцы на дыягностыку. Прычыны аварыі высвятляюцца.

КАЗАХСТАН ПЛАНУЕ РАЗВЯРНУЦЬ РАКУ ІРТЫШ

Міністэрства рэгіянальнага развіцця Казахстана выступіла з прапановай развярнуць раку Іртыш і накіраваць плынь у цэнтральную частку краіны, перадаюць інфармагенцтвы. Ідэя развароту ракі Іртыш разглядалася яшчэ ў часы СССР. Ваду па Іртышы прапаноўвалася накіраваць назад — у Казахстан, да Амудар'і і Сырдар'і. У 2012 годзе ідэя развароту Іртыша абмяркоўвалася ў Казахстане ў сувязі з праектам будаўніцтва Трансказахстанскага канала, але тады ініцыятыва выклікала шэраг крытычных заўваг. Дэталі праекта па развароце ракі пакуль не ўдакладняюцца. Вядома толькі, што праект будзе прадстаўлены ва ўрад да канца лета.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

НЕДАХОП ЗУБОЎ НЕГАТЫЎНА АДБІВАЕЦЦА НА ЯКАСЦІ ПАМЯЦІ



З узростам стан зубоў пагаршаецца, і чалавек пазбаўляецца некаторых з іх. На думку навукоўцаў, не выключана, што выпадзенне зубоў і ўзроставае зніжэнне якасці памяці могуць быць звязаныя, піша The Daily Mail. Імпульсы, якія ініцыіруюцца, калі чалавек перажоўвае ежу, паступаюць у гіпакампам — зону мозга, якая адказвае за ўспаміны. Чым менш зубоў — тым менш імпульсаў. Пры актыўным жаванні кроў пачынае актыўна паступаць у мозг, што пазітыўна адбіваецца на яго працы. Акрамя таго, недахоп зубоў прымушае людзей пазбягаць многіх прадуктаў, якія багатыя важнымі для мозгу элементамі. Такім чынам, колькасць зубоў вызначае якасць эпізадычнай памяці (падзеі з мінулага) і семантычнай памяці (фактычная інфармацыя).

КАРАТКА

Рэспубліка Беларусь учора ў мэтах выканання сваіх абавязацельстваў па крэдыце стэндбай Міжнароднага валютнага фонду ажыццявіла чарговае пагашэнне асноўнага доўгу ў памеры 54,7 млн СДР, што эквівалентна $83,6 млн.

Французскі канцэрн «Пежо Сітраен» вывучыць магчымасці арганізацыі ў Беларусі зборачнай вытворчасці аўтамабіляў.

Сем прыродных заказнікаў плануецца стварыць у краіне ў 2013 годзе. Яны будуць у розных кутках краіны і зойміць у асноўным водна-балотныя ўгоддзі.

У гонар урачыстасцяў 400-годдзя абраза Маці Божай Будслаўскай з 6 ліпеня ўводзіцца ў абарачэнне юбілейная марка (паштовы блок). Гашэнне маркі пройдзе ў касцёле Успення Прасвятой Дзевы Марыі ў Будславе ў час урачыстасцяў. Цырымонію правядзе пасланнік Папы Францыска кардынал Жан-Луі Таран.

Учора ўвечары на жаночым чэмпіянаце Еўропы па баскетболе зборная Беларусі ва ўпартай барацьбе абыграла каманду Вялікабрытаніі — 71:61.

З 1 ЛІПЕНЯ ПАВЫШАЮЦЦА ПЕНСІІ

З пачатку наступнага месяца сярэдняя пенсія па ўзросце складзе 2 174 000 рублёў. Мінімальная пенсія па ўзросце пры стажы 25 гадоў у мужчын і 20 гадоў у жанчын — будзе раўняцца 1 140 000 рублям. Памер максімальнай пенсіі па ўзросце пры індывідуальным каэфіцыенце заробку 4,0 і вышэй і стажы работы 45 гадоў у мужчын і 40 гадоў у жанчын — 3 311 000 рублёў.

Як паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы, адпаведны Указ № 278 «Аб павышэнні пенсій» Прэзідэнт Беларусі падпісаў 20 чэрвеня. Згодна з указам, у сярэднім працоўныя пенсіі павялічацца на 10,2%, пенсіі па ўзросце — на 10,4%. Выдаткі на выплату пенсій з ліпеня гэтага года, па словах **намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Валерыя КАВАЛЬКОВА,** павялічацца на 491 млрд рублёў у разліку на месяц. Фінансаванне гэтых выдаткаў будзе ажыццяўляцца са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Мінпрацы і сацыяльнай абароны Беларусі. Пры гэтым у Мінпрацы дадаюць, што пры павелічэнні бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва са жніўня будуць перапраглічаны мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі, надбаўкі, павышэнні і даплаты да пенсій.

Святлана БУСЬКО.



ISSN 1990 - 763X

ВУЧНІ І СТУДЭНТЫ ЗААХВОЧАНЫ СТЫПЕНДЫЯМІ І ПРЭМІЯМІ

Стыпендыямі і грашовымі прэміямі заахвочаны 235 таленавітых вучняў і студэнтаў. Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы, Аляксандр Лукашэнка 20 чэрвеня сваім распараджэннем зацвердзіў рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў.

Стыпендыі на другі семестр 2012/2013 навучальнага года ў памеры Br750 тыс. штомесяц прысуджаны 191 студэнту і курсанту ўстаноў вышэйшай адукацыі. Заахвочаны грашовымі прэміямі ў памеры Br2 млн. 8 пераможцаў Балтыйскага навукова-інжынернага конкурсу (Расія, 2013 год) і ў памеры ад Br400 тыс. да Br1 млн. 36 пераможцаў Беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды 2013 года. Як адзначылі ў прэс-службе, прыняцце распараджэння накіравана на забеспячэнне адраснай дзяржаўнай падтрымкі адораных вучняў і студэнтаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ПРЭЗІДЫУМ САЎМІНА АДОБРЫЎ КАНЦЭПЦЫЮ ПРАЕКТА ЗАКОНА АБ ДЗЯРЖАЎНА-ПРЫВАТНЫМ ПАРТНЁРСТВЕ

Канцэпцыя праекта закона аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве ў цэлым адобрана ўчора на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, якое прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Міхаіла Мясніковіча, перадае БЕЛТА.

Як праінфармаваў першы намеснік міністра эканомікі Анатоль Філонаў, прадстаўляючы канцэпцыю, дакумент павінен стаць асновай прававой базы, якая стымулюе развіццё ў Беларусі ўсіх форм дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Асноўнай мэтай падрыхтоўкі дакумента з'яўляецца садзейнічанне прыцягненню інвестыцый у эканоміку краіны, забеспячэнне эфектыўнасці выкарыстання маёмасці, якая знаходзіцца ва ўласнасці дзяржавы, развіццё навукаёмістых вытворчасцей, удасканаленне тэхналагічных працэсаў, развіццё аб'ектаў інжынернай, транспартнай і сацыяльнай інфраструктуры.

Законы аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве прыняты ў многіх краінах свету — Германіі, Польшчы, Японіі, Паўднёвай Карэі, Украіне, Малдове і іншых. У Расіі адпаведны мадэльны закон дзейнічае для рэгіёнаў. Прыняцце яго ў Беларусі створыць прававыя ўмовы для развіцця дзяржаўна-прыватнага партнёрства, прадаставіць дадатковыя магчымасці ўзаемадзеяння дзяржавы і суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці.

Як адзначыў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч, дакумент стане добрым знакам інвестарам, як нацыянальным, так і замежным. «Яны пераканаюцца ў тым, што мы паслядоўна рэалізуем прынцыпы шматукладнай эканомікі», — заявіў ён. Разам з тым кіраўнік урада даручыў распрацоўшчыкам дакумента дакладна вызначыцца па паняційнаму апарату, напісаць своеасаблівы гласарый. «Другое — гэта прадмет прававога рэгулявання, гэта значыць парадак работы, які павінен быць закладзены, — прадоўжыў прэм'ер-міністр. — Трэцяе — гэта ўвязка з дзеючым заканадаўствам».

■ Рэгіён

«БАЛЯВЫЯ КРОПКІ» ЛІДАРА

Гродзенская вобласць займае вядучыя пазіцыі па вытворчасці валавога рэгіянальнага прадукту ў 2012 годзе, ды і сёлета, як кажуць, трымае планку, лідзіруючы практычна па ўсіх паказчыках сацыяльна-эканамічнага развіцця. Разам з тым, мясцовая ўлада бачыць і імкнецца задзейнічаць існуючыя рэзервы. На некаторых «балявых кропках» старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА засяродзіў увагу на прэс-канферэнцыі для журналістаў рэгіянальных і рэспубліканскіх СМІ ў г.п. Вялікая Бераставіца.

Фота БЕЛТА.

БУДАЎНІЦТВА: аптымальны кошт і архітэктурная прывабнасць

Летась на Гродзеншчыне ў панэльным домабудаванні квадратны метр жылля быў самы танны ў краіне. Аднак у гэтай галіне шмат рэзерваў, вялікія страты — вынік хібаў у сістэме арганізацыі будаўнічага працэсу. Для параўнання Сямён Шапіра прывёў прыклад са сваёй працы начальнікам камітэта эканомікі Міністэрства сельскай гаспадаркі:

— Калі паўставала пытанне аб павелічэнні цэн на малако і мяса, я заўсёды ішоў у Міністэрства эканомікі, дзе павінен быў даказаць, чаму гэта патрэбна. Пастаянна была «барацьба», сутыкаліся інтарэсы сельгасвытворцаў і пакупнікоў іх прадукцыі. А ў будаўнічай галіне, па сутнасці, самі сабе ўстанаўліваюць каэфіцыенты кошту будаўніча-мантажных работ. Стварылі цэнтр па цэнаўтварэнні, і ён штомесячна ўстанаўлівае павышаючыя каэфіцыенты. Прычым, як правіла, гэтае павышэнне ідзе з апярэджаннем інфляцыі, росту цэн на будматэрыялы.

Пэўна, у вялікай ступені дзякуючы гэтым павышальным каэфіцыентам сярэдняя зарплата, напрыклад, на прадпрыемствах «Гроднапрамбуд» і «Гроднажылбуд» складае цяпер 7—8 мільёнаў рублёў. Але з іншага боку... На Гродзеншчыне спынены працэс, калі нашы будаўнікі ад'язджалі ў іншыя краіны — многія вяртаюцца. Трэба разумець, што калі зарплата будзе малой, то зноў пагоршыцца сітуацыя з кадрамі, якая і цяпер вельмі вострая. Напрыклад, таварыства «Гроднапрамбуд» зараз працуе на 102 аб'ектах агульным коштам каля 1,5 трыльёна рублёў. Будаўнікоў не хапае, яны літаральна нарасхват. Таму калі будзем ім менш плаціць, то менш будзем і будаваць.

— З аднаго боку, хочацца эканоміць, каб не павялічваўся кошт квадратнага метра аб'ектаў. А з іншага, трэба мець моцны будаўнічы комплекс. Тут неабходна такая сістэма цэнаўтварэння, такія «балансіры», якія б улічвалі ўсе інтарэсы, — лічыць Сямён Шапіра.

Пры гэтым трэба клапаціцца не толькі пра аптымальны кошт будаўнічых работ, але і пра архітэктурную прывабнасць аб'ектаў. Новыя мікрараёны не павінны быць як блізняты. Пасля крытыкі з боку старшыні аблвыканкама па гэтым пытанні кіраўніцтва прадпрыемства «Гроднажылбуд» паабяцала, што будуць выкарыстоўвацца разнастайныя праекты.

ЭКСПАРТ: не ўсе праблемы трэба звязваць з уваходам Расіі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю

Як вядома, цяпер далёка не лепшыя ўмовы для айчынных экспарцёраў свіны: закупачныя цэны ў Расіі рэзка зменшыліся. Аднак ці толькі з яе ўваходам у Сусветную гандлёвую арганізацыю звязаны нашы цяжкасці са збытам гэтай прадукцыі?

— Іх трэба звязваць у першую чаргу з нашым светапоглядам, які павінен мяняцца разам са зменнем сітуацыі на рынку, — зазначае Сямён Шапіра.

У азначанай праблемы некалькі складнікаў. Па-першае, вялікае значэнне маюць генетычныя асаблівасці жывёлы. У нашай свінагадоўлі пароды пакуль у асноўным такія, якія генетычна менш эфектыўныя ў параўнанні з шэрагам замежных вытворцаў — з пункту гледжання прывагі жывёлы і расходу кармоў. А адсюль і сабекошт вытворчасці. Таму айчынная свінагадоўля павінна ісці па шляху набыцця генетычна лепшых парод, што і робяць на шэрагу комплексаў, дзе сёння ўжо маюць паказчыкі сусветных лідараў. Як гэта адбылося, напрыклад, у птушкагадоўлі, дзе генетычны патэнцыял дазваляе працаваць на еўрапейскім узроўні суадносінаў паміж сярэднясутачнай прывагай і расходам кармоў.

І другі складнік: у многіх краінах Еўропы добра падтрымліваюць экспарцёраў. Хто прадае на экспарт — мае пэўныя датацыі ад дзяржавы. Напрыклад, рэалізуючы тую ж свініну, дапусцім, па 60 расійскіх рублёў за кілаграм, атрымлівае ад сваёй краіны яшчэ 20. А мы гэтага пакуль практычна не робім.

— Нам небходна гэта асэнсаваць і таксама выпрацаваць інструментарый па эканамічным стымуляванні экспарту, бо гэта развіццё эканомікі, рабочыя месцы, падаткі. Мяркую, мы да гэтага прыйдзем, — лічыць Сямён Шапіра.

ТАВАРНЫЯ ЗАПАСЫ: гэта не заўсёды кепска

У параўнанні з леташнім перыядам, запасы тавараў на складах прадпрыемстваў Гродзеншчыны ў цэлым не павялічыліся, хаця ў вобласці выраблена значна больш прадукцыі.

Прычым затаваранасць складоў гатовай прадукцыяй — гэта не заўсёды кепска. Напрыклад, прадпрыемства загадзя працуе на фарміраванне запасаў зімовага асартыменту калготак, бо калі пачаць гэта рабіць перад надыходам зімы, то не забяспечыш неабходныя аб'ёмы. Альбо што дрэннага, калі напярэдадні сезона масавага выкарыстання цукру на Скідальскім цукровым камбінаце ў наяўнасці — пяцімесячны запас гэтай прадукцыі?

Няма ў чым абвінавачваць, на думку Сямёна Шапіры, і кіраўніцтва Шчучынскага рамонтнага завода, дзе затаваранасць роўная... паўтарагадоваму аб'ёму вытворчасці. Праблема ў тым, што летась Міністэрства сельскай гаспадаркі заказала прадпрыемству льноўборачную тэхніку, аднак не знайшлося грошай, каб яе выкупіць. Трэба спадзявацца, што да сёлетняга сезона ўборкі льну дзяржава прыме меры, каб выкупіць гэтую тэхніку.

А вось прычыны больш чым пяцімесячных запасаў прадукцыі на Гродзенскім заводзе гандлёвага машынабудавання Сямён Шапіра бачыць найперш у адсутнасці сучаснага маркетынгавага светапогляду:

— Заходзіш у краму — там імпартныя воданагравальнікі. А дзе гродзенскія? Калі я працаваў дырэктарам агракамбіната, узнікла праблема з рэалізацыяй мяса птушкі. Дык мы аб'ехалі літаральна ўсе крамы, куды ажыццяўляліся пастаўкі. Пераконвалі, што попыт павялічыцца, калі прадаваць не замарожаную, а ахалоджаную прадукцыю. Заплацілі вялікія грошы за рэкламу агракамбіната на дзевятнаццаці сталічных тралейбусах. Людзі прызвычайваюцца да фірменнага значка вытворцы, а затым, у краме ўжо, так бы мовіць, на ўзроўні падсвядомасці выбіраюць гэты тавар. А хто бачыў у Гродне рэкламу мясцовага завода гандлёвага машынабудавання? Задача ўлады — берагчы кадры, але не дапускаць, каб з-за коснасці кіраўнікоў, якія быццам засталіся ў савецкай планавараз меркавальнай сістэме, неслі страты прадпрыемствы.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

■ Курсавая розніца

Еўра—долар: хто каго?

Барацьба паміж «амерыканцам» і «еўрапейцам» нагадвае перацягванне каната: канчатковай перамогі аднаго з іх пакуль не відаць і ўстойлівага становішча хоць на адным з бакоў таксама няма. Сусветны валютны рынак з замірaннем сэрца чакае, што ж будзе далей.

Федэральная рэзервовая служба ЗША працягвае дэманстраваць сваю рашучасць і паслядоўнасць, а макрастатыстыка пацвярджае эфектыўнасць выбранай манетарнай палітыкі. Гэта спрыяе таму, што долар расце. Еўразона пахваліцца пазітыўнымі справаздачамі, на жаль, пакуль не можа, а таму еўра на гэтым тыдні трошкі здаў свае пазіцыі. Усё гэта закрануло і курс нашай нацыянальнай валюты адносна долара і еўра. Першы падаражэў на 50 рублёў (плюс 0,6%) да 8740, другі патанеў на 40 рублёў (мінус 0,3%) да 11550.

Не менш цікавую сітуацыю можна назіраць у дачыненні да расійскага рубля. Пасля чутак у Расіі аб дэвальвацыі нацвалюты курс яе стаў падаць. Расійская эканоміка патрабуе стымулу і ёсць меркаванне, што ўлады для гэтага могуць выкарыстаць паслабленне рубля. Такім чынам, у Беларусі расійскі рубель таксама патанеў: на 6 беларускіх грашовых адзінак (мінус 2,2%) да 267 рублёў.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

БЫХАЎ ДА ДНЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА НОВАЕ АБЛІЧЧА

Аб гэтым заявіў журналістам намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль Тозік. Віцэ-прэм'ер правёў учора ў Быхаве пасяджэнне Нацыянальнага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства, перадае БЕЛТА.

Паводле слоў Анатоля Тозіка, ужо вельмі шмат зроблена па падрыхтоўцы да свята пісьменства ў Быхаве. Прыняты на першым пасяджэнні аргкамітэта ў лістападзе графік работ практычна поўнасцю выконваецца. Усе праблемныя бягучыя пытанні вырашаюцца аператыўна ў рабочым парадку. «Нідзе грошы не расходаваны марна. Мы будуем і рэканструюем аб'екты з такім разлікам, каб яны служылі быхаўчанам на працягу многіх гадоў. Па сутнасці, да 1 верасня горад набудзе зусім новае аблічча: актыўна вядзецца добраўпарадкаванне цэнтра, будуецца новы басейн, ідзе рэканструкцыя кінатэатра, Палаца культуры, будынкаў аўта- і чыгуначнага вакзалаў з добраўпарадкаваннем прылеглай тэрыторыі. Пачаты маштабныя работы па аднаўленні ўнікальнага помніка архітэктуры XVII стагоддзя — Быхаўскага замка», — сказаў ён.

Віцэ-прэм'ер таксама падкрэсліў, што работы па шэрагу аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры вядуцца з некаторым апярэджаннем установленага графіка, ніхто з падрадчыкаў не падвёў.

Фота БЕЛТА.

У Быхаве да Дня беларускага пісьменства ўстановяць скульптурную кампазіцыю, прысвечаную ўнікальнаму помніку беларускага пісьменства — «Баркалабаўскаму летапісу».

«ІНТЭРНЭТ — ТОЛЬКІ СРОДАК КАМУНІКАЦЫІ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Як вы лічыце, што чакае сусветную журналістыку ў будучыні? Інтэрнэт націскае на традыцыйныя медыя, але выціснуць пакуль не можа...

— Я не лічу, што ёсць такое паняцце як «інтэрнэт-журналістыка». Я прыхільнік традыцыйнай журналістыкі, працую ў традыцыйным інфармацыйным агенцтве, адным з класічных сусветных. Я не лічу, што інтэрнэт заб'е журналістыку, што знікнуць газеты, часопісы. Гэта ўсё няпраўда. Больш за тое, па нашых назіраннях, у шэрагу дзяржаў (Японія, Скандынаўскія краіны) друкаваная прэса развіваецца. Смерць традыцыйных медыя — міф.

На маёй памяці прадракалі пахаванне радыё, кіно, тэлебачання. І нічога не змянілася. Іншая справа, што інтэрнэт як сродак масавай камунікацыі (падкрэсліваю: не журналістыкі і не інфармацыі, а менавіта камунікацыі) стварае новы фармат існавання СМІ. Мы павінны гэта разумець, улічваць, выкарыстоўваць. Але я не бачу ў інтэрнэце канкурэнта. Інтэрнэт — гэта вельмі сур'ёзны тэхналагічны сродак, які не стварае канкурэнтнае асяроддзе, а павінен быць памочнікам у нашай працы.

— Людзі, якія выхаваны ў час інтэрнэту, для якіх ён не навіна, больш актыўныя, мабільныя ці не?

— Гэтае пакаленне — зусім іншае. Яно знаходзіцца ў абсалютна новым тэхналагічным асяроддзі, іншым фармаце жыцця. І я гэта разумею. Але хачу вас заверыць, што адной тэхналогіяй нельга перакрыць журналісцкую прафесію, якая складаецца з якасці пісьма, тэле- альбо радыёматэрыялу і іншага. Я хачу вас папрасіць, каб да сучасных тэхналагічных магчымасцяў вы ставіліся прыкладна так, як салдат да сучаснай зброі. Найноўшыя ваенныя прыстасаванні і зброя — гэта выдатная дапамога ў баявых дзеяннях, але ў аснове ўсяго — мужнасць і гераізм самога воіна. Такім жа чынам у асноўе журналістыкі ў любыя гады ляжаў перш за ўсё прафесіяналізм.

Даведка «Звязды»

Міхаіл Гусман — савецкі і расійскі журналіст, перакладчык і інтэрв'юер, радыё- і тэлевядучы. Першы намеснік генеральнага дырэктара ІТАР-ТАСС. Заслужаны работнік культуры Расійскай Федэрацыі (2001). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расіі (2002). Малодшы брат Юлія Гусмана. Нарадзіўся ў Баку (Азербайджан) 23 студзеня 1950 года.

— Атрымліваецца, маладому журналісту не трэба баяцца, што яго праз пару гадоў заменіць камп'ютар?

— Не, ніякі робат вас не заменіць. Вось я працую ў інфармацыйным агенцтве. Задача нашых карэспандэнтаў — з «пластоў» жыцця здабыць «сырую нафту» інфармацыі. Мы яе выкідваем на паверхню, а пасля газетчыкі зробяць з яе «керасін», часопісныя журналісты — «бензін», тэлевізіёншчыкі — «пластмасу», а радыйшчыкі — «мазут». Але ў аснове ўсяго ляжыць чалавек-карэспандэнт, які здабыў інфармацыю сваімі вачыма, сваімі рукамі. Аснова ўсяго — прафесійны журналіст.

З іншага боку, пастаўляць навіны сёння можа кожны. Ішоў чалавек па вуліцы, штосьці сфатаграфаваў на мабільны тэлефон, даслаў — і вось табе ўжо навіна. Але гэта проста сучасная форма падачы навін. Да журналістыкі гэта не мае ніякага дачынення.

— Значыць, паняцце «грамадзянская журналістыка» вы не ўспрымаеце?

— А я не разумею, што вы разумееце пад гэтымі словамі. Сацыяльныя сеткі? Пачакайце. Пры чым тут журналістыка ўвогуле? Гэта форма камунікацыі людзей у сучасных умовах. Выдатная форма. Я яе вітаю, але журналістыка — гэта прафесія. А што такое сацыяльныя сеткі? Усе людзі размаўляюць па тэлефоне. Давайце запішам іх размовы і назавём гэта журналістыкай. У выпадку з сацыяльнымі сеткамі ўсё выглядае такім жа абсурдным. Ну перапісваюцца людзі — выдатна. Але гэта не журналістыка, а форма камунікацыі. Яна важная, сучасная. Аднак не мае ніякага дачынення да прафесійнай журналістыкі.

— Ці можа вярнуць сабе былую моц публіцыстыка, якая зараз не надта шануецца?

— У сучасных найлепшых сусветных СМІ (The New York Times, The Times і іншыя) шмат выдатных калумністаў. У многіх расійскіх газетах — таксама.

— Але ж у асноўным гэта ўсё сталыя людзі, якія былі выхаваны яшчэ ў савецкі час...

— Разумееце, і раней былі маладыя і старыя журналісты. Маладосць — гэта часовы стан чалавека. Быць публіцыстам, калумністам маладому складана таму, што няма вопыту. Ва ўсім свеце публіцыстамі з'яўляюцца людзі са значным журналісцкім вопытам. Маладыя часцей бываюць рэпарцёрамі, аглядальнікамі. Так было і так будзе.

— Значыць трэба толькі пачакаць — і мы атрымаем новых, напрыклад, Аграноўскіх?

— Безумоўна. Публіцыстычны матэрыял патрабуе пэўнага майстэрства напісання. І такія тэксты павінны чытачамі ўспрымацца інакш — больш удумліва, уважліва.

— А як сучаснага чалавека навучыць чытаць уважліва? Не хочуць зараз людзі гэтага рабіць. Хуткія навіны іх больш цікавяць.

— Гэта, безумоўна, так. Але ж заўсёды будуць людзі, якія захочуць, каб у руках шамацелі старонкі газеты, часопіса... Тут тая ж сітуацыя, што і з кнігамі. Сёння любую кнігу можна прачытаць у інтэрнэце. Але ўсё роўна ёсць нават начныя кніжныя крамы, і там тоўпіцца моладзь. Значыць, не хочацца ім чытаць толькі з экрана.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

«Прамая лінія» з міністрам ЖКГ

На наступным тыдні ў рэдакцыі газеты «Звязда» пройдзе «прамая лінія» з міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэем Віктаравічам ШОРЦАМ.

Ці будуць сёлета расці тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі? Якія віды работ пры капрамонце павінны аплачваць самі жыльцы? Калі ў жыроўцы з'явіцца графа, якая будзе «расшыфроўваць» тэхпаслугі? Колькі будзе каштаваць арэнднае жыллё? На гэтыя і іншыя пытанні адкажа наш суразмоўца.

Папярэднія пытанні можна задаваць па тэлефоне (8-017) 287 18 29 у будныя дні.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ПРАДПРЫМАЛЬНІКАМ ДАДУЦЬ АДТЭРМІНОЎКУ

Тэрмін уступлення ў сілу тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза «Аб бяспецы прадукцыі лёгкай прамысловасці» для індывідуальных прадпрымальнікаў, якія гандлююць на рынках і ў гандлёвых цэнтрах, будзе перанесены на 1 ліпеня 2014 года. Гэтая навіна абышла ўчора ўвесь інтэрнэт.

Са спасылкай на прадстаўніка Міністэрства эканомікі паведамлялася, што адпаведная пастанова, якую сумесна падрыхтавалі Міністэрства гандлю Беларусі і Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі, вось-вось павінна быць прынята.

«Звязда» звярнулася ў аддзел сувязяў з грамадскасцю Міністэрства эканомікі Беларусі па пацвярджэнне ці абвяржэнне гэтай інфармацыі.

Выявілася, што такая пастанова сапраўды рыхтуецца. Асаблівую ўвагу прэс-служба звярнула на тое, што гэта пастанова «не закране аптовых дылераў, якія з 1 ліпеня гэтага года будуць абавязаны дзейнічаць у адпаведнасці з патрабаваннямі новага тэхрэгламенту. А прадпрымальнікі з таварам без сертыфікацыі, якую патрабуе рэгламент, у сваю чаргу, будуць абавязаны інфармаваць пакупнікоў аб тым, што іх тавар не сертыфікаваны».

Нагадаем, што новы тэхрэгламент абавязвае канчатковага рэалізатара (у тым ліку прадпрымальніка) сертыфікаваць тавары лёгкай прамысловасці і маркіраваць адзіным знакам абарачэння прадукцыі на рынку дзяржаў — членаў МС. А гэта значыць, што рэалізатар павінен аддаць на дарагую экспертызу якасці частку таварнай партыі. Прычым пасля праверкі прадукцыя будзе непрыдатная для рэалізацыі.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

23 ГАДЫ ЗА ЗАБОЙСТВА ТАКСІСТА

У Віцебску пастаўлена кропка ў гучнай крымінальнай справе: на 23 гады пазбавілі волі забойцу 20-гадовага віцебскага пажарнага, які ў вольны час легальна перавозіў пасажыраў на таксі. Хлопца забілі ў верасні мінулага года. Аб гэтым «Звязда» паведаміла адной з першых.

Нагадаю, што ў першыя дні расследавання крымінальнай справы супрацоўнікі ўпраўлення Следчага камітэта па Віцебскай вобласці ўстанавілі: кіроўца таксі сам дазволіў сесці ў машыну будучаму забойцу, які «галасаваў» на дарозе. Дарэчы, той раней таксама больш за 15 гадоў працаваў таксістам.

Забойства было здзейснена з выкарыстаннем агнястрэльнай зброі. Калі б не гэта, малады чалавек мог бы пастаяць за сябе, бо ён быў спартсменам: добра валодаў прыёмамі ушу. Кіраўнікі Следчага камітэта, а таксама ўпраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама падкрэслілі, што вялікую дапамогу ў расследаванні аказалі гараджане, асабліва кіроўцы таксі.

Паводле слоў **Аляксея Талкачова, старшага пракурора аддзела па наглядзе за законнасцю судовых пастаноў па крымінальных справах пракуратуры Віцебскай вобласці,** Віцебскім абласным судом вынесены прыгавор. Асуджаны, жыхар Віцебска, 1971 года нараджэння, які не працаваў, раней судзімы за крадзеж транспартнага сродку, правядзе ў няволі 23 гады — у папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці.

КУПЛЯЙЦЕ БЕЛАРУСКАЕ НА ВУЛІЦАХ

У самым цэнтры Віцебска 22—23 чэрвеня ладзіцца кірмаш пад дэвізам «Купляйце беларускае». Двухдзённая акцыя праводзіцца ў тым ліку і ў рамках рэалізацыі даручэння кіраўніка дзяржавы па разгрузцы складоў беларускіх прадпрыемстваў.

Жыхарам і гасцям Віцебска будзе прапанаваны шырокі асартымент тавараў прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці з прадастаўленнем зніжак і ўручэннем падарункаў. Кірмаш запрацуе на адной з цэнтральных вуліц абласнога цэнтра — Леніна (участак вуліцы ад міні-кавярні «Эрыдан» да кавярні «Аўрора»). Час працы: з 10-00 да 15-00 гадзін.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Выстаўка Art Expo: дадатковая пляцоўка для кантактаў

Міжнародная выстаўка Art Expo можа стаць дадатковай пляцоўкай для кантактаў і творчых працэсаў у культурным супрацоўніцтве краін СНД, што дасць магчымасць вырашыць праблему вузканацыянальных праектаў. Аб гэтым заявіла старшыня Савета па культурным супрацоўніцтве СНД, міністр культуры Арменіі Асмік Пагасян, перадае БЕЛТА.

Згодна з праектам палажэння, Art Expo павінна стаць своеасаблівым аглядам дасягненняў краін Садружнасці ў галіне культуры і мастацтва. На выстаўцы будуць прэзентавацца значныя культурныя мерапрыемствы ў галіне кіно, тэатра, музыкі, выяўленчага мастацтва, друкаванай і электроннай прадукцыі, а таксама праекты, дасягненні і падзеі, рэалізаваныя дзяржавамі на працягу папярэдняга года. «Гэта пляцоўка прадугледжвае прадстаўленне ў ракурсе аднаго года культурнага прадукту, які быў створаны ў той ці іншай краіне, з тым каб знайсці новыя рынкі, новую аўдыторыю. Думаю, праект павінен адбыцца», — падкрэсліла міністр культуры Арменіі.

■ Акцэнты тыдня з Вадзімам Гігіным

ІМЯ БЫКАВА

У нас. XV кангрэс Сусветнай асацыяцыі рускай прэсы, які праходзіў днямі ў Мінску, прымусіў яшчэ раз звярнуць увагу на ролю рускай мовы не толькі ў культурнай і цывілізацыйнай прасторы Беларусі, але і ў палітыцы нашай краіны.

Прэзідэнт Беларусі, выступаючы перад удзельнікамі кангрэса, узгадаў тыя часы, калі радыкальныя нацыяналістычныя групоўкі спрабавалі паставіць рускую мову па-за законам. Тады, у пачатку 1990-х гадоў, моўнае пытанне стаяла вельмі востра, было аб'ектам вострых палітычных спрэчак. У маі 1995 года гэтая праблема была вырашана на рэспубліканскім рэферэндуме праз легалізацыю двухмоўя.

Якія наступствы гэтага рашэння? Вядома, можна сказаць, што руская мова займае першаснае месца ў грамадстве, а становішча беларускай падобна на фамільную каштоўнасць, якой вельмі ганарацца, але карыстаюцца толькі па асаблівай нагодзе, па святах. Аднак такое стаўленне, дарэчы, не ўлады, а большасці самога беларускага народа, склалася не за адно стагоддзе. Прычын таму шмат, і яны абумоўлены многімі гістарычнымі працэсамі. І вопыт паказаў, што сітуацыю не зменіш ні гвалтоўнай беларусізацыяй, ні, тым больш, рэзкімі заявамі.

Сацыялагічныя апытанні сведчаць: любая палітычная сіла, якая паспрабуе рабіць моўнае пытанне першасным у сваёй праграме, тым больш патрабаваць скасавання двухмоўя, не зможа разлічваць на падтрымку беларускіх грамадзян. Таму ўпэўнена можна сказаць, што добра, калі мова выводзіцца з кола палітычных праблем і пытанняў. Мова — гэта інструмент дыялогу, паразумення, а не палітычных баталій і спекуляцый.

Вакол нас. Саміты «вялікай васьмёркі» эксперты па міжнародных зносінах даўно сустракаюць з вялікім скептыцызмам. Гэта раней на іх вырашаліся лёсы краін, выпрацоўваліся канкрэтныя захады па развіцці эканомікі. Зараз яны ператварыліся, хутчэй, у дзяжурныя сустрэчы кіраўнікоў самых уплывовых краін свету.

Чарговы саміт, які праходзіў на паўночнаірландскім курорце Лох-Эрн, меў сваю інтрыгу. Заходнія дзяржавы, разам з Японіяй, збіраліся ўгаворваць Уладзіміра Пуціна змякчыць пазіцыю па сірыйскім пытанні і фактычна здаць Башара Асада. Ад расійскага прэзідэнта патрабавалася вытрымаць серыю перамоў у амаль што поўнай ізаляцыі.

Вынік аказаўся не зусім чаканым і нават часткова незразумелым. Засталося ўражанне, што кожны бок мае ўласнае меркаванне наконт дасягнутых дамоўленасцяў. Мяркуйце самі.

Гаспадар саміту брытанскі прэм'ер-міністр Дэвід Кэмеран заявіў, што Расія пагадзілася на стварэнне часовага пераходнага ўрада ў Сірыі. А гэта, па меркаванні брытанскага лідара, азначае, што Башар Асад павінен сысці. А Уладзімір Пуцін — безумоўна, галоўны герой гэтай сустрэчы, — быў больш асцярожны і пацвердзіў, што партнёры дамовіліся не рабіць ніякіх рэзкіх рухаў да міжнароднай канферэнцыі ў Жэневе. І дзе тут праўда?

Найбольш верагодна, што бакі гатовы ўдзельнічаць у аказанні гуманітарнай дапамогі Сірыі і пасляваенным аднаўленні краіны. А гэтая кампанія абяцае стаць адной з самых буйных. У Лох-Эрне была агучана лічба ў 1,5 млрд долараў.

Што ж, хутчэй за ўсё, бакі засталіся пры сваім. А сірыйцы могуць суцешыцца тым, што самыя багатыя краіны свету маюць цвёрды намер дапамагчы ім пасля вайны. Калі гэта можа суцешыць. Засталося толькі высветліць: хто ж пераможа? А вось тут Расія і Захад ставяць на розных гульцоў. І тая бойка пакуль працягваецца.

З гісторыі. Гэты чэрвеньскі тыдзень для Беларусі сапраўды Быкаўскі: 19-га пісьменнік нарадзіўся, 22-га пайшоў ад нас. І зараз, калі застаўся ўсяго год да знакавага юбілея — 90-годдзя Быкава, самы час задумацца, а кім жа быў, ёсць і будзе Васіль Уладзіміравіч для нашай культуры.

Апошнім часам імя Быкава вельмі палітызуецца. Увогуле складваецца ўражанне, што пэўныя палітычныя сілы спрабуюць нібыта прыватызаваць Быкава. Аднак ён належыць не нейкай асобнай партыі ці плыні, а ўсёй Беларусі. І значнасць яго асобы вызначаецца найперш не палітычнай дзейнасцю, а той неверагоднай экзістэнцыянальнай плынню, якую ён прынёс у нашу літаратуру. Так, у апошнія гады Быкаў актыўна ўдзельнічаў у палітыцы. Так, меў канфлікт з уладай, але не трэба абсалютызаваць гэты канфлікт, рабіць з яго жупел.

Дзве постаці ў адным чалавеку — пісьменнік і палітык — з'ява не такая ўжо і рэдкая ў сусветнай гісторыі. Але гэтае супрацьстаянне існасцей звычайна вырашаецца на карысць таленту — а значыць, літаратуры. Ну хто зараз, акрамя вузкіх спецыялістаў, узгадвае пра рэлігійна-палітычныя погляды Льва Талстога пачатку мінулага стагоддзя? Усе памятаюць яго выдатныя раманы і вобразы. Чым застанецца ў гісторыі Максім Горкі: сваёй рэвалюцыйнай дзейнасцю альбо выдатнай прозай і драматургіяй? На мой погляд, адказ відавочны. Камусьці можа не спадабацца і грамадская пазіцыя Міхаіла Шолахава, асабліва яго знакамітыя і рэзкія выказванні ў адрас Сіняўскага і Даніэля («Патрапілі б гэтыя малодчыкі з чорным сумленнем у памятныя дваццатыя...»). Але наўрад ці хтосьці будзе адмаўляць геніяльнасць шолахаўскага «Ціхага Дона».

Талент, стыль, творчасць вырашаюць месца пісьменніка ў свеце, гісторыі і літаратуры. Палітыка ў гэтым выпадку — нешта другаснае. Дык ці не настаў час спыніць нейкую недарэчную мітусню вакол імені Быкава? Ніхто ж не аспрэчвае таго, што гэта адзін з самых выдатных творцаў нашага пісьменства. А ўсё астатняе... Няхай гэта вывучаюць гісторыкі... Для іх будуць усе тыя заявы, з'езды, маніфесты. А нам, чытачам, застануцца «Трэцяя ракета» і «Альпійская балада», «Знак бяды» і «Сотнікаў». Бо дзеля творчасці на карысць сваёй Беларусі і жыў на зямлі геній пад іменем Васіль Быкаў.

...ТУТ КОЖНЫ КАМЕНЬ — ПОМНІК ГЕРОЯМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А ў крэпасці многія не паспелі зразумець, што здарылася. За нейкія хвіліны ўсё змяшалася, усё пачало рвацца, гарэць. Атручаны едкім дымам хаос мог нагадаць хіба што канец свету. І невядома, хто быў шчаслівейшы ў тым пекле: той, для каго канец наступіў хутка, або той, каму давялося прайсці праз доўгія дні пакут. У фондах музея Брэсцкай крэпасці ёсць матэрыялы пра сям'ю старшага палітрука Івана Пачэрнікава. Снарад разарваўся на лесвічнай пляцоўцы іх дома. Загінулі дзеці пяці і шасці гадоў. Загінулі суседзі. Немцы акружылі дом і патрабавалі здацца. Але Іван і Аляксандра не маглі падарыць ворагу імгненні трыумфу. Яны не здаліся, яны застрэліліся.

Такіх альбо іншых трагічных гісторый у першыя дні вайны крэпасць пабачыла нямала. Пазней зноў жа нямецкі мемуарыст напіша: «Дзіву даешся, як у такіх умовах рускія маглі сабрацца з сіламі і арганізаваць абарону». Але ж змаглі. Пра подзвіг невялікага гарнізона цяпер ведаюць ва ўсім свеце. А саму крэпасць зрабіў знакамітай расійскі пісьменнік Сяргей Смірноў.

Упершыню ён прыехаў сюды ў 1954 годзе. Неўзабаве выйшлі яго нарысы ў цэнтральнай прэсе, прагучалі звароты па Усесаюзным радыё. Праз два гады выйшлі кнігі Смірнова «Крэпасць над Бугам» і «Крэпасць на мяжы». Пайшлі пісьмы, адгукнуліся сотні відавочцаў, удзельнікаў абароны. І ў чэрвені 1961 года прайшла першая вялікая сустрэча абаронцаў крэпасці, якія прыехалі з розных гарадоў Савецкага Саюза. Тады ж быў закладзены сімвалічны камень мемарыяльнага комплексу, які ўрачыста адкрылі ў 1971 годзе. У цэнтры ўсяго архітэктурнага ансамбля крэпасці — тры ярусы чорных гранітных пліт. Пад імі знайшлі спачын астанкі 1020 загінулых, імёны 275 з іх увекавечаны, астатнія пахаваны як невядомыя. «Спіс увесь час папаўняюць новыя знаходкі. Магчыма, нават да канца месяца пройдзе новае перапахаванне і лічбы павялічацца», — зазначае намеснік дырэктара мемарыяльнага комплексу Ларыса Бібік.

Калі мы гаворым аб 20 мільёнах чалавек, якія пабывалі ў крэпасці, трэба адзначыць, што ўлічваюцца тыя наведвальнікі, якія заказваюць экскурсіі. Калі дадаць тых, хто аглядае гераічныя мясціны самастойна, то лічбы будуць нашмат большымі. Якія толькі дэлегацыі не пабывалі ў крэпасці! Ужо на маёй памяці захавалася нямала карцінак, што могуць прэтэндаваць на званне гістарычных. Пасля прыняцця рашэння Вышэйшага Савета Саюза Беларусі і Расіі аб сумесным фінансаванні рамонту і рэстаўрацыі мемарыяльнага комплексу ў 1996 годзе да Вечнага агню ўздымаецца прэзідэнт Ельцын. Прамова яго была кароткай. Падчас яе Барыс Мікалаевіч называе крэпасць агульнай святыняй... А вось Эдуард Шэварднадзэ, міністр замежных спраў СССР, задуменна стаіць каля пліты, дзе напісана імя яго роднага брата, абаронцы крэпасці. Эдуард Амвросіевіч праводзіў тут сустрэчу і перагаворы з калегам — Гансам Дзітрыхам Геншарам у 1990 годзе. А праз год, у 50-ю гадавіну пачатку вайны, каля галоўнага манумента самазабыўна іграе канцэрт-рэквіем знакаміты Дзіздзье Маруані. «Цягнікамі памяці», якія сталі традыцыяй, у розныя гады на ранішні мітынг прыязджалі Людміла Зыкіна, Сафія Ратару, Аляксандра Пахмутава, Мікалай Дабранраваў, Міхаіл Ульянаў і іншыя вядомыя дзеячы мастацтва.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Такіх альбо іншых трагічных гісторый у першыя дні вайны крэпасць пабачыла нямала. Пазней нямецкі мемуарыст напіша: «Дзіву даешся, як у такіх умовах рускія маглі сабрацца з сіламі і арганізаваць абарону».

У 2010 годзе ранішняму мітынгу папярэднічала ноч у крэпасці. Бо ў гадзіну ночы пачаўся прэм'ерны паказ беларуска-расійскай драмы «Брэсцкая крэпасць», якую зняў рэжысёр Аляксандр Кот. Пад адкрытым небам, каля Цярэспальскіх варот, быў устаноўлены вялікі экран, абсталявана імправізаваная глядзельная зала. Аўтары, стваральнікі, выканаўцы галоўных роляў сядзелі тут побач з гледачамі, сярод якіх нямала ветэранаў. Калі ішоў фільм, не выпадала думаць і супастаўляць карцінкі з рэальнымі падзеямі. Усё паказанае адбывалася на тым самым месцы, дзе стаяў экран і сядзелі людзі, а за 30 метраў цякла рака, да якой не маглі дабрацца знясіленыя смагай. А вось пасля прагляду гэтае адчуванне ахапіла адразу. Хацелася вызначыць канкрэтна, дзе ж знаходзіўся камісар Фамін, адкуль падымаў у атаку байцоў маёр Гаўрылаў. Усё ж прадзюсар знайшоў удалы ход, калі задумаў прэм'еру ў крэпасці!

І зараз з кожным годам ранішняе мерапрыемства набывае новыя цікавыя рысы. Ваенна-гістарычныя клубы праводзяць рэканструкцыю ваенных падзей. І не толькі. Вечарам напярэдадні вуліца Савецкая становіцца «прашпектам» перадваеннага Брэста. Кругом стаіць рарытэтная тэхніка, па вуліцы гуляюць дзяўчаты у сукенках узору 1940-х. Гэта выглядае вельмі цікава, і збірае шмат гараджан.

А крэпасць між тым чакаюць перамены. Канцэпцыя развіцця яе зацверджана кіраўніцтвам дзяржавы. Пачынаецца асваенне навакольнай тэрыторыі. Турысцкімі аб'ектамі паступова стануць Валынскае і Кобрынскае ўмацаванне (востраў Пагранічны ўжо стаў...). Ваўсю ідзе работа над стварэннем экспазіцыі ў паўднёва-ўсходніх казармах. Па плошчы яна будзе не меншай за цяперашні Музей абароны Брэсцкай крэпасці і пакажа перадваенны Брэст, самы пачатак вайны, а таксама адлюструе лёсы абаронцаў крэпасці, іх сем'яў.

З пачатку мая гэтага года ў турыстаў з'явілася магчымасць наведаць унікальны аб'ект — востраў Пагранічны, які раней называўся востраў Заходні. Гэта адзіная тэрыторыя Беларусі на левым баку Заходняга Буга. І вельмі многія брастаўчане да гэтага лічылі, што востраў належыць суседняй Польшчы. А ён быў закрыты і належаў памежнаму ведамству нашай краіны. Там і цяпер пагранічная зона. На ўваходзе памежнікі правяраюць пашпарты і запісваюць наведвальнікаў у спецыяльны сшытак. Хадзіць па востраве можна толькі арганізаванай групай у суправаджэнні экскурсавода. Ажыццяўляе экскурсіі мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць».

Да польскага Цярэспаля, былога горада-спадарожніка Брэста, тут рукой падаць. На краі вострава стаяць два памежныя слупы: беларускі, а праз абводны канал — польскі. У планах — будаўніцтва пешаходнага моста, які звяжа дзве тэрыторыі. І тады турысты пойдуць на востраў з абодвух бакоў. А тут ёсць што паглядзець. На Пагранічным нібы спыніўся час. Гледзячы на пабудовы, умацаванні, можна падумаць, што вайна скончылася толькі ўчора. Будынкі засталіся такімі ж, якімі былі пасля баёў. Тут захаваліся чатыры дзясяткі аб'ектаў сярэдзіны XIX стагоддзя: казармы, капаніры, фрагменты парахавых складоў, казематы ў земляных валах. Пакуль доступ дазволены толькі да часткі аб'ектаў вострава. На асобныя з іх можна паглядзець здалёк. Такія, напрыклад, як мытная будка канца XVIII пачатку XIX стагоддзяў. Аказваецца, менавіта на гэтым востраве ажыццяўляўся мытны кантроль падарожнікаў, якія перасякалі мяжу Расійскай імперыі. Як жа цікава ўбачыць мытны аб'ект таго часу і параўнаць яго з цяперашнімі тэрміналамі! А царская будка старэйшая за саму крэпасць, узведзеную па імператарскім указе на месцы старажытнага Брэсця.

Галоўная глядзельная пляцоўка Пагранічнага абсталявана на месцы, дзе пачынаўся Цярэспальскі мост, які злучаў востраў з цытадэллю. Вядомы этнограф мінулага Павел Шпілеўскі напісаў пра мост, што ён «падобны на Ланцуговы, што каля Летняга саду». Варта дадаць, што брэсцкі быў даўжэйшы і ланцугі на ім былі з суцэльнага дроту, а на пецярбургскім з — літага чыгуну. Мост запланавана аднавіць да 2015 года.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

■ З любоўю...

ДЗЕНЬ, ЯКОГА ЧАКАЛІ

У 10 гадзін у Іўі гуканнем званоў у праваслаўнай царкве і каталіцкім касцёле пачаліся набажэнствы ў гонар Дня горада. Сабраліся на малітву і вернікі ў мусульманскай мячэці. Прадстаўнікі кожнай канфесіі прасілі Бога аб міры і згодзе, добрай долі для людзей роднага горада і ўсёй Беларусі.

Хтосьці назваў Іўе Вавілонам: тут жывуць людзі розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў. Але ж у Вавілоне каля той злашчаснай вежы, Бог, караючы людзей за дзёрскасць, пераблытаў іх мовы, і яны перасталі разумець адно аднаго. У нас жа атрымліваецца зусім па-іншаму. Нішто не перашкаджае нам наладжваць эканамічныя і культурныя сувязі з польскімі, татарскімі, літоўскімі гарадамі. Дарэчы, экспазіцыя «Кола гісторыі» пачынаецца са своеасаблівага дарожнага знака з назвамі гарадоў Сакулка, Азнакаева, Кайшадорыс. Каля іх з задавальненнем фатаграфаваліся члены дэлегацый.

А ў Іўеўскім музеі нацыянальных культур творчыя людзі сабраліся на прэзентацыю зборніка «Іўеўшчына літаратурная», выдадзены пры фінансавай падтрымцы райвыканкама і складзены з паэтычных і празаічных твораў 25 аўтараў — жыхароў і выхадцаў Іўеўскага раёна. Нашы землякі і аздобілі кнігу фатаграфіямі, мастацкімі выявамі. Гэта шматгадовая праца супрацоўнікаў раённай бібліятэкі, якія, нібы пчолы, што па кроплях назапашваюць мёд, збіралі творы нашых літаратараў і журналістаў.

Пакуль узносіліся малітвы ў храмах і чыталіся вершы ў музеі, у дзіцячым развіваючым цэнтры адкрыўся басейн, а на тэрыторыі гімназіі заіскрыліся колерамі вясёлкі пырскі фантана. З'явілася ў нас і яшчэ адно адметнае месца — экспазіцыя «Кола гісторыі». На камянях-валунах змешчаны таблічкі з адлюстраваннем гістарычных дат і галоўных падзей на Іўеўшчыне.

Шматлюднае святочнае шэсце рушыла да памятнага знака згоды і сяброўства іўеўскіх канфесій. Госці ішлі ў нацыянальных строях, са сцягамі сваіх краін і гарадоў. Іўе быццам пераўтварылася ў жыватворную, бурлівую раку, у якую «ўліваліся» працэсіі з касцёла, царквы, мячэці...

На набярэжнай прапаноўвалі свае вырабы народныя майстры, віталі людзей песнямі і пачастункамі падворкі сельгаспрадпрыемстваў раёна. А ў 23 гадзіны над іўеўскім возерам успыхнуў святочны салют у гонар горада і яго жыхароў.

Вера ГУЛІДАВА

Фота Станіслава ЗЯНКЕВІЧА.

■ Ніхто не забыты

ПРЫГАДАЦЬ КОЖНАГА ПАЙМЕННА

«Гэты дзень, як ніякі іншы, упісваецца і ў дзяржаўную ідэалогію, і ў духоўнае жыццё кожнага грамадзяніна, бо датычыцца шматлікіх лёсаў нашых продкаў, што аддалі жыцці ў самай кровапралітнай вайне ў гісторыі чалавецтва», — адзначыў начальнік упраўлення па ўвекавечванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл Міністэрства абароны Віктар Шумскі на прэс-канферэнцыі, прысвечанай Дню ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, што адзначаецца 22 чэрвеня.

Сёння адным з прыярытэтных кірункаў работы ў сферы ўвекавечвання памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў застаецца папаўненне аўтаматызаванага банку даных «Кніга памяці. Воінскія пахаванні». За 2012 — 2013 гады ў яго ўнеслі 24733 імёны загінулых, на дзяржаўны ўлік прынялі 34 воінскія пахаванні. Агульная іх лічба складае 7293 пахаванні.

Віктар Шумскі распавёў, што сёлета запланавана сумеснае правядзенне палявых пошукавых работ з Расіяй. Акрамя таго, рыхтуецца да выдання другая кніга «Каталога воінскіх пахаванняў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» па Віцебскай вобласці (першы каталог ахапіў Брэсцкую вобласць). У Міністэрстве абароны распрацаваны праект Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб арганізацыі работы па ўвекавечванні памяці аб загінулых пры абароне Айчыны і захаванні памяці аб ахвярах войнаў», завяршыць узгадненне якога плануецца сёлета.

Усяго за перыяд з 1995 па 2013 гады спецыялісты 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна адпрацавалі 2326 пошукавых аб'ектаў на тэрыторыі 111 раёнаў краіны, знайшлі і перадалі для далейшага перапахавання астанкі 21004 загінулых абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў. За гэты час толькі па выніках палявых пошукавых работ устаноўлены імёны 2285 загінулых падчас войнаў, знойдзена 377 медальёнаў, 43 узнагароды, абясшкоджана 4216 выбухованебяспечных прадметаў.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

Любую жонку **Марыну Аляксандраўну МАГЛЫШ** ад шчырага сэрца віншую **з 50-годдзем!**

Ты — сонейка маё і ясны месяц...
Ты — даражэйшая за ўсіх
На белым свеце!

Муж.

ЗАХОЎВАЦЬ ПАТРЫЯТЫЧНЫ І НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГОНАР

Набліжаецца сумная дата пачатку распальвання Вялікай Айчыннай вайны, якая прынесла незлічоныя чалавечыя ахвяры, боль і пакуты мільёнам людзей. І хоць мінула ўжо 72 гады з пачатку велізарнай трагедыі, удзячная памяць зноў і зноў вяртае ў тыя трагічныя дні, калі чорная навала вайны пракацілася па мірных гарадах і вёсках Беларусі.

Многае змянілася і пераасэнсоўваецца, але народная памяць імкнецца захаваць і перадаць маладым пакаленням трагізм і гераізм, самаахвярнасць і самаадданасць, мужнасць і вернаць, якімі было напоўнена жыццё тых, хто выступіў на абарону Айчыны ў радах Чырвонай Арміі, партызан, падпольшчыкаў, хто сваёй стваральнай працай набліжаў Перамогу.

На жаль, у працэсе дэмакратычных пераўтварэнняў, якія адбываюцца ў краіне ў пачатку XXI стагоддзя, многія ідэалы кардынальна змяніліся не ў лепшы бок. Нават, наадварот, узмацнілася разбурэнне духоўнасці, а ва ўтвораны прастор хлынуў разбуральны паток абыякавасці, цынізму, зайздрасці, крывадушнасці і іншыя недахопы і грахі. Як ні сумна, але і ў асяроддзі народа, які **адзіны ў Еўропе** здолеў перамагчы карычневую чуму XX стагоддзя, з'явіліся тыя, хто абражае пераможцаў, параўноўваючы іх з атрадамі нацысцкіх забойцаў, з тымі, хто на вялізнай прасторы ад Волгі да Буга, пакінулі пажарышчы тысяч Хатыняў.

Гераічная, самаахвярная барацьба соцень тысяч патрыётаў нашай краіны на франтах Вялікай Айчыннай вайны, змаганне ў радах партызан і падпольшчыкаў, самаадданая праца ў савецкім тыле ўсяляк прыніжаецца і не заўважаецца. Затое вобраз калабарацыяністаў і адкрытых здраднікаў узводзіцца ў ранг нацыянальных выратавальнікаў. З гэтага суцэльнага негатыву маладое пакаленне можа зрабіць толькі адну выснову, што ўся гісторыя Вялікай Айчыннай вайны — гэта гісторыя здрады і гвалту, якая змяняецца іншым гвалтам і здрадай, адсутнасцю гонару і абавязку, годнасці і бяссрашнасці, подзвігу і самаахвярнасці.

Знаходзяцца і тыя, хто ў наш час не супраць, нават правакацый — накшталт той, якую ўчынілі ідэйныя прыхільнікі Арміі Краёвай, усталёўваючы крыж каля вёскі Рачкаўшчына Гродзенскай вобласці, дзе загінуў кіраўнік бандыцкага фарміравання былой АК. У даследаванні Я.І. Сямашкі «Армія Краёва на Беларусі» даследчык расказвае чытачу: «Хто ж ён, няўлоўны «Олех», які прынёс гэтулькі бед і нясчасцяў людзям?» Спасылаючыся на дакументальныя крыніцы, навуковец, вядомы публіцыст раскрывае жахлівыя падрабязнасці. Сапраўднае прозвішча «Олеха» — Радзівонік (ён жа «Айцец», ён жа «Мрук», ён жа «Стары»). У сакавіку 1944 г. ён прыбыў у беларускія лясы з-за Буга. Далей ідзе пералік чорных спраў бандыцкай групы, якую ён узначальваў. «15 красавіка 1947 г. у вёсцы Баравыя Васілішкаўскага раёна забіты былы оперупаўнаважаны Васілішкаўскага РА МУС Якімовіч Мікалай і ўчастковы ўпаўнаважаны гэтага ж РА МУС Цімошкаў Уладзімір. Учынены тэракт над жыхаром вёскі Пескаўцы Ясюкайцісам. 7 верасня 1948 г. у вёсцы Савічы бандай «Олеха» забіты дэпутат Навадворскага сельсавета Хоміч, настаўніца Пурвіна і калгаснік Будзько. 22 верасня — падпал жывёльнага двара ў калгасе імя Сталіна. 27 верасня — забойства прадаўца магазіна в. Серафіны Лідскага раёна Серафімовіча Казіміра Іванавіча... У кастрычніку 1948 г. «Олех» назначыў сваім намеснікам Вітольда Маленчыка (ён жа «Цыган», ён жа «Мазепа»), які раней удзельнічаў у дыверсіі на чыгунцы Ліда — Баранавічы. Маленчык узначаліў тэрарыстычную групу ў колькасці 8 чалавек, якая займалася палітычным бандытызмам і ўзброеным грабяжом. У прыватнасці, 10 верасня ў вёсцы Вавюрка Лідскага раёна забіты работнік міністэрства нарыхтовак Тарасаў і абрабавана пошта, дзе ўкрадзены 24 тысячы рублёў, а ў сельсавеце спалены дакументы. 21 снежня 1948 г. у вёсцы Кудзеркі Шчучынскага раёна бандгрупай «Цыгана» забіты 10 чалавек. У вёсцы Вайнілаўцы абрабавалі грамадзяніна Шмігера — адабралі 1000 рублёў і забралі кабана. Як вынікае з матэрыялаў крымінальных спраў, саўдзельнікі «Олеха» не шкадавалі нікога — ні маладых, ні старых». (Я.І. Сямашка. «Армія Краёва на Беларусі». Мн. 1994. С.228 — 230.).

На жаль, знайшліся і абаронцы правакатараў. Некаторыя пачалі гаварыць аб тым, што гэта праваслаўны «змагар», які да вайны настаўнічаў, пераводзячы справу ў канфесійнае рэчышча. Адна з удзельніц правакацыі разважае: «Гэта была вайна. Невядома, хто правы, хто вінаваты. А чалавек мясцовы. Тут нарадзіўся, тут вырас. Мне здаецца, аніякага злачынства тут няма».

Няўжо невядома, што грэх прарастае незалежна ад веравызнання і прафесіі там, дзе разбураецца духоўная сутнасць чалавека. Ці можна пагадзіцца з разважаннямі былой актывісткі АК, што невядома, хто вінаваты. Мы прывялі дакументальныя факты, якія пераканаўча сведчаць аб тым, хто вінаваты. Цікава запытаць, а як лічаць родзічы тых, каго катаваў і знішчаў ён сам і яго падручныя?

Агульнавядома, што ў гісторыі заўсёды захоўваецца ВЕЛІЧ, а не ўбоства і мярзота імёнаў. Без ПАНТЭОНА ГЕРОЯЎ і ўшанавання слаўных старонак працоўнага подзвігу продкаў немагчыма паспяховае будаўніцтва грамадства. Гэты ПАНТЭОН СЛАВЫ неабходна будаваць у душах людзей, пачынаючы з дашкольнага ўзросту і працягваць у школе і ў сістэме вышэйшай адукацыі. Зусім не важна, як гэта называць — патрыятычным выхаваннем, урокамі гісторыі ці інфармацыяй для агульнага развіцця. Падрастаючаму пакаленню неабходна пастаянна расказваць пра ПОДЗВІГІ і СЛАЎНЫЯ СПРАВЫ іх продкаў. Гэтыя размовы павінны быць шчырымі, адкрытымі і пранікнёнымі, каб падрастаючае пакаленне ўспрымала і адчувала ўсю веліч маральна-патрыятычнага руху народа вогненных 1940-х гадоў.

Сёння неабходна дапамагаць маладому пакаленню пераадольваць наступствы ідэалагічных правакатараў і брыдоты, якія замахваюцца на разбурэнне духоўных каштоўнасцяў. Няхай нас крытыкуюць апаненты, што мы парушаем свабоду слова. Сапраўдная свабода не мае нічога агульнага з усёдазволенасцю. Там, дзе квітнее свабода ўсёдазволенасці, пачынае прарастаць грэх. Дазваляць гэтаму грахоўнаму госцю пускаць у сябе атручаныя метастазы — значыць не толькі пачаць разбурэнне адвечных каштоўнасцяў, назапашаных чалавечай цывілізацыяй, але і асуджаць сябе на пагібель. Гэтага дапусціць нельга!

Абавязак навуковай і творчай інтэлігенцыі і духавенства — дзейнічаць разам, каб вяртаць у грамадскую свядомасць духоўна-культурны пачатак, дзе для чалавека ідэал — не грошы і сквапнасць, а духоўны стан яго і пачуцце патрыятызму, гонару за беларускі народ. Сёння настаў час, інакш потым будзе позна, паставіць нават нейкі прававы заслон ліберальнаму цынізму і ўсім тым, хто зневажае подзвіг беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Неабходна ўключаць дэмакратычныя прававыя інстытуты і заклікаць да адказнасці ўсіх, хто распаўсюджвае фальсіфікацыі аб гісторыі Вялікай Перамогі. Калі мы не зробім гэта сёння, то гэты ліберальны плюшч-паразіт тысячамі нябачных шчупальцаў аблытае здаровае цела грамадства і высмакча здаровы асяродак нацыянальнай годнасці, а значыць, загубіць жывое дрэва грамадзянскага і патрыятычнага пачатку, які яшчэ захоўваецца ў нашым грамадстве.

Па-другое, паўстае заканамернае пытанне: чаму мы, нашчадкі Вялікай Перамогі, і па якім праве дазваляем здзекавацца з памяці нашых бацькоў і дзядоў, з тых, хто цаной сваіх жыццяў не толькі адстаяў свабоду і незалежнасць Айчыны, але і патушыў полымі Асвенцымаў, Бухенвальдаў і Трасцянцоў, і не дазволіў вынішчыць «недачалавекаў»? Неабходна аб'ядноўваць здаровыя сілы грамадства, каб процістаяць разбэшчанасці і абыякавасці.

У еўрапейскіх палітыкаў сёння не выклікае пярэчанняў не толькі Мюнхенскі дагавор, але і шэраг пагадненняў, якія падпісала нацысцкая Германія ў 1939 годзе з Румыніяй, Італіяй, Літвой, Эстоніяй і Латвіяй. А вось дагавор, які быў заключаны паміж Германіяй і Савецкім Саюзам у жніўні 1939 года, празмерна ўзбуджае заходнюю эліту.

Зразумела, рознага роду выказванні аб негатыўнай гісторыі нашых народаў маюць грамадскую небяспеку. Але яшчэ большую небяспеку ўтойвае масавае тыражаванне ў мультымедыйнай прасторы і навязванне грамадству лжывых каштоўнасцяў. Многія тэлешоу, якія сёння займаюць значны час тэлеэфіру, маюць не толькі загадзя зададзеную драматургію, але і накіраваны на дасягненне пэўнага грамадскага выніку. Робіцца небеспаспяховая спроба не толькі навязаць, але і прызвычаіць грамадскую свядомасць да прыняцця духоўна-разбуральных ідэй.

Гэтая вакханалія ініцыіруецца і падтрымліваецца заходнім істэблішментам. У рэчышчы нашай размовы будзе нелішнім нагадаць факт таго, што Парламенцкая Асамблея Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе напярэдадні 70-годдзя заключэння германска-савецкага дагавора прыняла 3 ліпеня 2009 г. рэзалюцыю «Уз'яднанне падзеленай Еўропы: абарона правоў чалавека і грамадзянскіх свабод у рэгіёне АБСЕ ў XXI стагоддзі», якая прыраўноўвае Савецкі Саюз і Германію.

Заходнія палітыкі нібыта забываюць, што адбывалася ў еўрапейскай дыпламатыі пасля прыходу ў Германіі да ўлады Гітлера. Нагадаем, што яшчэ задоўга да жніўня 1939-га Германія падпісала шэраг пагадненняў з еўрапейскімі краінамі. Так, у 1933 годзе Германія, Вялікабрытанія, Францыя, Італія заключылі пакт чатырох, які быў накіраваны супраць СССР. У 1934 годзе з Германіяй падпісвае дагавор Польшча, у 1935 — Францыя, у 1936 — Японія. А Англія, у сваю чаргу, заключае марскі дагавор з Германіяй. А ўжо 29 верасня 1938 у Мюнхене сабралася канферэнцыя ў складзе кіраўнікоў чатырох дзяржаў — Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі і Італіі. Удзельнікі без якой-небудзь кансультацыі з Чэхаславакіяй і без яе ўдзелу дамовіліся аб перадачы Германіі Судзецкай вобласці Чэхаславакіі.

У еўрапейскіх палітыкаў сёння не выклікае пярэчанняў не толькі Мюнхенскі дагавор, але і шэраг пагадненняў, якія падпісала нацысцкая Германія ў 1939 годзе з Румыніяй, Італіяй, Літвой, Эстоніяй і Латвіяй. А вось дагавор, які быў заключаны паміж Германіяй і Савецкім Саюзам у жніўні 1939 года, празмерна ўзбуджае заходнюю эліту. Некаторыя заходнія палітыкі і праваднікі іх ідэй нацыянальныя заходнефілы спрабуюць перанесці адказнасць за няўдалыя міжнародныя справы выключна на савецкае кіраўніцтва.

Нельга не адзначыць той факт, што ў шэрагу навучальных дапаможнікаў і літаратурных крыніцах празмерна негатыўна ацэньваецца падпісаны ў жніўні 1939 дагавор Германіі і Савецкага Саюза. Нельга забываць, што яго заключэнне, нягледзячы на розныя недасканаласці, дазволіла ўз'яднацца беларускаму народу. Між тым, некаторыя імкнуцца падаць падзеі так, быццам бы СССР быў ініцыятарам заключэння дагавора аб ненападзе, і называюць яго няйначай, як «пакт Молатава — Рыбентропа». Агульнавядома, што ініцыятарам заключэння дагавора быў германскі бок, але ў літаратуры некаторыя аўтары імкнуцца навязаць дэфініцыі «савецка-германскі пакт», «пакт Молатава — Рыбентропа», што нават знешне павінна дэманстраваць агрэсіўную сутнасць СССР. Зразумела, гэта не нявінныя творчыя ідэі, а наўмысныя правакацыйныя пасылы, каб з найбольшай перакананасцю дэманстраваць агрэсіўную сутнасць савецкай улады. Таму нездарма ў скандальнай рэзалюцыі парламенцкай асамблеі АБСЕ (3 ліпеня 2009 г.) зроблена спроба прыраўняць нацызм і сталінізм, каб паставіць на адну дошку нацысцкую Германію і СССР. Гэта ў той час, калі Савецкі Саюз выратаваў народы Еўропы ад карычневай чумы. Большую абразу памяці мільёнаў нашых суайчыннікаў, якія змагаліся з германскім фашызмам у гады Другой сусветнай вайны, цяжка прыдумаць.

Паўстае заканамернае пытанне: ці можна аб'яднаць народы на абразе памяці мільёнаў загінуўшых у баях за вызваленне Еўропы, на ачарненні памяці пераможцаў і рэабілітацыі злачынцаў і іх памагатых?

Сёння неабходна шчырая размова пра змястоўныя рэчы. І тычыцца гэта не толькі разважанняў пра падзеі Другой сусветнай вайны, але і пра многія іншыя старонкі нашай гісторыі. Мінулае, калі паглыбіцца ў яго сур'ёзна, паўстае надзвычай розным, складаным і супярэчлівым. Аднак нават самы крытычны погляд не дазволіць зрабіць выснову, што ўся чалавечая гісторыя — гэта гісторыя пастаяннага рэгрэсу, злачыннасці і злачынстваў. У сувязі з гэтым неабходна падкрэсліць, што і падзеі Вялікай Айчыннай вайны не павінны асвятляцца выключна ў змрочных адценнях з пастаянным падкрэсліваннем промахаў, пралікаў і недахопаў палітычнага і ваеннага кіраўніцтва краіны. У свядомасць моладзі нельга настойліва ўкараняць вобразы і паняцці, якія прыніжаюць і абражаюць патрыятычныя якасці. Гістарычная свядомасць, у тым ліку памяць пра перамогу над германскім нацызмам, павінны выступаць структураўтваральным элементам духоўнага стану народа, фактарам згуртавання і мабілізацыі на вырашэнне эканамічных, сацыяльных і палітычных задач незалежнай Рэспублікі Беларусь.

Наша жаданне будаваць незалежную, свабодную Беларусь значна актуалізуе неабходнасць звяртання да гістарычнага вопыту. Для навукоўцаў, творчай інтэлектуальнай і палітычнай эліты адной з важнейшых задач з'яўляецца захаванне і трансляцыя гістарычнага вопыту. Нездарма народная мудрасць сцвярджае, што стаўленне да гісторыі з'яўляецца яскравым сведчаннем цывілізаванасці грамадства і яго духоўна-маральнага стану.

Аляксандр КАВАЛЕНЯ,
акадэмік-сакратар
Аддзялення гуманітарных навук
і мастацтваў НАН Беларусі,
доктар гістарычных навук.

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

Шаноўныя сябры!

Працягваецца падпіска на «Звязду» на III квартал і 2-е паўгоддзе 2013 года!

Спадзяёмся і далей бачыць вас сярод нашых чытачоў і падпісчыкаў.

Хочам нагадаць вам, што падпіска на «родную газету на роднай мове» можа стаць добрым падарункам родным вам людзям!

Індэкс/перыяд		1 месяц	3 месяцы	6 месяцаў
63850	(для індывідуальных падпісчыкаў)	39 000	117 000	234 000
63145	(для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў)	35 100	105 300	210 600
63858	(для ведамасных падпісчыкаў)	78 000	234 000	468 000
63239	(ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя)	70 200	210 600	421 200

■ Факт

Анатоль ТОЗІК:

«ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ З НАСЕЛЬНІЦТВАМ ВЕЛЬМІ ВАЖНАЯ ДЛЯ ЎРАДА»

65% беларусаў ва ўзросце ад 15 да 24 гадоў у цэлым задаволены жыццём. Гэта адзін з вынікаў шматіндыкатарнага кластарнага абследавання па ацэнцы становішча дзяцей і жанчын у Беларусі, якое было праведзена ў нашай краіне ў 2012 годзе Нацыянальным статыстычным камітэтам.

Акрамя прыведзенай вышэй высновы, абследаванне дазволіла атрымаць інфармацыю аб важных аспектах жыцця дзяцей — аб стане здароўя, распаўсюджанасці дзіцячай працы, асноўных метадах выхавання дзяцей у сям'і і г.д. Так, напрыклад, падчас вывучэння хатніх гаспадарак было высветлена, што толькі 33 са 100 дзяцей ва ўзросце ад 2 да 14 гадоў выхоўваюцца негвалтоўнымі метадамі.

Сярод дзяцей ва ўзросце 3-4 гадоў, з якімі займаюцца па развіваючых праграмах у рамках дашкольнай адукацыі, 95 са 100 развіваюцца ў адпаведнасці са сваім узростам. Сярод дзяцей 3-4 гадоў, якія не ахоплены развіваючымі праграмамі, у адпаведнасці са сваім узростам развіваюцца 87 з сотні

Абследаванне па ацэнцы становішча дзяцей і жанчын праводзілася сярод 8,5 тысячы хатніх гаспадарак рэспублікі, у тым ліку 3,4 тысячы хатніх гаспадарак, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 15 гадоў. У аснову метадаў абследавання былі пакладзены мадэлі і стандарты, распрацаваныя для глабальнага праекта MICS па зборы інфармацыі аб становішчы дзяцей і жанчын у краінах свету.

47 са 100 дзяцей ва ўзросце 5—11 гадоў і 75 са 100 ва ўзросце 12-14 гадоў дапамагаюць бацькам у хатніх справах менш за 4 гадзіны ў дзень. І 1,4% дзяцей ва ўзросце 5-14 гадоў уцягнуты ў розныя формы дзіцячай працы, якая пазбаўляе дзяцінства.

Сусветнай праблемай з'яўляецца дамашні гвалт. У Беларусі 12 са 100 жанчын ва ўзросце 15—49 гадоў падвяргаліся гвалту з боку мужа або партнёра. Пры гэтым 60% з іх не звярталіся па дапамогу. Адной з мер прадзеяння дамашняму гвалту беларусы лічаць навучанне моладзі ўзаемнай павазе. Акрамя таго, у барацьбе з гэтай праблемай могуць дапамагчы, на іх думку, прафесійная дапамога псіхолага, узмацненне жорсткасці заканадаўства і сацыяльная рэклама.

❍❍❍

У Беларусі з 1994 года ідзе дэпапуляцыя. І, як заявіў у сваім выступленні на канферэнцыі, дзе былі прэзэнтаваны вынікі абследавання, **старшыня Белстата Уладзімір ЗІНОЎСКІ,** ва ўмовах невысокай нараджальнасці асабліваю значнасць набываюць рэпрадуктыўныя ўстаноўкі насельніцтва, наяўнасць ведаў пра спосабы кантрацэпцыі, дасведчанасць у пытаннях прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі.

— Мы зацікаўлены ў тым, каб мець аб'ектыўную карціну становішча жанчын і дзяцей у краіне, — сказаў на канферэнцыі **намеснік прэм'ер-міністра Анатоль ТОЗІК.** На яго думку, каштоўнасць вынікаў абследавання — не толькі ў атрыманых лічбах, але і ў маніторынгу грамадскай думкі па актуальных пытаннях.

Зваротная сувязь з насельніцтвам вельмі важная для ўрада ў мэтах удасканалення дзяржаўнай палітыкі ў сацыяльнай сферы.

— Праведзена вялікая праца. Цяпер важна правільна і прадуктыўна выкарыстаць атрыманыя даныя, — лічыць Анатоль Тозік. — Вынікі даследавання будуць пакладзены ў аснову дзяржаўных праграм і стратэгій у сферы народанасельніцтва, развіцця чалавечага капіталу, устойлівага развіцця краіны.

Святлана БУСЬКО

■

■ Супрацоўніцтва

ІТАЛЬЯНСКІ БІЗНЕС МАЕ ЦІКАВАСЦЬ ДА БЕЛАРУСІ

Дні дзелавога супрацоўніцтва «Беларусь — Італія» працягваюцца ў сталіцы і беларускіх рэгіёнах з удзелам прадстаўнікоў італьянскіх кампаній. Чарговае знаёмства італьянскіх бізнесменаў з Беларуссю наладзілі наша пасольства ў Рыме, Беларуская гандлёва-прамысловая палата і яе нядаўна адкрытае прадстаўніцтва ў Італіі .

Беларуска-італьянскія эканамічныя стасункі карысныя абедзвюм краінам: толькі летась аб'ём двухбаковага тавараабароту склаў 1,64 млрд долараў, а з пачатку года ў параўнанні з леташнімі паказчыкамі ён ужо ўзрос больш чым на 18%. Больш за дзве сотні розных тавараў мы прадаём Італіі — сталь, мінеральныя ўгнаенні, хімічныя і сінтэтычныя валокны, ільняныя тканіны, драўніну. Італьянцы інвеставалі летась у нашу эканоміку амаль 50 млн долараў, таму і з'яўляюцца аднымі з замежных лідараў па колькасці створаных у нас прадпрыемстваў. Сёння ў Беларусі дзейнічае 188 юрыдычных асоб з італьянскім капіталам, з якіх трэцяя частка мае 100% італьянскі капітал.

Як расказаў «Звяздзе» намеснік кіраўніка Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір Улаховіч, і на гэты раз італьянскія бізнесмены прывезлі шмат канкрэтных прапаноў па супрацоўніцтве як у традыцыйных беларуска-італьянскіх стасунках (касметыка, санаторна-курортнае супрацоўніцтва, сельская гаспадарка), так і шэраг новых: магчымасць сумесных распрацовак праграмнага забеспячэння і інфарматызацыі, інвеставанне ў прадпрыемствы Мінска і вобласці, свабоднай эканамічнай зоны «Брэст».

У. Улаховіч падкрэсліў, што паміж нашымі краінамі існуе дасканалая дагаворна-прававая база, якая ахоплівае ўсе сферы супрацоўніцтва. Асабліва прыкметны ўклад Італія ўносіць у аздараўленне беларускіх дзяцей: з пачатку дзевяностых гадоў у італьянскіх здраўніцах і сем'ях пабывала амаль паўмільёна юных беларусаў.

Асаблівасцю дзён беларуска-італьянскага дзелавога супрацоўніцтва, якія працягнуцца да канца тыдня, стала і тое, што разам са сваімі прапановамі італьянскія прадпрымальнікі выказалі зацікаўленасць у прасоўванні беларускіх тавараў на італьянскім рынку.

З беларускага боку ў перамовах і кантактна-кааперацыйнай біржы прымаюць удзел больш за 60 прадпрыемстваў.

Пятро РАМАНЧУК

■

■ Здарэнне

Прадукцыя не пацярпела

У Мінскім раёне ў аграгарадку Наваселле гарэў адміністрацыйны будынак прыватнага прадпрыемства. У левай і правай частках размешчаны складскія і вытворчыя памяшканні, у цэнтральнай — адміністрацыйны корпус, дзе і гарэў дах. Агонь пашкодзіў яго на плошчы 900 квадратных метраў. Выгаралі два адміністрацыйныя памяшканні, пашкоджана падвясная столь на 200 «квадратаў» і абсталяванне, закураны сцены ў халадзільным памяшканні. У халадзільніках знаходзіліся курыныя тушкі, свіное мяса. Самі халадзільнікі і прадукцыя не пацярпелі. На ліквідацыі пажару было задзейнічана 10 адзінак тэхнікі МНС.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ Натура

НА САЛОМЕ СПЕЕ ЎРАДЖАЙ...

Летась наша сям'я пачала вырошчваць вешанкі. Сёлета эксперымент вырашана было падоўжыць і пашырыць: замест двух мяхоў саломы «зарадзілі» ўвесну міцэлієм — у два заходы з розніцай у некалькі тыдняў — шэсць.

...Праўду кажуць: нешта можа расці літаральна на вачах. Калі наспеў час, усё так і было. Увечары праз прарэзаныя ў мяхах дзірачкі пачало прабівацца... Ужо раніцай можна было разглядзець невялікія цёмныя шапачкі на маленькіх пакуль ножках. Да вечара шапачкі значна падраслі ў памерах, колер іх пасвятлеў. А на трэці дзень брат пачаў непакоіцца, каб вешанкі не перараслі.

Кажуць, што яны не пахнуць як сапраўдныя лясныя грыбы. Не згодны, бо, калі сабраны ўраджай унеслі ў хату на кухню, я на ганку праз адчыненыя дзверы адчуў моцны характэрны пах сырасці грыбніцы — такі, які звычайна бывае ў лесе, калі ты дакладна ведаеш, што недзе побач ёсць грыбы. Можа, ён і не зусім «лясны», але грыбны дакладна.

З першых трох «стрэліўшых» мяхоў нарэзалі добры тазік шапачак. Ладная міса набралася і ножак. Апошнія, дробна пасечаныя і падсмажаныя з цыбуляй (пад бульбу), — вельмі смачныя! Шапачкі пайшлі на страву кшталту жульена і грыбную піцу. Наразаў грыбы я, а мае сямейнікі ўсё паглядвалі ды кідалі раз-пораз: маўляў, не шкадуй, рэж і кладзі пабольш. На што ў выніку я адказаў жартам: «А давайце яшчэ і кампот грыбны зробім!»

Праз некалькі тыдняў знялі другі ўраджай, трохі меншы, чым першы: вешанкі адчувальныя да тэмпературы паветра, не любяць спякотнага надвор'я. Цікава, што зноў парадавалі два мяхі з першай партыі, а з другой «стрэліў» пакуль толькі адзін мех. Быў і трэці заход. Мяхі пасля пераблыталіся, але гэта ўжо і не істотна. Мы папросту чакаем чарговага ўраджаю.

Сяргей РАСОЛЬКА. Фота аўтара

■

ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение
«Минскстрой»
ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ
объекта «Многоэтажные жилые дома №№ 1, 2 по генплану со встроенными помещениями административно-общественного назначения и гаражом-стоянкой № 3 по г/п в квартале ул. Щорса – пр. Дзержинского на земельном участке 2,0 га с установкой индивидуального источника теплоснабжения. Жилой дом № 2 по генплану» в г. Минске,
опубликованную в газете «Звязда» от 18 июня 2013 года № 110:

Полезная площадь нежилого помещения административно-общественного назначения № 6 составляет 57,71м².

Генеральный директор *Н.В. Милошевский*

УНП 100071325

ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение
«Минскстрой»
ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ
объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 12 по генплану» в г. Минске,
опубликованную в газете «Звязда» от 10 января 2013 года № 4 (27369):

Предметом договора будет являться строительство жилых помещений: №№ 91, 99, 122, 135, 136, 139, 156.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений с учетом выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

однокомнатные квартиры – 12 031 533 руб.,
двухкомнатные квартиры – 10 715 901 руб.,
трехкомнатные квартиры – 10 518 556 руб.

Предложения согласно настоящим изменениям в проектную декларацию действуют до ввода объекта в эксплуатацию.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) и договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке, через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию.

Генеральный директор *Н.В. Милошевский*

УНП 100071325

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества
ОАО «Автокомбинат № 6»

УНП 191692351

Наименование предмета аукциона	Характеристика
Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Инв. № 500/С-9032, общая площадь 85 кв.м, 1955 года постройки, фундамент – бутобетонный, стены и перегородки – кирпичные, перекрытия – деревянные, крыша – шиферная, полы – бетонные, внутренняя отделка – штукатурка, побелка, имеется электроосвещение, вентиляция естественная (водопровода, канализации, отопления – не имеется).
Место нахождения недвижимого имущества	г. Минск, пер. Физкультурный, 22
Начальная цена с НДС(20%), рублей	**150 000 000** (Сто пятьдесят миллионов)
Задаток, рублей	**15 000 000** (Пятнадцать миллионов)
Условия оплаты	Разовый платеж
Организатор аукциона	ООО «БелИнвестОценка», г. Минск, ул. Казинца, д. 4, оф. 416.
Сведения о земельном участке	Земельный участок для обслуживания здания площадью 0,0214 га, кадастровый номер 500000000004004890, договор аренды земельного участка от 20.12.2012, б/н, срок аренды – по 31.10.2015

Начальная цена продажи снижена на 40%.

Аукцион состоится **5 июля 2013 в 12.00** по адресу: г. Минск, пер. Физкультурный, 22, актовый зал.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни **с 9.00 до 17.00 по 04.07.2013 включительно** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 4, оф. 416 (здание ГО «Белресурсы»). Заключительная регистрация участников **05.07.2013 с 11.00 до 11.30** по месту проведения аукциона.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с продавцом имущества не позднее 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи. Конт. лицо: Николаев Сергей Сергеевич, тел. +37517-223-33-03, +37529-643-96-58.

Дополнительную информацию можно узнать на сайте: belinvo.by, у Организатора аукциона по тел. 8 (017) 398 28 50, 8(029) 142 33 07; e-mail: belinvo@tut.by.

Полное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 23.03.2013 № 54.

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**Лот № 1.** Грузовой специальный автобетоносмеситель KAMAZ-65115 62, 2008 г.в. стоимостью 319 209 000 белорусских рублей. **Лот № 2.** Полуприцеп МАЗ 938662, 2008 г.в., г/н А0784А-2 стоимостью 77 088 000 белорусских рублей. **Лот № 3.** Станция передвижная компрессорная стоимостью 103 782 500 белорусских рублей. **Лот № 4.** Установка для подачи жестких растворов стоимостью 28 382 500 белорусских рублей. **Лот № 5.** Агрегат штукатурный МАШ 1-01 стоимостью 19 905 000 белорусских рублей. **Лот № 6.** Агрегат штукатурный МАШ 1-01 стоимостью 16 171 700 белорусских рублей.
Собственник (владелец) имущества	**ДКУСП «Полоцкая ПМК-59» (УНП 300075017)**
Местонахождение (адрес) имущества	**г. Полоцк, ул. Криничная, 4**
Наличие обременений	**Залог ОАО «Белагропромбанк»**
Место (адрес), дата и время проведения торгов	**23.07.2013 в 12.00 г. Витебск, ул. «Правды», 32, каб. 320**
Справочная информация об организаторе торгов	Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 320, http://court.by/vitebsk/ Судебный исполнитель Рязяпов Никита Фанилевич, тел./факс: (80212) 491340, (8044) 7467300, старший судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич, тел.: (80212)491340, (8044)7349300
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670, не позднее 11.30 23.07.2013 г. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. Более подробную информацию можно получить на сайте ВХС http://court.gov.by/online-help/executive/disposition/upcoming-auction/Vitebsk/

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА:

№ лота	Наименование имущества	Место нахождения имущества	Собственник	Начальная цена продажи лота, рублей (без учета НДС)	Задаток 5%, рублей (без учета НДС)	Сумма шага аукциона в размере 5%	Реквизиты для оплаты задатка
ИМУЩЕСТВА (без учета НДС)							
1	**Автомобиль Митсубиси Оутлендер, 2007 года выпуска, гос. номер 01-50 ВВ-3**	**г. Гомель, ул. Пушкина, 2 (охраняемая автомобильная стоянка)**	**ЧСТУП «Цемекс» (г. Гомель, ул. Барыкина, 309б)**	**149000000**	**7450000**	**7450000**	**р/сч № 3012800000579 – текущий в белорусских рублях в ОАО «Белгазпромбанк» Гомельская областная дирекция, МФО 153001742, УНП 490000841**

Организатор торгов – управляющий в деле о банкротстве ЧСТУП «Цемекс» Борейко Д.И.

С имуществом (лотом) можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.30.

Задаток перечисляется до 30.07.2013 г. (включительно) по реквизитам для оплаты задатка.

Условия продажи – без условий.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 календарных дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 календарных дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением: для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.

Срок подачи заявления с момента выхода настоящего объявления до 16.00 22.07.2013 года по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 309б.

Дата, время, место проведения открытого аукциона 31.07.2013 года в 14.00, г. Гомель, ул. Барыкина, 309б.

По вопросам ознакомления с имуществом (лотом) и участия в аукционе, приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8029) 654-25-61; (8044)767-88-05.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже оборудования, находящегося в собственности ОАО «Могилевский домостроительный комбинат» 23 июля 2013 года

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена продажи (без учета НДС), руб.	Сумма задатка, руб.	Характеристика объекта	Условия аукциона
1	Форма для изготовления межколонной плиты на 2 изделия МП (инв. №№10104-10109) – 6 штук	492 000 000	24 600 000	Металлическая оснастка для изготовления плит перекрытий массой 3 650 кг	доставка за счет покупателя
2	Форма для изготовления средней плиты СП на 2 изделия (инв. № 10110)	69 700 000	3 485 000	Металлическая оснастка для изготовления плит перекрытий массой 3 100 кг	
3	Форма для изготовления средней плиты СП на 2 изделия (инв. № 10111)	72 600 000	3 630 000	Металлическая оснастка для изготовления плит перекрытий массой 3 100 кг	
4	Форма для изготовления надколонной плиты на 2 изделия НП на 2 изделия (инв. № 10101-10103) – 3 штуки	246 000 000	12 300 000	Металлическая оснастка для изготовления плит перекрытий массой 3 650 кг	
5	Форма для изготовления диафрагмы на 1 изделие ДО на 1 изделие (инв. № 10112)	155 800 000	7 790 000	Металлическая оснастка для изготовления плит ерекрытий массой 6 786 кг	
6	Форма для изготовления диафрагмы на 1 изделие ДП на 1 изделие (инв. № 10113)	155 800 000	7 790 000	Металлическая оснастка для изготовления плит перекрытий массой 6 786 кг	
7	Форма для изготовления диафрагмы на 1 изделие Д на 1 изделие (инв. № 10114)	155 800 000	7 790 000	Металлическая оснастка для изготовления плит перекрытий массой 6 786 кг	
Оборудование находится по адресу: Республики Беларусь, г. Могилев, пер. Гаражный, 2а Технологическое оборудование предназначено для использования в строительстве (производство плит перекрытий) в условиях серийного (массового) производства. Дата изготовления – 2002 г. Данное оборудование дает возможность выбора различных комбинаций конструктивных решений с целью строительства высококачественного массового жилья нового поколения, включая жилье с повышенным комфортом.					
Аукцион состоится 23 июля 2013 года в 15.00 в зале заседаний Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а. Заявки принимаются ежедневно с 24 июня 2013 в рабочие дни с 8 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407. **Последний день приема заявок – «22» июля 2013 года до 13.00**. Заключительная регистрация участников аукциона **23 июля 2013 года** с 14 до 15 часов.					

Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.

Продавец: Открытое акционерное общество «Могилевский домостроительный комбинат», 212003, г. Могилев, пер. Гаражный, 2а, тел. (0222) 22-44-57, 25-34-98, 22-31-95.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в МГ УКП «Центр по приватизации» следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон;

копию платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на расчетный счет МГ УКП «Центр по приватизации» 3012430089016 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, МФО 153001739, УНН 700008710;

юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь:

копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица;

копию платежного поручения о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона;

юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь:

легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть получена не ранее 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копию платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона;

индивидуальным предпринимателям:

копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя;

копию платежного поручения о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона;

физическим лицам – гражданам Республики Беларусь, физическим лицам – иностранным гражданам: документ, удостоверяющий личность;

копию платежного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона.

Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником аукциона, предмет торгов по решению аукционной комиссии продается этому лицу при его согласии (далее – лицо, приравненное к победителю аукциона) по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

До подписания договора купли-продажи победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней, не считая дня проведения аукциона, обязан в соответствии со счетом-фактурой возместить организатору аукциона фактические затраты на его организацию и проведение. Договор купли-продажи заключается продавцом и победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета торгов осуществляется победителем (лицом, приравненным к победителю) аукциона в белорусских рублях в установленном порядке.

Условия оплаты – в течение 20 календарных дней после подписания договора купли-продажи.

С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 17 часов.

Контактные телефоны организатора аукциона для уточнения или получения дополнительной информации: г. Могилев (0222) 22-21-78, 22-00-89.

УПРАВЛЯЮЩИЙ ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОСТИ И ИМУЩЕСТВА

Торги проводятся в форме открытого аукциона.
Торги состоятся 24 июля 2013 г. в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Социалистическая, 115.

№ лота	Наименование объекта, краткая характеристика объекта (лота)	Начальная цена продажи, руб. (без уплаты НДС)	Задаток, руб.	Шаг аукциона в %	Затраты на подготовку документации
Лот № 138	МАЗ 543403, инв. № 6804	194 000 000	3 880 000	5	1 009 593
Лот № 139	МАЗ 543403, инв. № 6805	194 000 000	3 880 000	5	1 009 593
Лот № 140	Автомашина МАЗ 53366, инв. № 235	43 100 000	4 310 000	5	1 009 593
Лот № 141	Прицеп МАЗ 83761, инв. № 235	23 900 000	2 390 000	5	1 009 593
Лот № 142	Автомашина ГАЗ 53, инв. № 425	12 600 000	1 260 000	5	1 009 593
Лот № 143	Хранилище РИПов, инв. № 4710	59 000 000	5 900 000	5	2 974 391
Лот № 144	Здание бытового помещения (мебельного цеха), инв. № 213	73 000 000	7 300 000	5	4 035 682
Лот № 145	Здание бытовых помещений (мебельного цеха), инв. № 213	732 000 000	14 640 000	5	4 035 682
Лот № 146	Здание слесарной мастерской со складскими помещениями, инв. № 6763	174 000 000	3 480 000	5	2 083 371
Лот № 147	Стоянка автотранспорта, инв. № 1262	5 500 000	550 000	5	2 961 159
Лот № 148	Площадка для складирования пиломатериалов и упаковки, инв. № 6773	78 300 000	7 830 000	5	2 083 371
Лот № 149	Пирс, инв. № 6770	90 500 000	9 050 000	5	3 093 887
Лот № 150	Устройство навеса склада готовой продукции ДСП	282 700 000	5 654 000	5	3 700 340
Лот № 151	КНС с канализационным коллектором, инв. № 319	143 200 000	2 864 000	5	2 083 371
Лот № 152	Здание мебельного цеха	1 991 000 000	39 820 000	5	4 257 904

Имущество расположено по адресу: **Гомельская область, г. Мозырь, ул. Социалистическая, 120, ул. Гоголя, 61.**

Для участия в торгах необходимо:

1. Оплатить задаток на р/с 3012002731231 в ф-ле № 317 ОАО «АСБ Беларусбанк» ул. Советская, 130, МФО 151501678, УНН 400088836 г. Мозырь.

2. По 22 июля 2013 г. включительно в рабочие дни с 8.00 до 16.30 подать заявление на участие в торгах и другие документы в соответствии с законодательством по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Социалистическая, 115.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателям – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицам – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо предоставляет его руководитель), а также копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документы о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданные обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организации без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

В случае, если аукцион признан не состоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Не явка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона, заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроков их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, методическими рекомендациями об особенностях оценки и продажи имущества должника, находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) №144 от 29.11.2010 г.

Дополнительная информация по телефону организатора аукциона: 8(0236) 35-60-80, 35-64-99; (029) 685-68-01; (029)834-38-97.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 23 (193)

СВАЕ СУПРАЦЬ СВАІХ

Ці засвоілі мы філасофскія набыткі Васіля Быкава?

Сёння незвычайны дзень... Нават дзіўна, як у адным дні можа спалучацца столькі супрацьлегласцяў, узаемавыключальных фактаў. 22 чэрвеня — не толькі дзень летняга сонцастаяння, як сімвала жыцця, перамогі святла над цемрай, таму што самы доўгі дзень у годзе акурат сёння. 22 чэрвеня — гэта яшчэ дзень пачатку Вялікай Айчыннай вайны і дзень смерці народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. І сёлета вось ужо 10 гадоў, як яго не стала.

І гэта таксама быццам бы нейкі сімвал — сысці з жыцця ў дзень пачатку вайны. Быццам апошні ўчынак, якім гэты вялікі беларус хацеў яшчэ раз сцвердзіць, што вайна — гэта нешта антычалавечае, чужое, негуманнае і дзікае... Зрэшты, уся яго творчасць і ўсё яго жыццё сцвярджалі гэта. Ціхім сціплым голасам сумленнага беларуса Васіль Быкаў даводзіў гуманістычныя каштоўнасці да людзей, гаварыў ім праўду пра вайну, савецкую ўладу, пра тое, што перад нераадольнымі абставінамі, у любой экзістэнцыйнай сітуацыі чалавек і становіцца самімі сабой, і становіцца сабе чужым — у ім пачынаюць праяўляцца якасці, яму самому пра сябе дагэтуль невядомыя. Быкаў — вялікі псіхолаг, выдатны філосаф. Беларускі, інтэрнацыянальны, наднацыянальны. Дзякуючы яго творчасці сёння мы зусім па-іншаму глядзім на літаратуру, на гераізм, на вартасць чалавечага жыцця, на вайну не супраць ворагаў, а вайну — унутры нас, вайну сваіх супраць сваіх...

Быкаў у кожным з нас

Для любога падлетка, калі толькі ён пачынае цікавіцца беларушчынай, творчасць Васіля Быкава з'яўляецца этапнай. Памятаю гэтыя школьныя ўрокі беларускай літаратуры з маёй цудоўнай настаўніцай Таццянай Уладзіміраўнай, якая пра Васіля Быкава расказвала не пафасна і кранальна. Памятаю «адкрытыя ўрокі», калі мне давялося на вялізную аўдыторыю распавядаць пра «Знак бяды». Памятаю, як чытаючы «Жураўліны крык», я плакала, таму што разумела: выйсця няма, усе загінуць. А Быкаў напісаў пра гэта так лаканічна і адначасова дэталёва, напісаў так трагічна, што адчуванне таго, што ў свеце пануе несправядлівасць і зло, нейкае часам не бачнае, але паўсюднае, маштабнае, апаноўвалі з жудаснай сілай. І хацелася бегчы ад гэтага зла, крычаць, плакаць. Маўляў, вунь, вы ж паглядзіце, жыццё такое простае і цікавае, што ж вам яшчэ трэба, людзі?! А, відаць, варагаваць, залежаць і падначальваць — настолькі ж у прыродзе чалавека, наколькі не. Усё вырашае толькі, чаму пашчасціць перамагчы...

Не ведаю, але, хутчэй за ўсё, каб я ў школьныя часы не чытала Васіля Быкава, то была б зусім іншым чалавекам сёння. Узгадваючы Васіля Уладзіміравіча, яго сучаснікі кажуць, што галоўным у літаратуры ён лічыў не талент, а чалавечае сумленне. У Быкава было і першае, і другое. І яшчэ нашмат большае. І першае, і другое ёсць у яго кнігах. І гэта не можа не паўплываць. Калі мы толькі захочам, Быкаў будзе ў кожным з нас. І, магчыма, мы станем трохі лепшымі.

На вечарыне памяці пісьменніка, якую днямі ладзілі Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі, пра Васіля Быкава расказвалі яго сябры. Гаварыў, напрыклад, генерал-маёр авіяцыі Анатоль Сульянаў, які з пісьменнікам не служыў, але пасябраваў ужо ў мірным жыцці. Лейтматывам у расказаць пра рэальнага чалавека, а не пра класіка, творы якога вывучаюцца па школьнай праграме. Хаця слухаеш гэтыя гісторыі з жыцця і пераконваешся: Быкаў быў заўжды адным і тым жа, сумленным, простым, шчырым чалавекам і ў жыцці, і ў творчасці. Найбольш запомнілася гісторыя з апытанкай для газеты. Вядомых пісьменнікаў, у ліку якіх былі Быкаў, Шамякін, Кудравец ды сам Вярцінскі, папрасілі адказаць на просценькія пытанні.

— І вось мы на пытанні кшталту «Ці любіце вы сваё імя?» спрабавалі адказаць грунтоўна і сур'ёзна, — распавядае Анатоль Вярцінскі. — А Быкаў адказаў проста, лаканічна і з гумарам. І праўда, як на такія пытанні можна было адказваць усур'ёз, я цяпер думаю.

Адказы Васіля Быкава на гэтую фрывольную апытанку сапраўды захапляюць. Прыкладам, на пытанне, якія колер валасоў і вачэй вам падабаюцца найбольш, ён адказаў: «Усе колеры добрых людзей». На пытанне «якой павінна быць жанчына вашай мары?» адказаў: «Цудоўная». Пра свой улюбёны занятак адказаў лаканічна «Думаць». Вось гэта дасціпнасць, вось гэта востры розум.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

А мне падумалася, каб ва ўсіх людзей на планеце ўлюбёным заняткам было «думаць», то чалавецтва пазбегла б стольких праблем, глабальных катаклізмаў, войнаў, канфліктаў, непаразуменняў... Глядзіш на партрэт Быкава, на яго пранікнёны, заўжды заклапочаны твар (нават сябры сведчаць, што смяяўся ён даволі рэдка), і здаецца, што ён усё гэта ўсведамляе. Пра нас. У чым мы памыляемся, што мы робім не так...

Памятаю, як зноў-такі ў школе чытала яго аўтабіяграфію «Доўгая дарога дадому». І думала. Думала пра тое, што гэты чалавек (які тады яшчэ быў жывы!) — сваёй сціплай упартасцю, прынцыповасцю і дабрынёй перамог усё. Прынамсі, унутрана перамог. Думала, што ён вучыўся ў маім родным Віцебску — як ён вучыўся, пра што сам разважаў, якія былі яго ўлюбёныя мясціны ў горадзе. Тады для мяне было адкрыццём, што ён увогуле вучыўся тут маляванню. Памятаю, адразу пабегла ў горад шукаць той будынак, дзе знаходзілася мастацкая школа, куды ён хадзіў. І цяпер ганаруся, што ў пэўным сэнсе Віцебск — таксама горад Васіля Быкава. І цяпер ганаруся, што Васіль Быкаў — наш з вамі суайчыннік, беларус, якому ніколі не было абыякава. І нам не будзе, праўда?..

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

Думаць — доўгая дарога

Паэт Анатоль Вярцінскі, які таксама выступаў на вечарыне памяці Быкава ў бібліятэцы, расказаў пра Васіля Уладзіміравіча шмат цікавага, шмат нейкіх напаўпобытавых жыццёвых дробязяў, якія толькі і могуць яго прамове было тое, якім неверагодна сціплым чалавекам, «не ныцікам» быў Васіль Быкаў. У Васіля Уладзіміравіча былі цяжкія прыступы астмы, але ён «напружваў» сяброў, прасіў аб дапамозе толькі ў самыя-самыя крытычныя моманты. Затое сам заўсёды быў рады дапамагаць, клапаціўся пра людзей, якія былі побач. Непатрабавальны, не кідкі, ён ніколі не выхваляўся. На выступленнях перад курсантамі ваеннага вучылішча Быкаў, які прайшоў увесь фронт, капаў акопы, ваяваў у артылерыі і пяхоце, адступаў да Варонежа, 2 разы быў паранены, а ў 1944-м нават лічыўся забітым, ніколі не выхваляўся сваімі подзвігамі і больш, наогул, расказваў пра вайну ў цэлым, пра подзвігі іншых, чым ужываў уласны займеннік «я».

У сувязі з гэтым, вядома ж, падумалася: а хто сёння расказвае пра вайну сённяшнім курсантам?

Часам перачытваеш яго творы і думаеш: а ці засвоілі мы нешта з яго ўрокаў? Мы памятаем яго, шануем. Спадзяюся, заўжды так будзе. Але ці засвоілі мы, усе мы, кожны з нас?..

ТВОРЧАЯ ЭВАЛЮЦЫЯ

Ты сам можаш не разумець, на што здольны, пакуль не з'явіцца чалавек, які раскрые табе гэта. Раскрые табе цябе самога. І табе альбо захочацца пагадзіцца і кожным разам не расчароўваць, альбо перагледзець свае пазіцыі і даказаць: магу! А бывае так, што ты перастаеш верыць у тое, што можаш, але дзеля таго, што вераць яны, не можаш сядзець склаўшы рукі і ўсё адно будзеш нешта спрабаваць, рабіць, пісаць. Стварацца.

І тут можна шмат разважаць пра тое, ці можна кагосьці навучыць ствараць. Але абудзіць, справакаваць творчы выбух у асобе, які прывядзе да творчай эвалюцыі ў нейкі асобны і адметны Сусвет, напэўна, можна. І тады — стваральнік і той, хто гэты штуршок даў. Настаўнік.

Некалькі гадоў таму ў Інстытуце журналістыкі БДУ адкрылася новая спецыяльнасць «Літаратурная работа. Творчасць» — дзякуючы імкненню і працы выкладчыкаў кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі. Да першага выпуску яшчэ некалькі гадоў, але ўжо можна меркаваць пра асаблівасці навучальнага працэсу. І можна разважаць пра тое, як творчая энергія асоб можа паўплываць на змяненне культурнай прасторы навокал. У гэтым мне дапамагае загадчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі БДУ Людміла САЯНКОВА:

Энергія пачатку

— На факультэце журналістыкі заўсёды былі людзі, выкладчыкі, якія адной сваёй прысутнасцю, усім, што яны рабілі, падрыхтавалі глебу для з'яўлення таго, што сёння сабой уяўляе кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі. Найперш я назаву дзвюх асоб: Ефрасінню Леанідаўну Бондараву і Таццяну Дзмітрыеўну Арлову. У савецкі час пра стварэнне такой кафедры на факультэце журналістыкі гаворкі не было, але былі дзве гэтыя цудоўныя жанчыны, якія распавядалі пра творчасць і натхнялі на творчасць, яны шмат зрабілі для з'яўлення кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі і фактычна заклалі падмурак для стварэння спецыяльнасці «Літаратурная работа. Творчасць» — у арганізацыйным плане, інтэлектуальным, прафесійным. А таксама ў чалавечым плане: яны заўжды апякалі студэнтаў, нават падкормліваліе. Памятаю, як мне, напрыклад, Бондарава давала грошы, каб я магла паехаць паўдзельнічаць у міжнароднай канферэнцыі. Яна зрабіла выключны ўнёсак у развіццё літаратурна-мастацкай творчасці на факультэце журналістыкі. Не адно пакаленне журфакаўцаў памятае, як пад яе кіраўніцтвам выпускаліся студэнцкія газеты па культуры і мастацтве, як рэдагаваўся першы альманах літаратурна-мастацкай творчасці, у якім «пад машынку» былі надрукаваны шматлікія артыкулы тых, хто быў і застаўся гонарам беларускай літаратуры, публіцыстыкі, крытыкі. Нягледзячы на тое, што яе асабліва вабіла кіно, яна шмат чаго зрабіла, каб і беларуская літаратура была бліжэй для студэнтаў. А Таццяна Дзмітрыеўна ўсё рабіла для таго, каб дыстанцыя паміж тэатрам і студэнтамі была значна меншай. Колькі тады ў нас было творчых сустрэч з пісьменнікамі, драматургамі, акцёрамі, рэжысёрамі! Здаецца, усе прэм'еры новых фільмаў праходзілі ў нас. Студэнты былі жаданымі гасцямі на абмеркаванні спектакляў, кніг. Яна яе прапагандавала, запрашала вельмі шмат пісьменнікаў і паэтаў на сустрэчы. Бываюць такія асобы, якія асвятляюць шлях. Часам, калі жывеш побач, гэтага не заўважаеш. Зараз азіраючыся назад, я разумею: ніколі б не было нашай кафедры, калі б не было толькі двух гэтых людзей. Я ўдзячная лёсу, што ён звёў мяне з імі. Калі паступіла на журфак, яны сталі для мяне настаўнікамі не толькі ў прафесіі, але і па жыцці. І ўрэшце прыспеў час, і ідэя стварэння асобнай кафедры, якая насілася ў паветры, змагла ажыццявіцца: факультэт узбуйняўся, вырас у Інстытут журналістыкі. І невыпадкова, што ўзнікла ў нас спецыяльнасць «Літаратурная работа. Творчасць». Магу прызнацца: мне, калі я стала загадчыцай кафедры, вельмі хацелася б, каб была спецыяльнасць «Літаратурна-мастацкая крытыка». Але часы змяніліся і літаратурна-мастацкая крытыка, на жаль, ужо не патрэбна ў такой колькасці... Але наша задача — зрабіць так, каб спецыяльнасць «Літаратурная работа. Творчасць» паступова набірала сілу, развівалася.

Кафедра літаратурна-мастацкай крытыкі ў Інстытуце журналістыкі БДУ была створана ў 1998 годзе.

Такая спецыяльнасць неабходная для беларускай прасторы, таму што няма ў нас нічога падобнага ні ў адной навучальнай установе. І (хто ведае?), можа быць, цягам часу гэтая спецыяльнасць умацуецца і вырасце да асобнай навучальнай установы. Гэта было б абгрунтавана, таму што пры падрыхтоўцы асаблівых творчых кадраў патрэбны іншыя праграмы, іншая сістэма навучання. Студэнты, маладыя людзі, з першых курсаў загружаны вялікай колькасцю вучэбных прадметаў, скардзяцца, што на творчасць якраз часу не хапае. Я іх разумею. Таму што ў іншых творчых ВНУ студэнты з першага дня пачынаюць працаваць у майстэрнях. Звычайная практыка для падобных ВНУ: курс набірае майстар — у паэзіі, майстар у прозе, драматургіі, ці майстар у кіно, акцёрскім майстэрстве. Ідуць паўнавартасныя зносіны з майстрам, які вядзе курс ці групу на працягу ўсяго навучання. Гэта і ёсць мэтанакіраванае навучанне, калі яны тэорыю сумяшчаюць з практыкай. У нас трошкі іншая сітуацыя: студэнты нашай спецыяльнасці навучаюцца ў кантэксце журналісцкай адукацыі, яны падпарадкоўваюцца агульным стандартам адукацыйных праграм. Так, асобныя спецкурсы ў іх ёсць, але не ў той колькасці, якая патрэбна для будучай прафесіі. Як уціснуць у невялікую колькасць часу ўсё, што ім патрэбна па прафесіі, — вось складанасць...

Часціна ад Бога

— Творчасці нельга навучыць. Чалавек можа вучыцца пяць гадоў і атрымаць чырвоны дыплом, усе прадметы здаць на «выдатна», але так і не прыйдзе ў творчасць, калі ў яго не будзе інтуіцыі, не будзе нейкага душэўнага неспакою, чуласці, густу, здольнасці заўважаць дробязі, якія часам шмат пра што сведчаць. Калі ў яго не будзе здольнасці ўлоўліваць, што адбываецца ў часе, у свеце, пра што трэба гаварыць людзям сёння. Сучаснае пакаленне мяне шмат чым здзіўляе: часам прыходзяць маладыя людзі і не разумеюць, што такое добра і што такое дрэнна ў элементарнай чалавечай этыцы. Напэўна, нешта з душой. А ў творчасці без духоўнага пачатку, без душэўнага неспакою немагчыма існаваць. Ёсць такая траўмаванасць маладога пакалення. Манкурцтва ёсць. Яны традыцый не адчуваюць, вельмі шмат чаго нават не імкнуцца спасцігнуць. І я разумею, чаму яны такія выхоўваюцца: уплывае кантэкст, пры якім можна не надта ведаць, разумець, адчуваць, але ўладкоўвацца ў жыцці. Напрыклад, чалавек, які займае пэўную пасаду, атрымлівае добры сцэнарый пра віленскі літаратурны асяродак пачатку XX стагоддзя, дзе выпісана атмасфера таго часу, дзе вельмі тонка паказана, як і дзе, пры якіх умовах нараджалася нацыянальная літаратура, можа сказаць: «А каму патрэбны гэты ваш Купала?..» Пра што тады размова? Нічога не бывае без слядоў. Маладыя людзі растуць на гэтай глебе. Атрымліваецца, што мы рубім сук, на якім усе сядзім: губляецца павага да традыцый, мінулага. Таму маладыя людзі прыходзяць са школы (а зараз школьная адукацыя трошкі іншая, у савецкія гады яна была больш фундаментальнай) і не ведаюць элементарных рэчаў.

Працэс уніфікацыі і стандартызацыі, які адчуваецца ў вышэйшай школе, асабліва шкодны для творчых прафесій. А што такое якасць адукацыі ў творчай ВНУ? Гэта дыялог. Гэта зносіны з майстрамі, з асобамі. Я магу сёння не памятаць, што мне даваў выкладчык на лекцыях. Але ў мяне захоўваецца чараўніцтва вобраза таго ці іншага выкладчыка. І з вялікай колькасці выкладчыкаў, з якімі мне прыходзілася сутыкацца, толькі некалькі чалавек запалі мне ў душу тым, што вымаўлялі словы, якія мяне мянялі. Ці якія мяне натхнялі на творчасць, якія абуджалі ўва мне жаданне чытаць, шукаць, ісці далей. Памятаю, з якой асалодай я хадзіла ў бібліятэку, чытала Хэмінгуэя «Па кім звоніць звон?», ці як мы ў інтэрнаце яшчэ ў савецкія гады перадавалі ў рукі адно аднаму ратапрынтнае выданне «Майстра і Маргарыты». Таму што з'явіліся такія выкладчыкі, якія адкрылі свет. І гэта запомнілася! Таму мы сапраўды не ведаем, як наша слова адгукнецца. А бывае слова, нават мелькам сказанае, нейкі жэст, нават дэталь вопраткі ў выкладчыка моцна ўплывае на слухача. Таму мне здаецца, сёння выкладчыкі павінны адпавядаць высокаму ўзроўню ва ўсім.

На нашай кафедры ёсць выкладчыкі, якія ў штаце, і тыя, хто па-за штатам. Гэта практыкі, якія, як правіла, працуюць, прычым у спецыялізаваных выданнях. Ці журналісты, людзі, якія шмат пішуць і маюць аўтарытэт. Мне хацелася б, каб кола такіх майстроў пашыралася. Мы сёння супрацоўнічаем з вядомымі крытыкамі Наталляй Шаранговіч, Людмілай Перагудавай, Ігарам Сукманавым, Надзеяй Бунцэвіч. Ёсць супрацоўніцтва з паэтамі і пісьменнікамі. У прыватнасці, з намі супрацоўнічае Алесь Карлюкевіч. Але хацелася б, каб кола таксама пашыралася. А з іншага боку, ёсць вучэбная праграма: не кожны практык, які піша прозу ці паэзію, будзе чытаць курс «Беларуская літаратура». А майстэрства, на жаль, не так шмат для студэнтаў нашай спецыяльнасці. Калі б была сістэма майстэрняў, то было б больш часу на гэта. Таму пакуль мы сёння імкнёмся арганізоўваць творчыя сустрэчы — з пісьменнікамі, паэтамі, крытыкамі, рэжысёрамі. Студэнтам гэта цікава. Я памятаю, калі я вучылася на журфаку, у нас было шмат творчых сустрэч — з беларускімі і не з беларускімі аўтарамі. І гэтыя сустрэчы, можа, былі больш прадуктыўныя і карысныя, чым акадэмічныя гадзіны, якія праводзяцца ў аўдыторыі...

Сёння па гэтай спецыяльнасці навучаецца 28 чалавек.

Адукацыйны калайдар

— Так атрымалася, што ў першы год набору мы ўзялі ўсіх тых, хто прыйшоў: пра такую спецыяльнасць яшчэ мала хто ведаў. На першых курсах, калі сталі з імі бліжэй знаёміцца (асабліва пасля практыкі), мы ўбачылі, што трэба займацца з імі больш, менавіта ў творчым кірунку. Студэнты самі па сабе аказаліся нядрэнныя. Яны паступова набіраюць нейкі ўзровень. Цяпер студэнты нашага першага набору пераходзяць на чацвёрты курс, у іх ужо больш разумення таго, чым ім трэба займацца. У іх абуджаецца інтарэс да творчасці. Другі і трэці наборы больш моцныя, прыйшлі больш матываваныя студэнты, якія разумелі, куды і чаму паступаюць. У нас на спецыяльнасці сёння дамінуюць дзяўчаты. Але магчыма, у такім маладым узросце яны больш мабільныя, чым хлопцы. Але яны шукаюць, шмат чым цікавяцца, нешта ствараюць. У нас вучыцца цікавая дзяўчына Соф'я Штуцына, якая спрабуе сябе ў лірычнай прозе. Але як ведаць, што будзе далей? Не факт, што з 9 чалавек, якія сёння скончылі першы курс, усе стануць пісьменнікамі ці драматургамі. Але і атрымліваючы дыплом журналіста, не ўсе ідуць працаваць журналістамі...

Гэта спецыяльнасць не можа быць масавай. На яе не павінны дзейнічаць тыя стандарты прыёмных камісій, якія ёсць сёння. Лічыцца, што група набрана, калі ў ёй не менш за 20 чалавек. Больш — калі ласка. Я разумею, таму што платная адукацыя прадугледжвае большыя наборы. Але трэба глядзець на рэчы рэальна: не могуць прыйсці 30 чалавек на навучанне па спецыяльнасці «Літаратурная работа. Творчасць». Вядома, для выкладчыкаў, для ВНУ гэта добра. Але калі паглядзець у маштабах краіны, то ўзнікае пытанне: навошта нам рыхтаваць столькі падобных спецыялістаў?

Тут ёсць падстава для разваг: каб ад нас усё ж не патрабавалі набіраць тую колькасць студэнтаў, як гэта прадугледжана на ўсіх іншых спецыяльнасцях. Мы ўсё-такі выхоўваем асаблівых спецыялістаў. Аднак, пры тым, што сама спецыяльнасць творчая, у нас няма статусу творчай ВНУ. Мы падпарадкоўваемся нормам і законам, як фізікі, матэматыкі, географы. Калі б спецыяльнасць «Літаратурная работа. Творчасць» адасобілася б і набыла статус творчай ВНУ, магчыма, былі б іншыя вучэбныя праграмы і наборы. Сёлета, напрыклад, набору не будзе, таму што папярэдні курс маленькі, не набралі акадэмічнай групы. Таму нам не дазволілі набіраць новы курс. Прапускаем гэты год, але менавіта сёлета (паводле псіхалагічнага тэсціравання) вялікі працэнт маладых людзей выказваў жаданне вучыцца менавіта на нашай спецыяльнасці. І не кожны абітурыент гатовы чакаць год...

Мне вельмі хацелася б, каб гэтая спецыяльнасць жыла, развівалася, каб была магчымасць (ці ніша) для выхавання крытыкаў. Людзі, якія прафесійна разважаюць аб мастацтве і могуць прапанаваць адпаведны ўзровень, вельмі важныя. І калі наша краіна хоча мець кіно, тэатр, выяўленчае мастацтва ці музыку высокага ўзроўню, то без крытычнага асэнсавання, без аналізу і разумення, у чым недасканаласці і як іх можна выправіць, гэтага дасягнуць складаней. Крытычная думка — гэта падстава да ўдасканалення і гэта погляд збоку, які дапамагае развіццю як мастацтва, так і грамадства праз мастацтва. У расійскіх выданнях гэты кірунак сёння ёсць. У беларускіх — адзінкавыя прыклады. Мала асоб, якія могуць так пісаць. Але дзяржава павінна разумець: ёсць рэчы, без якіх культура не можа існаваць, яны павінны быць. Літаратурна-мастацкая крытыка — з ліку такіх з'яў. Таму што такія публікацыі нясуць думку, яны сведчаць пра ўзровень выданняў, пра цікавасць грамадства да мастацкай сферы, якую мы хочам бачыць годнай, вартай гонару. Яны нават сведчаць пра ўзровень культуры, калі пад ёй разумець не толькі віды мастацтва ці Дамы культуры, а як пэўную светапоглядную прастору. А гэта і ёсць твар і гонар краіны...

Размаўляла Ларыса ЦІМОШЫК.

ПАЛЕСКІЯ РАБІНЗОНЫ XXI СТАГОДДЗЯ

Юны варатар футбольнага клуба «БАТЭ-2» здымаецца ў фільме паводле Янкі Маўра

Днямі на кінастудыі «Беларусьфільм» распачаліся здымкі двухсерыйнага дзіцячага прыгодніцкага тэлевізійнага фільма «Палескія рабінзоны, альбо Цуда-востраў» паводле аповесці знакамітага беларускага дзіцячага пісьменніка Янкі Маўра. Акурат з нагоды яго 130-годдзя, якое адзначалася сёлета ў маі.

Янка Маўр — вядомы казачнік і фантазёр, які пісаў для дзяцей настолькі захапляльна і ў той жа час проста, што быў неверагодна папулярным яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму. Памятаю, як сама, будучы школьніцай, на бабулінай кніжнай паліцы знайшла яго «Палескіх рабінзонаў» — прачытала дні за два, проста ўзахлёб, не адрываючыся. Настолькі гэта прыцягальнае і не самотнае чытво для падлетка. На беларускай кінастудыі рэжысёр Сяргей Сычоў паводле сцэнарыя Фёдара і Ягора Коневых паспрабуе зрабіць не менш захапляльнае і рамантычнае дзіцячае кіно. У склад творчай групы таксама ўваходзяць: аператар Сяргей Мілешкін, мастак-пастаноўшчык Аляксандр Чартовіч, кампазітар Уладзімір Кандрусевіч ды іншыя.

Сюжэт фільма, вядома, асучаснілі. Каму сёння патрэбныя смелыя і сумленныя савецкія школьнікі-натуралісты, якія ўмудрыліся выжыць на бязлюдным востраве ды яшчэ дапамагчы дарослым абязброіць бандыцкую банду? Таму ў сучаснай версіі «Палескіх рабінзонаў» з'явіцца і новыя персанажы, і, магчыма, новы сэнс. Першую серыю карціны ў кулуарах ужо называюць «Рэтра»: маўляў, гэта будзе амаль літаральны пераказ гісторыі Янкі Маўра. Другая ж серыя — стане сюрпрызам. Тут сучасныя беларускія школьнікі сустрэнуцца з героямі Маўра пры загадкавых абставінах. Пры якіх — даведаецеся самі.

Ілья, Мірон і яго сястра Юля выратуюць выправіцца на пошукі вострава. Акрамя іх, востраў гэты прывабліваеяшчэ журналіста Васіля, аматара сенсацый, і шукальніка скарбаў Юрася. Дзед Мірона Уладлен хоча зберагчы дзяцей ад небяспекі і пагаджаецца стаць іх спадарожнікам па палескіх балотах. Рознымі шляхамі ўся гэтая стракатая кампанія трапляе на востраў і — панеслася! Прыгоды, перашкоды, новыя вымярэнні, міфічныя і сапраўдныя скарбы — у фільме абяцаюць усё. А галоўнае — смеласць, веды і сяброўства. Вечныя каштоўнасці, якія не састарэлі з 1930 года, калі Янка Маўр і напісаў свой бестселер.

Злева направа: Міша КАРАНЕЦКІ (Мірон), Насця КРАЎЧЭНЯ (Юля), Саша ТАЛАКА (Ілья) на кінапробах.

Генадзь АЎСЯННІКАЎ на кінапробах фільма «Палескія рабінзоны».

— Дзяцей на галоўныя ролі выбралі шляхам кастынгу, — тлумачыць **рэдактар фільма Кацярына ПАНАМАРОВА**. — Рэжысёр разам з асістэнтам па акцёрах Галінай Смірновай аб'ездзілі шмат мінскіх школ, гімназій і спецыяльных творчых навучальных устаноў у пошуках патрэбных тыпажоў. У выніку Ілью будзе іграць Аляксандр Талака, навучэнец сталічнага Тэатра-студыі юнацкай творчасці, Мірона — мінчанін Міхаіл Каранецкі, а дзяўчыну Юлю — Анастасія Краўчэня з Гомеля, якая ў 2011 годзе стала лаўрэатам прэміі глядацкіх сімпатый конкурсу «Я спяваю». Яны героі сучаснай гісторыі. Таксама ў фільме будуць задзейнічаны мінскія школьнікі, якія сыграюць менавіта герояў аповесці Янкі Маўра — Ягор Разсудоўскі і Ягор Шык, які здымаўся ў фільме Уладзіміра Хаціненкі «Поп» і з'яўляецца варатаром футбольнага клуба «БАТЭ-2». Усім дзецям ад 10 да 12 гадоў.

Акрамя юных талентаў, у «Палескіх рабінзонах» здымаюцца народны артыст СССР Генадзь Аўсяннікаў, народны артыст Беларусі Аляксандр Ткачонак, акцёры Сяргей Уласаў, Ігар Дзянісаў, Уладзімір Іваноў, Таццяна Баўкалава і іншыя.

Здымкі фільма пройдуць да пачатку верасня гэтага года ў Бярэзінскім запаведніку, Міры, Нясвіжы і на натурнай пляцоўцы «Беларусьфільма» недалёка ад горада Смалявічы.

Варта адзначыць, што праект фільма «Палескія рабінзоны, альбо Цуда-востраў» будзе цалкам фінансавацца з рэспубліканскага бюджэту, таму што сёлета перамог у другім адкрытым конкурсе кінапраектаў Міністэрства культуры ў намінацыі «Кінапраекты для дзяцей і юнацкай аўдыторыі».

Беларускія дзеці змогуць паглядзець фільм у пачатку наступнага года. Магчыма, кінастудыя «Беларусьфільм», багатая на свае традыцыі дзіцячага кіно, здзівіць юных гледачоў сучасным кінашэдэўрам.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.
Фота Сяргея МІЛЕШКІНА.

У ЗНАК ЛЮБОВІ ДА СЕРБІІ

Днямі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь доктар Стоян Еўціч уручыў сярэбраныя медалі «За заслугі» вучонаму-славісту, прафесару БДУ Івану Чароце і палітыку, старшыні Беларускага Славянскага камітэта Сяргею Касцяну. Рашэнне аб узнагароджванні высокімі адзнакамі за шчырую работу дзеля збліжэння беларускага і сербскага народаў Прэзідэнт Сербіі Таміслаў Нікаліч прыняў яшчэ 12 лютага 2013 года. Варта нагадаць, што Сяргей Касцян неаднойчы бываў у Сербіі, з'яўляецца ініцыятарам многіх грамадскіх праектаў у падтрымку брацкай краіны. Напісаў шэраг кніг, дзе завострана, публіцыстычна ўзнёсла апісвае сённяшняе становішча краіны. У прыватнасці — «Боль мой Югаславія», «Свет і адзінства славян».

Доктар філалагічных навук Іван Аляксеевіч Чарота доўгія дзесяцігоддзі даследуе і ўмацоўвае стасункі беларускай і сербскай літаратур. Дзясяткі паездак у Сербію, сустрэчы з пісьменнікамі, вучонымі, грамадскімі дзеячамі, праца ў сербскіх бібліятэках і навуковых цэнтрах выліліся ў сотні самых сур'ёзных публікацый. Вучоным, перакладчыкам за гэты час выдадзена каля 100 арыгінальных і перакладных кніг. Іван Аляксеевіч – ініцыятар многіх творчых праектаў па прадстаўленню сербскай літаратуры ў Беларусі, а беларускай – у Сербіі. Дзякуючы руплівасці, высокай працаздольнасці нашага суайчынніка не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі чытач займеў магчымасць адкрыць многія імёны і творы сербскай літаратуры. Іван Чарота раней быў узнагароджаны ордэнам Святога Савы Сербскага, а таксама Залатым знакам Культурна-асветнага таварыства Сербіі. Беларускі вучоны абраны і акадэмікам Сербскай Акадэміі навук.

Сяргей ПАЎЛАЎ.

Вялікая Айчынная

Мінула ўжо 72 гады з таго часу, як яна пачалася, раптоўна абрынуўшыся на ўсю краіну, на кожны дом, на кожную сям'ю. Вайна працягвалася доўгія чатыры гады, і кожны дзень яе для тысяч (а то і дзясяткаў тысяч людзей) станавіўся апошнім.

Аб той вайне памяць жыве і цяпер. Самыя дарагія ўспаміны — у тых, хто, уцягнуты ў вір яе жахлівых падзей, ацалеў, устаяў, выжыў, не страціўшы чалавечай годнасці. Хто дажыў да нашых дзён і можа расказаць нашчадкам, што вайны не бачылі, як гэта было... Пакуль не прыйшло Вызваленне.

■ Моцныя духам

«ВАЙНА МЯНЕ ЗАГАРТАВАЛА...»

Стары пяціпавярховы дом на ціхай мінскай вулачцы. Набіраю на дамафоне патрэбную лічбу і ўзгадваю тэлефонную просьбу Клаўдзіі Андрэевай: «Толькі не пішыце пра мяне, як пра ікону». Тады я ведала пра яе толькі тое, што ў Вялікую Айчынную вайну яна была авіятэхнікам...

Дзверы адчыняе маленькая хударлявая жанчына. На вуснах — чырвоная памада, на галаве — завіўка. Узрост — не перашкода для жаноцкасці. Як і вайна. «А ведаеце, як у вайну мы накручвалі валасы? — з усмешкай глядзіць яна на мяне, стоячы каля люстэрка. — Змочым пасмачкі ў цукровай вадзе і намотваем іх на драўляныя палачкі...»

Вось ён, жаночы твар вайны. А па-іншаму і быць не магло. Усё супала: гора, маладосць... Клаўдзіі Андрэевай тады было толькі 17.

Напярэдадні вайны яна працавала сакратаром-машыністкай у Інстытуце спіртавой прамысловасці ў саўгасе Вельямінава, што ў Падмаскоўі. Трэба было зарабляць грошы, каб дапамагчы сям'і, якая жыла пад Самарай. Бацькі былі простымі сялянамі. Багацця вялікага не мелі, ды і малога не было. А карміць маленькіх дзяцей трэба.

Калі пачалася вайна, дзяўчына спатрэбілася ў арміі, бо ўмела друкаваць на машынцы. Разам з гэтай машынкай яе і забралі ў 122-гі знішчальны авіяцыйны полк, які стаяў якраз у Вельямінава. Райкам быў не супраць. Дырэктар не хацеў страціць добрую машыністку, але адпусціць быў вымушаны: «Ну што ж, Клавачка, едзь. Вайна...»

Так Клаўдзія Андрэева апынулася на авіябазе Кубінка, што пад Масквой. Друкавала дакументы, пастановы... А яшчэ працавала авіятэхнікам. Такой раскошы, каб сядзець толькі за машынкай, у баявой часці дазволіць не маглі: кожны чалавек на ўліку. Прыляціць лётчык з задання, ідзе абедаць. А ёй за гэты час патрэбна заправіць самалёт гаручым, снарадзіць кулямётныя стужкі, высушыць і скласці парашуты. Вядома, не адной. Але з такімі ж, як і яна, памочніцамі — маленькімі, хударлявымі. А боепрыпасы былі цяжкімі. Зложаць іх у мех і цягнуць на плячах да самалёта. Мужчын у дапамогу не было: усе ваявалі. Толькі камандзір быў побач. Узляцяць самалёты, а ён і кажа: «Ну, усё, дзяўчаты, адпачывайце!»

— Толькі мне не да адпачынку: лічу самалёты, — успамінае Клаўдзія Іванаўна. — Вяртаюцца, зноў лічу, каб ведаць, колькі порцый накрываць на вячэру. Калі ўсе прыляцелі, крычу: «Усе вярнуліся!» Калі хоць аднаго не хапае, то адразу ў слёзы. Па кожным лётчыку плакала: шкадавала. Камандзір як убачыць, дык адразу прыстрашвае: «Не плач — гэта вайна. Будзеш плакаць — на перадавую адпраўлю!» А вось кармілі дзяўчат-авіятэхнікаў не так, як лётчыкаў. Міска супу, кавалак хлеба, — вось і ўвесь абед, — успамінае яна.

Калі полк адправілі на перавучанне, Клаўдзію перавялі ў штаб 1-й паветранай арміі — у Бабруйск. І днём, і ноччу не сціхала пастукванне па клавішах друкаванай машынкі. Дзяўчына першай даведвалася аб прыняцці пэўных рашэнняў, аб колькасці дзеючай тэхнікі, аб тых, хто не вярнуўся з нябеснага поля бою... Не раз даводзілася друкаваць пахаванкі.

— Раніцай сядзім разам з лётчыкам на камсамольскім сходзе, потым ён ляціць на баявое заданне, а вечарам ужо пішу на яго пахаванку, — уздыхае Клаўдзія Андрэеўна. — Аднойчы пісала пахаванку на сяброўку, з якой жыла. А на яе месцы магла быць і я. Яна, можна сказаць, мне другое жыццё падаравала. Сваё жыццё...

А было ўсё так. Клаўдзія і Людміла абедалі ў сталовай. За іх стол падсеў лётчык. Перад гэтым ён паклаў на падаконнік свой пісталет звяліўся і... выстраліў. Куля трапіла ў жывот. Праз некалькі дзён сяброўка памерла.

Дзень Перамогі Клаўдзія Андрэева сустрэла ва Усходняй Прусіі. Доўгачаканую навіну аб'явіла камандаванне, сабраўшы ўсіх на пляцы. «Мы, жанчыны, так плакалі! Не маглі паверыць, што ўвесь гэты жах скончыўся», — успамінае яна. — І толькі тады зразумелі — як моцна стаміліся на гэтай вайне.

Некалькі дзён яшчэ жылі там, у закінутым доме.

— Аднойчы з дзяўчатамі на адной з паліц знайшлі муку, — успамінае ветэран Вялікай Айчыннай вайны. — Так захацелася напячы праснакоў: у вайну нічога больш смачнага за салодкія сухары і пячэнне з буракоў не елі. Калі напяклі, пабаяліся нават каштаваць: а раптам мука была атручаная? Толькі выйшлі на некалькі хвілін, як праснакоў і след прастыў: з'елі салдаты. Дзякуй Богу, засталіся жывымі! *(Смяецца.)*

Пасля вайны Клаўдзія Андрэева працавала ў КДБ. Яшчэ падчас ваеннага ліхалецця яе пачалі «правяраць» на прафпрыдатнасць. Падыходзіла! У гэтай службе сакратаром-машыністкай адпрацавала ажно 40 гадоў! Адсюль і пайшла на пенсію.

Сёння Клаўдзія Андрэева — член Беларускай грамадскай арганізацыі ветэранаў КДБ «Гонар», ветэранскага клуба «Бабулі». Яна актыўна ўдзельнічае ва ўсіх мерапрыемствах гэтых арганізацый. На самыя вялікія святы — Дзень Перамогі і Дзень Незалежнасці — апранае святочны пінжак, на якім — самае дарагое: ордэн Айчыннай вайны II ступені, ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За баявыя заслугі», «За абарону Масквы»...

У свае 94 гады Клаўдзія Іванаўна выглядае маладзейшай на гадоў 20. На маё пытанне, якімі лекамі падтрымлівае сябе ў добрым стане і вясёлым настроі, прызнаецца, што ніколі не ўжывала ніякіх пілюляў. «Вайна — вось мая загартоўка! Калі здолела вынесці гэты жах, то старасць — яшчэ не самае страшнае».

Вераніка КАНЮТА.
Фота аўтара

■ Пошукавы дзённік

ФРАНТАВЫ ЛЕТАПІС БРАТОЎ СІНІЦЫНЫХ

Нават праз 68 гадоў пасля Вялікай Перамогі Савецкага народа над нямецка-фашысцкімі захопнікамі застаюцца тысячы імёнаў, якія назаўсёды страчаны для сучаснай гісторыі: маёры, лейтэнанты, сяржанты і радавыя — спаўна аддалі свой доўг Радзіме, а іх імёны і подзвігі застаюцца невядомымі. І калі цяпер аднавіць вялізную колькасць інфармацыі па ўсіх загінулых і знікламі без вестак не ўяўляецца магчымым, то паспрабаваць высветліць лёс сваіх дзядоў і прадзедаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, можна і трэба.

Дзве вялікія сям'і — майго прадзеда і яго роднага брата — перад пачаткам вайны жылі ў вёсцы Пападзьіна Талдомскага раёна Маскоўскай вобласці. Гэта вёска некалі належала Калязінскаму павету Цверскай губерні. Таму можна сказаць, што каранi ўсяго роду Сініцыных менавіта цверскія. У абедзвюх сем'ях было па 10—12 дзяцей, якія выхоўваліся ў цяжкі ваенны час. Пасля вайны, у 1946 годзе, маці былі ўзнагароджаны ордэнамі «Маці-гераіня». З тых сыноў і мужоў, якія пайшлі на фронт, назад вярнуліся нямногія. І не на ўсіх былі звесткі, дзе і як хто загінуў. Праўду знайсці дапамог выпадак.

09.05.2012 У дзень Вялікай Перамогі мною былі знойдзены ў інтэрнэце спісы незваротных страт, у якіх значыліся прозвішчы і імёны роднага брата майго прадзеда і яго сына, якія лічыліся загінулымі ў баях за радзіму. Андрэй Аляксандравіч Сініцын, радавы 1115-га стралковага палка, наводчык 2-й мінамётнай роты — загінуў 24 верасня 1943 года ў вёсцы Ляшчова Веліжскага раёна Смаленскай вобласці. Разам з жонкай Марфай яны выхоўвалі 10 дзяцей, адным з якіх быў Павел Андрэевіч Сініцын — камандзір аддзялення 247-га гвардзейскага стралковага палка 84-й гвардзейскай стралковай дывізіі, які загінуў у баі 05 лютага 1944 года ў вёсцы Кіслякі Віцебскай вобласці — за 50 кіламетраў ад месца, дзе назаўсёды застаўся яго бацька. Пералічаных населеных пунктаў на сучасных картах абедзвюх краін ужо не існуе, таму пошукі інфармацыі пачыналіся з гутарак з супрацоўнікамі мясцовых адміністрацый і краязнаўцамі.

06.07.2012 На населеных пунктах, у баях за якія аддалі свае жыцці Андрэй і Павел Сініцыны, удалося знайсці ўсе звесткі. Як высветлілася, вёска Ляшчова цяпер тэрытарыяльна належыць Панізоўскаму сельскаму Савету Руднянскага раёна, і ўжо з'яўляецца нежылой. Побач з былой вёскай Кіслякі ёсць населены пункт Грушэўская, які ў часы вайны насіў назву Сываратка. Менавіта там, паводле аповедаў захавальніка Заронаўскага музея Любові Нікіцінай, размяшчаўся палявы шпіталь, куды звозілі параненых і забітых байцоў.

24.09.2012 Прыйшлі адказы з ваенкаматаў па месцы знаходжання населеных пунктаў. Удалося даведацца, што Андрэй Сініцын не лічыцца ў спісах пахаваных у брацкай магіле ў вёсцы Ляшчова, якая знаходзіцца на мясцовых могілках, а Павел Сініцын памёр ад ран у вёсцы Сываратка і пахаваны ў вёсцы Заронава Віцебскай вобласці (там цяпер воінскі мемарыял). Менавіта ў гэты восеньскі дзень, якраз 69 гадоў таму, паў смерцю храбрых наводчык 2-й мінамётнай роты 1115-га стралковага палка, бацька 10 дзяцей — Андрэй Аляксандравіч Сініцын.

На падставе спісаў незваротных страт і іншых пададзеных дакументаў, Андрэй Сініцын быў увекавечаны ў спісах пахаваных у брацкай магіле, якая знаходзіцца ў вёсцы Панізоўе, куды ў 1953 годзе былі перанесены астанкі воінаў з вёскі Ляшчова. Па яго сыне, Паўлу Сініцыну, у сеціве ўдалося знайсці фотаздымкі мемарыяльных пліт з Заронаўскага мемарыяла, на якіх фігуравала яго прозвішча.

04.02.2013 Сабраўшыся ў дарогу, каб пакланіцца магілам прадзеда і яго сына, пабываць на той зямлі, за якую яны пралівалі кроў, я са сваёй нявестай Таццянай выехаў са Смаленска ў напрамку горада Рудня. Наведаўшы мемарыял у Панізоўі, мы адклалі паездку ў само Ляшчова з-за верагоднай адсутнасці дарогі. Але мясцовы жыхар нам вельмі падрабязна расказаў, як туды праехаць.

Далей наш шлях пралягаў у Беларусь. Па добрай асфальтавай дарозе за 2,5 гадзіны мы дабраліся да вёскі Заронава. Там адбылося знаёмства з незвычайным чалавекам — захавальнікам Заронаўскага музея-запаведніка Любоўю Нікіцінай. Нас сустрэлі як дарагіх гасцей: усё расказалі, паказалі музей, выехалі з намі на месцы баёў у былую вёску Сываратка. У вёсцы Заронава, у брацкай магіле, там, дзе зараз мемарыял, пахавана больш як 8000 байцоў, якія аддалі свае жыцці за мірнае неба над нашай галавой. Толькі праз шэсць гадзін, якія незаўважна праляцелі ў гутарках з захавальніцай музея Любоўю Нікіцінай, мы адправіліся дадому.

23.03.2013 На адрас ваенкамата Талдомскага раёна, адкуль у розныя гады былі прызваны мае родныя, быў накіраваны ліст, у якім фігуравалі наступныя радкі:

«… На падставе прыкладзеных дакументаў прашу Вас унесці змяненні ў электронную версію кнігі памяці загінулых у Вялікай Айчыннай вайне, а таксама ўлічыць вызначаныя звесткі падчас перавыдання яе друкаванага варыянта:

Сініцын Павел Андрэевіч 1925 г.н. Прызваны Талдомскім РВК у 1943 г. Камандзір аддзялення 247 гв. СП 84 гв. СД сувязі. Загінуў у баі 05.02.1944 г. у в. Кіслякі Віцебскай вобласці. Пахаваны ў брацкай магіле ў в. Заронава Віцебскай вобласці. Нумар пахавання — 4407.

Сініцын Андрэй Аляксандравіч 29.09.1898 г.н. Прызваны Талдомскім РВК 25.12.1941 г. радавы 1115-га стралковага палка наводчык 2-й мінамётнай роты — забіты 24.09.1943 г. у в. Ляшчова Руднянскага раёна Смаленскай вобласці. Пахаваны ў брацкай магіле № 10 в. Панізоўе Руднянскага раёна Смаленскай вобласці пад нумарам 803.

Вечная ім слава і памяць!

Міхаіл СІНІЦЫН

Жыхар Петрыкава Мікалай Фёдаравіч ДАМАСЕВІЧ у вайну быў пехацінцам, потым артылерыстам, страляў з 152-міліметровай гарматы. У баях пад Кёнігсбергам яму давялося займацца размініраваннем палёў, быў паранены. Перамогу сустрэў каля Эльбы.

На франтах змагаліся, з ворагам яго бацька і старэйшы брат.

У мірным жыцці Мікалай Фёдаравіч працаваў на Петрыкаўскім судабудаўнічым заводзе. А яшчэ доўгі час ён даглядаў калгасных коней.

У ветэрана чацвёра дзяцей, шэсць унукаў і ажно 13 праўнукаў. У свята Перамогі родныя заўсёды збіраюцца ў доме франтавіка.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

■ Гісторыя аднаго судовага працэсу

ЧЫНГІСХАНЫ ДВАЦЦАТАГА СТАГОДДЗЯ

Людзі, што перажылі вайну, добра помняць, як здзіўляла іх часам нямецкая гуллівасць. Салдат або афіцэр, зайшоўшы ў вясковую хату і ўбачыўшы дзяўчынку ці хлопчыка, мог раптоўна расчуліцца, прытуліць малечу да сябе, дастаць з кішэні зялёнага фрэнча фотаздымак і з прыкметным замілаваннем сказаць: «Майн кіндэр». А яшчэ — пачаставаць збянтэжанае дзіця тонкай пліткай гаркаватага нямецкага шакаладу, «выдзьмуць» на губным гармоніку жаласлівую мелодыю, ад якой вільгатнелі ягоныя вочы.

І куды толькі знікалі ўсе гэтыя звычайныя праявы чалавечнасці, калі вымуштраваны і дысцыплінаваны нямецкі салдат прыступаў да выканання загадаў, інструкцый, цыркуляраў. Жудасны ідыятызм фашызму: звышчалавек як прадстаўнік вышэйшай арыйскай расы павінен быць бязлітасным да непаўнацэнных народаў, таму ніяк не мог заставацца проста чалавекам. Кожны нямецкі салдат меў памятку: «У цябе няма сэрца і нерваў. На вайне яны непатрэбныя, знішчы ў сабе спагаду і спачуванне». Да таго ж сам фюрэр вызваліў сваіх салдат ад сумлення, якое называў хімерай, што прыніжае воіна-арыйца.

Падчас судовага працэсу ў Мінску, ужо ў студзені 1946-га, пракурор дапытваў Ганса Германа Коха, які ў перыяд акупацыі быў афіцэрам гестапа ў Оршы. Гітлеравец прызнаўся, што аднойчы за дзень расстраляў 10 жанчын і 8 дзяцей ад 2 да 10 гадоў. Словы гестапаўца аглушылі залу.

Пракурор спытаўся:

— Няўжо ў дзяцей былі нейкія палітычныя погляды?

— Не, вядома, але ў нас быў прынцып, каб забіваць і дзяцей.

— А ў вас дзеці ёсць? І якога ўзросту?

— Дзяцей трое. Год, 3 гады і 5 гадоў.

— Іх можна абвінаваціць у нейкіх палітычных злачынствах?

— Вядома, не.

— Дык па якім прынцыпе вы расстрэльвалі дзяцей?

— Гэта было практычнае ажыццяўленне расавай тэорыі. Знішчэнне другой расы. На пачатку кожнай экзекуцыі я асабіста расстрэльваў не менш як трох чалавек, каб паказаць салдатам, што яны павінны быць стойкімі...

Падпалкоўнік Эрнст Фальк камандаваў ахоўным батальёнам. «Чорную памяць» пакінулі яго карнікі ў Друі, Варапаеве, Дунілавічах, у вёсках Глыбоцкага раёна каля возера Шоша. На пытанне, чаму батальён знішчаў мірных жыхароў, камандзір механічна праштампаваў стандартную для гітлераўцаў фразу:

— Я атрымаў загад і выконваў яго.

— Дзяцей таксама забівалі?

— Так, — адказаў спакойна, добра завучаным тонам, якім рапартуюць вышэйшаму начальству, — быў загад знішчаць усё насельніцтва.

Палкоўнік Георг Вайсіг, полк якога спаліў на Віцебшчыне больш як 200 вёсак, таксама спаслаўся на загад: «Я разумеў, што мы паступаем бесчалавечна, насуперак усім маральным нормам, але быў перакананы, што такая практыка была хоць і жорсткай, але правільнай».

Усе яны чакалі ад суда літасці. Асабліва ганебна вёў сябе пры гэтым генерал Рыхерт — той самы, што кіраваў многімі карнымі аперацыямі. У сваім апошнім слове ён казаў, што пачынае крытычнае асэнсаванне свайго жыцця, што ён ужо не такі перакананы прыхільнік рэжыму нацыянал-сацыялізму, якім быў нядаўна, і яму патрабуецца час, каб працэс перавыхавання быў паспяховым, ён абяцае, што ў будучым стане жыць у духу антыфашызму.

Зала з абурэннем зашумела, людзі ўспрынялі яго словы як здзек, але ён гэтага не разумеў і лісліва глядзеў на старшыню суда. Той сурова маўчаў.

Нешта падобнае мармытаў і афіцэр-эсэсавец Рольф Бургард: «Я ўжо вызваліўся ад ідэалогіі фашызму, але нейкія рэшткі яшчэ засталіся. Магчыма, праз паўгода і іх не будзе».

І гэты таксама разлічваў жыць пасля таго, як заліў зямлю чалавечай крывёю.

Генерал-майр Герф Эбергард быў з тых, хто аддаваў загады ўсім гэтым буркардам, фалькам, найсігам, кохам.

Але на судзе не згадзіўся ўзяць на сябе адказнасць, перакінуў яе на больш высокую інстанцыю: «Быў загад без подпісу: вайну супраць СССР разглядаць як не падобную на ўсе іншыя войны. Гэтым загадам прадпісвалася паліць вёскі, забіваць людзей. Сэнс загаду — савецкі народ знішчаць, а маёмасць адпраўляць у Германію. Неўзабаве гэты загад быў выняты з сакрэтнай дакументацыі: баяліся, што ён можа трапіць у рукі Чырвонай Арміі».

А яшчэ генерал успомніў, што летам 1943-га Гімлер, сабраўшы ў Берліне тэрміновую нараду, катэгарычна запатрабаваў ад карных кадраў дзейнічаць так, як у свой час Чынгісхан.

Сцвярджэнне «Фашызм — чума дваццатага стагоддзя» — усё ж такі не з'яўляецца метафарай. Гэта дыягназ.

Анатоль БРУЦКІ

УВАГА! ПАДАЁМ ДАКУМЕНТЫ Ў АСПІРАНТУРУ

Учреждение образования
«Белорусский государственный аграрный технический университет» УНП 100185315
ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ на 2013/2014 учебный год по следующим специальностям:

Специальности	План набора: Дневная форма обучения	План набора: Заочная форма обучения
05.26.01 — охрана труда	2	-
05.20.01 — технологии и средства механизации сельского хозяйства	5	-
05.20.02 — электротехнологии и электрооборудование в сельском хозяйстве	2	-
05.20.03 — технологии и средства технического обслуживания в сельском хозяйстве	3	-
05.13.06 — автоматизация и управление технологическими процессами и производствами	1	-
05.05.03 — колесные и гусеничные машины	1	-
05.14.08 — энергоустановки на основе возобновляемых источников энергии	1	-
08.00.05 — экономика и управление народным хозяйством	3	2

Прием документов — **с 1 августа по 30 сентября 2013 г.**
Вступительные экзамены по специальности — **с 10 по 21 октября 2013 г.**
Начало занятий — **1 ноября 2013 года.**
Адрес приемной комиссии: **220023, г. Минск, пр. Независимости, 99/5-1, каб. 504 (тел. 8 017 385 91 07).**

Учреждение образования УНП 400073500
«Гомельский государственный технический университет имени П.О. Сухого» объявляет набор в соответствии с контрольными цифрами приема для получения послевузовского образования I ступени (аспирантура) за счет средств республиканского бюджета на 2013 год

Шифр/Специальность	Всего, чел.	Дневная форма	Заочная форма	Соискательство
05.02.02 Машиноведение, системы приводов и детали машин	1	-	-	1
05.14.04 Промышленная теплоэнергетика	2	1	1	-
05.16.04 Литейное производство	2	1	1	-
Всего	**5**	**2**	**2**	**1**

Подготовка научных кадров высшей квалификации в аспирантуре университета осуществляется по 10 специальностям.
Срок подачи документов **с 1 сентября по 31 сентября 2013 года по адресу: г. Гомель, пр. Октября, 48, корпус 1, кабинет 601.**
Более подробную информацию можно получить по телефону: **8 (0232) 48 15 62.**
Приглашаем всех желающих!

Учреждение образования
«БРЕСТСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ТЕХНИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»
ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ на дневную и заочную формы получения образования
на обучение за счет средств республиканского бюджета на 2013 год,
установленные приказом Государственного комитета по науке и технологиям Республики Беларусь от 06 июня 2013 г. № 221,
по следующим отраслям науки и специальностям

Отрасль науки	Шифр и наименование специальности	Форма получения образования	Количество мест
Технические науки	05.02.02 – Машиноведение, системы приводов и детали машин	заочная	1
	05.13.15 – Вычислительные машины, комплексы и компьютерные сети	дневная	5
	05.23.01 – Строительные конструкции, здания и сооружения	дневная	3
	05.23.05 – Строительные материалы и изделия	дневная	1
Экономические науки	08.00.05 – Экономика и управление народным хозяйством	дневная заочная	1 1

Также осуществляется прием в аспирантуру на дневную и заочную формы получения образования, а также в форме соискательства на обучение за счет средств юридических и физических лиц по следующим научным специальностям:

01.00.00	**Физико-математические науки**
01.02.04	Механика деформируемого твердого тела
01.04.14	Теплофизика и теоретическая теплотехника
05.00.00	**Технические науки**
05.02.02	Машиноведение, системы приводов и детали машин
05.02.04	Трение и износ в машинах
05.13.15	Вычислительные машины, комплексы и компьютерные сети
05.14.04	Промышленная теплоэнергетика
05.23.01	Строительные конструкции, здания и сооружения
05.23.02	Основания и фундаменты, подземные сооружения
05.23.04	Водоснабжение, канализация, строительные системы охраны водных ресурсов
05.23.05	Строительные материалы и изделия
05.23.08	Технология и организация строительства
05.23.17	Строительная механика
08.00.00	**Экономические науки**
08.00.05	Экономика и управление народным хозяйством
25.00.00	**Науки о земле**
25.00.36	Геоэкология

Срок обучения: дневная форма – до 3 лет, заочная – до 4 лет, соискательство – до 5 лет.
Прием документов для поступления в аспирантуру **с 1 августа по 30 сентября 2013 года.**
Вступительные экзамены проводятся **с 10 октября по 20 октября 2013 года.**
Документы принимаются по адресу: **224017 г. Брест, ул. Московская, 267, БрГТУ, аспирантура (каб. 5/109), телефон для справок: 42 26 45.**
Дополнительная информация на сайте: **www.bstu.by**
УНП 200002511

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛЫХ ДОМОВ

1. Дата, время, место проведения аукциона: 28 июля 2013 года в 11.00 в здании Великодолецкого сельского Дома культуры, ул. Лесная, 2 а

	Участок № 1: д. Заозерье, 10 А Великодолецкого сельсовета Ушачского района	Участок № 2: д. Заозерье, 10 Б Великодолецкого сельсовета Ушачского района	Участок № 3: д. Заозерье, 10 В Великодолецкого сельсовета Ушачского района	Участок № 4: д. Ветче, 18 Великодолецкого сельсовета Ушачского района
2. Адрес участка				
3. Площадь участка	0,2078 га	0,2055 га	0,2084 га	0,2254 га
4. Кадастровый номер	224980706101000047	224980706101000048	224980706101000049	224980702601000026
5. Начальная цена	15 000 000 рублей	15 000 000 рублей	15 000 000 рублей	15 000 000 рублей
6. Шаг аукциона	1 500 000 рублей	1 500 000 рублей	1 500 000 рублей	1 500 000 рублей

7. Место, дата, время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов: Ушачский район, аг. Великие Дольцы, ул. Центральная, 1б, в рабочие дни с 9.00 до 16.00 с 24.06.2013 по 24.07.2013 включительно.

8. Размер задатка — 1 000 000 рублей, вносится на расчетный счет: Великодолецкий сельский исполнительный комитет 3641328011094 в ф-ле № 216 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Полоцк, код 150801648, УНП 300007086, ОКПО 28677750.

9. Адрес и номер контактного телефона: Ушачский район, аг. Великие Дольцы, ул. Центральная, 1б, Великодолецкий сельисполком, (8 02158) 233 23, 233 38, в рабочие дни с 8.00 до 16.00.

Информационное извещение о проведении Ивацевичским районным исполнительным комитетом открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков

Характеристика земельных участков, выставляемых на аукцион

Местонахождение (адрес земельного участка)	Брестская область, г. Ивацевичи, улица Т. Костюшко, 9 (далее – лот № 1)	Брестская область, Ивацевичский район, Житлинский с/с, аг. Воля, ул. Гойшика, 71А (далее – лот № 2)
Площадь участка, га	0,1480	0,0030
Виды земель	земли общего пользования	земли общего пользования
Вещное право на земельный участок	аренда сроком на 25 (двадцать пять) лет	аренда сроком на 10 (десять) лет
Целевое назначение земельного участка (назначение участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества)	для строительства объекта торговли, общественного питания, оказания услуг (для размещения объектов розничной торговли, код 11603)	для установки и обслуживания торгового павильона (для размещения объектов розничной торговли, код 11603)
Кадастровый номер участка	123450100001003286	123483601601000318
Начальная (стартовая) цена земельного участка, рублей	41298950 (сорок один миллион двести девяносто восемь тысяч девятьсот пятьдесят)	18930 (восемнадцать тысяч девятьсот тридцать)
Наличие инженерных коммуникаций на прилегающей территории	сети электроснабжения, водоснабжения, канализации, газоснабжения	сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения
Состояние дорожной сети улиц	с гравийным покрытием	с асфальтобетонным покрытием
Ограничения в использовании	нет	нет

Информационное извещение о проведении Ивацевичским районным исполнительным комитетом открытого аукциона по продаже в частную собственность граждан и негосударственных юридических лиц Республики Беларусь земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Ивацевичи

Характеристика земельного участка, выставляемого на аукцион

Местонахождение (адрес земельного участка)	Брестская область, г. Ивацевичи, улица Гордейчика П.И., 5 (далее – лот № 3)
Площадь участка, га	0,1370
Виды земель	земли под застройкой
Вещное право на земельный участок	частная собственность
Целевое назначение земельного участка (назначение участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества)	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома), код 10902)
Кадастровый номер участка	123450100001003013
Начальная (стартовая) цена земельного участка, рублей	43245970 (сорок три миллиона двести сорок пять тысяч девятьсот семьдесят)
Наличие инженерных коммуникаций на прилегающей территории	сети электроснабжения, водоснабжения, канализации, газоснабжения
Состояние дорожной сети улиц	с гравийным покрытием

Аукционы состоятся 25 июля 2013 года в 15.00 в малом зале райисполкома по адресу: Брестская область, г. Ивацевичи, ул. Ленина, д. 44, каб. 116.

Для участия в аукционах граждане, индивидуальные предприниматели или юридические лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) представляют комиссии следующие документы:

заявление об участии в аукционе;

копию платежного поручения, заверенную банком, о внесении суммы залога в размере: лот № 1 – **8259700** (восемь миллионов двести пятьдесят тысяч семьсот) рублей, лот № 2 – **3700** (три тысячи семьсот) рублей, лот № 3 – **4066700** (четыре миллиона шестьдесят шесть тысяч семьсот) рублей на р/с № 3641100650034 в ЦБУ № 111 филиала № 802 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Ивацевичи, код банка 245, получатель платежа – Ивацевичский райисполком, УНП 200100489, назначение платежа 04002 (для лотов №№ 1, 2) и 04901 (для лота № 3);

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц, индивидуальные предприниматели предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Граждане, индивидуальные предприниматели (лоты № 1, № 2) и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукционов.

Аукционы проводятся при условии наличия не менее двух участников аукциона по каждому предмету аукциона.

Предоставление земельных участков в аренду, частную собственность победителям аукционов либо единственным участникам несостоявшихся аукционов производится без изменения их целевого назначения с условиями:

внесения платы за предметы аукционов, возмещения исполкому расходов по организации и проведению аукционов в размере: лот № 1 – 2820069 (два миллиона восемьсот двадцать тысяч шестьдесят девять) рублей, лот № 2 – 4870789 (четыре миллиона восемьсот семьдесят тысяч семьсот восемьдесят девять) рублей, лот № 3 – 1432200 (один миллион четыреста тридцать две тысячи двести) рублей в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протоколов о результатах аукционов;

заключения (в течение 2 рабочих дней после внесения платы за предметы аукционов, возмещения расходов по организации и проведению аукционов) победителями аукционов либо единственными участниками несостоявшихся аукционов с Ивацевичским райисполкомом договоров аренды земельных участков и обращения в двухмесячный срок со дня подписания договоров аренды за установленной регистрацией прав на земельные участки;

обращения победителями аукционов либо единственными участникам несостоявшихся аукционов по продаже земельных участков в частную собственность за государственной регистрацией прав на земельные участки в двухмесячный срок со дня утверждения протоколов о результатах аукционов;

получения победителями аукционов в установленном порядке разрешений на проведение проектно-изыскательских работ и разработки, утверждения проектной документации на объекты в срок, не превышающий 1 года для лотов № 2, № 3 и 2 лет для лота № 1 со дня получения свидетельств о государственной регистрации прав и ограничений на земельные участки;

занятия земельных участков в течение шести месяцев (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей) и одного года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на объекты;

снятия на земельных участках плодородного слоя почвы из-под пятен застройки и использования его в соответствии с проектной документацией (для лота № 1), для благоустройства участка (для лота № 3);

осуществления строительства объектов в сроки, определенные проектно-сметной документацией или действующим законодательством;

возврата земельных участков по окончании сроков аренды или заключения договоров аренды на новые сроки (для лотов №№ 1, 2).

Результаты аукционов оформляются протоколами, копии которых выдаются победителям аукционов либо единственным участникам несостоявшихся аукционов в день проведения аукционов либо в день признания аукционов несостоявшимися.

Предварительное ознакомление с земельными участками на местности проводится при подаче заявления.

Заявления на участие в аукционе принимаются с 25 июня 2013 г. по адресу: 225291, Брестская область, г. Ивацевичи, ул. Ленина, 44, каб. 422 с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по 19 июля 2013 года включительно.

Контактные телефоны в г. Ивацевичи: (801645) 2-13-69, 2-54-76, 3-00-94.

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**Лот № 1.** Автопогрузчик (Львов, Украина), г/п 5 тонн, высота подъема 3 м стоимостью 9 394 400 белорусских рублей. **Лот № 2.** Ленточная пилорама MG 6200M/ для распиловки леса, Д=650 мм, ленточная пила 35 мм, L=4250 мм стоимостью 25 683 200 белорусских рублей. **Лот № 3.** Станок двупильный/для продольного раскроя необрезных досок. Модель не установлена. Стоимость 4 592 000 белорусских рублей. **Лот № 4.** Станок многопильный/для распиловки леса. Модель не установлена. Стоимость 5 212 000 белорусских рублей.
Собственник (владелец) имущества	**ЧПУП «Еременко», УНП 390389777**
Наличие обременений	**Обременений нет.**
Местонахождение (адрес) имущества	**Полоцкий р-н, д. Полота, пер. Первомайский, 1а**
Место (адрес), дата и время проведения торгов	**26.07.2013 в 12.00 г. Витебск, ул. «Правды», 32, каб. 320**
Справочная информация об организаторе торгов	Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 320, http://court.by/vitebsk/ Судебный исполнитель Рязяпов Никита Фанилевич, тел./факс: (80212) 491340, (8044) 7467300, старший судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич, тел.: (80212)491340, (8044)7349300
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670, не позднее 11.30 26.07.2013 г. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. Более подробную информацию можно получить на сайте ВХС http://court.gov.by/online-help/executive/disposition/upcoming-auction/Vitebsk/

Вниманию акционеров ОАО «Белгорхимпром»!

ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ СОСТОИТСЯ
4 июля 2013 года в 11.00
по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17 в актовом зале.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об утверждении Положения «О порядке начисления и выплаты дивидендов в ОАО «Белгорхимпром».

2. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Белгорхимпром».

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, пр. Машерова, 17, каб. № 426а) с 13.00 до 16.45 со 2 июля 2013 г., а в день собрания — по месту его проведения.

Акционерам, передавшим на основании доверенности свои полномочия на участие в общем собрании членам наблюдательного совета, участие в собрании не обязательно.

Регистрация акционеров (их представителей), имеющих право на участие в собрании, — в день проведения собрания **с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале (3 этаж).**

При себе иметь следующие документы: акционеру — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 600024712

Вниманию акционеров ОАО «Знамя индустриализации»!

ОАО «Знамя индустриализации»
осуществляет выплату дивидендов по итогам работы Общества за 2012 год:

- работающим акционерам — одновременно с выплатой заработной платы через отделения филиалов ОАО «Беларусбанк»,
- иногородним акционерам — почтовым электронным переводом,
- юридическим лицам — путем перечисления на расчетный счет,
- госслужащим — перечислением на счет доверительного управляющего ОАО «Беларусбанк».

Дата закрытия реестра для начисления дивидендов — 01.03.2013 г.

УНН 300200360

УНП 290984478

Да ўвагі акцыянераў
адкрытага акцыянернага таварыства «Сталічны праспект»!

28 чэрвеня 2013 года
адбудзецца пазачарговы агульны сход акцыянераў

ААТ «Сталічны праспект»

(г. Жабінка, вул. Цітова, 3)

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Аб павелічэнні Статутнага фонда ААТ «Сталічны праспект» шляхам выпуску дадатковых акцый, якія размяшчаюцца шляхам правядзення адкрытай падпіскі.

2. Аб зацвярджэнні праспекта эмісіі акцый ААТ «Сталічны праспект».

Форма правядзення Сходу – вочная.

Месца правядзення Сходу – г. Жабінка, пасёлак Цукровага завода, клуб ААТ «Жабінкаўскі цукровы завод».

Пачатак работы сходу: **28 чэрвеня 2013 года ў 12 гадзін 30 хвілін.**

Рэгістрацыя асоб, якія маюць права на ўдзел у Сходзе, ажыццяўляецца ў дзень правядзення Сходу па месцы правядзення Сходу на падставе дакументаў, якія пацвярджаюць асобу, і належна аформленых даверанасцяў. Час пачатку рэгістрацыі: **11 гадзін 30 хвілін.** Час завяршэння рэгістрацыі: **12 гадзін.**

З матэрыяламі Сходу можна азнаёміцца **з 24 чэрвеня 2013 года па 27 чэрвеня 2013 года ў працоўныя дні з 10 да 17 гадзін.**

ОАО «Управление механизации № 91»

извещает своих акционеров, что очередное собрание акционеров состоится 19 июля 2013 года в 10 часов по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11.

Регистрация участников начинается с 08 часов 45 минут по предъявлении документа, удостоверяющего личность.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об утверждении и выплате дивидендов за II квартал 2013 года.

Тел. 8(017)223 65 80

УНП 100055130 *Наблюдательный совет ОАО «Управление механизации № 91»*

РРБ-Банк

www.rrb.by

Закрытое акционерное общество «Акционерный банк реконверсии и развития»

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ

Финансовая отчетность за год, закончившийся 31 декабря 2012 года
Закрытое акционерное общество
«Акционерный банк реконверсии и развития»

(в миллионах белорусских рублей)

	Примечания	31 декабря 2012 года	31 декабря 2011 года (пересмотрено, Примечание 7)
Активы			
Денежные средства и средства на счетах в Национальном банке Республики Беларусь	8	130,675	125,390
Производные финансовые активы	9	300,101	334,719
Средства в других банках	10	78,843	66,579
Кредиты клиентам	7,11,35	404,356	413,484
Инвестиционная собственность	12	8,434	10,473
Основные средства	13	14,838	15,623
Нематериальные активы	14	1,304	1,385
Требование по текущему налогу на прибыль		1,587	1,000
Актив по отложенному налогу на прибыль	7	-	342
Прочие активы	15	26,852	30,605
Итого активы		**966,990**	**999,600**
Обязательства			
Производные финансовые обязательства	9	13,241	15,471
Средства других банков	16	4,431	146,893
Средства клиентов	17,35	696,835	579,629
Выпущенные долговые ценные бумаги	18,35	31,088	49,183
Отложенное налоговое обязательство	7,21	5,428	-
Прочие обязательства	22	3,763	2,921
Субординированные займы	19	47,053	54,538
Привилегированные акции	20	6,228	6,827
Итого обязательства		**808,067**	**855,462**
Капитал			
Уставный капитал	23	225,455	225,455
Собственные выкупленные акции		(2)	(2)
Дополнительный вклад в капитал	19	26,213	26,213
Накопленный убыток		(92,743)	(107,528)
Итого капитал		**158,923**	**144,138**
Итого обязательства и капитал		**966,990**	**999,600**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ

Финансовая отчетность за год, закончившийся 31 декабря 2012 года
Закрытое акционерное общество
«Акционерный банк реконверсии и развития»

(в миллионах белорусских рублей)

	Примечания	2012 год	2011 год (пересмотрено, Примечание 7)
Процентные доходы	7,24,35	158,550	172,897
Процентные расходы	24,35	(79,760)	(85,748)
Чистые процентные доходы		**78,790**	**87,149**
Комиссионные доходы	25,35	14,010	18,557
Комиссионные расходы	25,35	(2,914)	(4,223)
Чистые комиссионные доходы		**11,096**	**14,334**
Чистые доходы по операциям с производными финансовыми инструментами	9,35	29,883	477,037
Чистые доходы/(расходы) по операциям с иностранной валютой	26,35	2,299	(483,937)
Чистые расходы по финансовым активам, имеющимся в наличии для продажи		(48)	-
(Расходы)/доходы от изменения справедливой стоимости инвестиционной собственности	12,35	(2,218)	4,877
Прочие доходы	27,35	4,908	8,767
Итого операционные доходы		**124,710**	**108,227**
Операционные расходы	28,35	(70,896)	(72,541)
(Уценка)/восстановление стоимости активов, полученных в погашение задолженности		(2,052)	3,577
Чистое начисление резервов под обесценение финансовых активов, по которым начисляются проценты	7,29,35	(8,672)	(32,894)
Чистое начисление резервов под обесценение прочих финансовых активов	15,35	(1,025)	-
Чистое восстановление резервов по обязательствам кредитного характера	31,35	11	527
Прибыль до отражения убытка по чистой монетарной позиции и расходов по налогу на прибыль		**42,076**	**6,896**
Убыток по чистой монетарной позиции	7,35	(19,507)	(136,752)
Прибыль/(убыток) до расходов по налогу на прибыль		**22,569**	**(129,856)**
(Расходы)/восстановление расходов по налогу на прибыль	7,21,35	(7,784)	6,098
Чистая прибыль/(чистый убыток) за год		**14,785**	**(123,758)**

ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИЯХ В КАПИТАЛЕ

Финансовая отчетность за год, закончившийся 31 декабря 2012 года
Закрытое акционерное общество «Акционерный банк реконверсии и развития»

(в миллионах белорусских рублей)

	Примечания	Уставный капитал	Собственные выкупленные акции	Дополнительный вклад в капитал	Накопленный убыток	Итого капитал
Остаток на 1 января 2011 года		**225,455**	**(2)**	**26,213**	**16,232**	**267,898**
Чистый убыток за год (первоначально отражено)		-	-	-	(118,633)	(118,633)
Результат пересмотра	7	-	-	-	(5,125)	(5,125)
Чистый убыток за год (пересмотрено, Примечание 7)		-	-	-	(123,758)	(123,758)
Совокупный убыток за год (пересмотрено, Примечание 7)		**-**	**-**	**-**	**(123,758)**	**(123,758)**
Операции с собственниками, отражаемые напрямую в капитале						
Дивиденды выплаченные	20	-	-	-	(2)	(2)
Остаток на 31 декабря 2011 года (пересмотрено, Примечание 7)		**225,455**	**(2)**	**26,213**	**(107,528)**	**144,138**
Чистая прибыль за год		-	-	-	14,785	14,785
Совокупный доход за год		**-**	**-**	**-**	**14,785**	**14,785**
Остаток на 31 декабря 2012 года		**225,455**	**(2)**	**26,213**	**(92,743)**	**158,923**

ОТЧЕТ О ПРОЧЕМ СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ

Финансовая отчетность за год, закончившийся 31 декабря 2012 года
Закрытое акционерное общество
«Акционерный банк реконверсии и развития»

(в миллионах белорусских рублей)

	2012 год	2011 год (пересмотрено, Примечание 7)
Чистая прибыль/ (чистый убыток) за год	**14,785**	**(123,758)**
Прочий совокупный доход	-	-
Итого совокупный доход/(убыток) за год	**14,785**	**(123,758)**

ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ (ПРЯМОЙ МЕТОД)

Финансовая отчетность за год, закончившийся 31 декабря 2012 года
Закрытое акционерное общество «Акционерный банк реконверсии и развития»

(в миллионах белорусских рублей)

	Примечания	2012 год	2011 год (пересмотрено, Примечание 7)
Движение денежных средств, полученных от/ (использованных в) операционной деятельности			
Проценты полученные		156,534	172,497
Проценты уплаченные		(80,315)	(82,341)
Комиссии полученные		13,981	17,766
Комиссии уплаченные		(2,904)	(4,244)
Доходы, полученные по операциям с производными финансовыми инструментами		5,214	31,920
Доходы полученные/(расходы уплаченные) по операциям с иностранной валютой	26	15,125	(43,090)
Расходы по операциям с финансовыми активами, предназначенными для продажи		(48)	-
Полученные прочие операционные доходы		4,790	8,792
Уплаченные операционные расходы		(66,662)	(68,662)
Уплаченный налог на прибыль		(2,779)	(7,861)
Движение денежных средств, полученных от операционной деятельности до изменений в операционных активах и обязательствах		**42,936**	**24,777**
Чистое (увеличение)/ уменьшение операционных активов:			
Обязательные резервы на счетах в Национальном банке Республики Беларусь		(4,218)	(4,293)
Средства в других банках		(9,598)	18,281
Кредиты клиентам	7	(69,777)	(139,719)
Финансовые активы, имеющиеся в наличии для продажи		-	25,179
Финансовые активы, удерживаемые до погашения		(2,629)	-
Прочие активы		(554)	5,202
Чистое увеличение/(уменьшение) операционных обязательств:			
Средства других банков		(126,561)	30,223
Средства клиентов		226,197	239,225
Прочие обязательства		(57)	(5,055)
Чистый приток денежных средств, полученных от операционной деятельности		**55,739**	**193,820**
Движение денежных средств, полученных от/ (использованных в) инвестиционной деятельности			
Приобретение основных средств и нематериальных активов		(1,963)	(3,579)
Выручка от реализации основных средств		175	37
Приобретение объектов инвестиционной собственности и затраты на модернизацию		(179)	(1,767)
Чистый отток денежных средств, использованных в инвестиционной деятельности		**(1,967)**	**(5,309)**
Движение денежных средств, полученных от/ (использованных в) финансовой деятельности			
Погашение процентов по субординированным займам		(198)	(1,756)
Дивиденды уплаченные		-	(2)
Размещение выпущенных долговых ценных бумаг			53,335
Погашение выпущенных долговых ценных бумаг		(10,603)	(74,942)
Чистый отток денежных средств, использованных в финансовой деятельности		**(10,801)**	**(23,365)**
Влияние изменения обменного курса на денежные средства и их эквиваленты		2,307	22,631
Влияние инфляции на денежные средства и их эквиваленты	7	(38,051)	(129,025)
Чистое увеличение денежных средств и их эквивалентов		**7,227**	**58,752**
Денежные средства и их эквиваленты на начало года	**30**	**187,250**	**128,498**
Денежные средства и их эквиваленты на конец года	**30**	**194,477**	**187,250**

От имени руководства Банка:

И.о. Председателя Правления **Юркевич Н.К.**

Главный бухгалтер **Карчмит Т.И.**

Минск
20 мая 2013 года

Годовая финансовая отчетность по МСФО вместе с аудиторским заключением, подтверждающим ее достоверность, размещена на сайте www.rrb.by в разделе «О банке/Отчетность по МСФО/Финансовая отчетность за 2012 г./

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 21 от 7.06.2013. УНП 100155376.

белагропромбанк

традиции будущего

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2013 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2013 г.	2012 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		818 024,7	1 007 967,6
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		6 445,7	4 409,5
4	Средства в Национальном банке	1103		4 236 283,0	4 385 454,3
5	Средства в банках	1104		1 480 170,6	902 741,2
6	Ценные бумаги	1105		5 037 173,4	4 947 884,7
7	Кредиты клиентам	1106		44 366 104,2	44 385 537,5
8	Производные финансовые активы	1107		193,8	793,7
9	Инвестиции в зависимые юридические лица			-	-
10	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица			-	-
11	Долгосрочные финансовые вложения	1108		181 266,9	181 199,9
12	Основные средства и нематериальные активы	1109		2 697 030,7	2 703 060,6
13	Имущество, предназначенное для продажи	1110		-	-
14	Деловая репутация			-	-
15	Прочие активы	1111		859 206,4	681 966,8
16	ИТОГО активы	11		59 681 899,4	59 201 015,8
17	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
18	Средства Национального банка	1201		1 201 651,8	1 198 044,2
19	Средства банков	1202		9 386 122,0	10 856 567,8
20	Средства клиентов	1203		30 450 329,4	28 891 051,4
21	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		7 433 331,7	7 438 960,2
22	Производные финансовые обязательства	1205		32,1	-
23	Прочие обязательства	1206		973 748,0	906 188,7
24	ВСЕГО обязательства	120		49 445 215,0	49 290 812,3
25	**КАПИТАЛ**				
26	Уставный фонд	1211		6 603 591,0	6 603 591,0
27	Эмиссионный доход	1212		-	-
28	Резервный фонд	1213		506 703,8	330 216,6
29	Фонд переоценки статей баланса	1214		1 446 460,3	1 429 597,7
30	Накопленная прибыль	1215		1 652 653,8	1 520 533,2
31	Всего капитал, принадлежащий головной организации - банку			10 209 408,9	9 883 938,5
32	Доля неконтролирующих акционеров			27 275,5	26 265,0
33	ВСЕГО капитал	121		10 236 684,4	9 910 203,5
34	ИТОГО обязательства и капитал	12		59 681 899,4	59 201 015,8

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о прибыли и убытках за январь-март 2013 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2013 год	2012 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		2 567 657,5	2 826 404,2
2	Процентные расходы	2012		1 882 526,6	2 153 547,2
3	Чистые процентные доходы	201		685 130,9	672 857,0
4	Комиссионные доходы	2021		213 142,8	164 586,4
5	Комиссионные расходы	2022		40 047,0	26 858,7
6	Чистые комиссионные доходы	202		173 095,8	137 727,7
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		184,0	212,6
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		7 851,4	14,0
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		46 423,3	47 054,5
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		(2 911,1)	(28 205,7)
11	Чистые отчисления в резервы	207		308 159,3	330 062,0
12	Прочие доходы	208		331 808,2	136 156,1
13	Операционные расходы	209		464 105,0	300 315,2
14	Прочие расходы	210		57 322,7	37 395,4
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		411 995,5	298 043,6
16	Налог на прибыль	212		115 834,8	81 902,3
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		296 160,7	216 141,3
18	Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц			-	133,9
19	Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц			-	-
20	ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)			296 160,7	216 275,2
21	Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации - банку			294 874,5	215 746,2
22	Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке)			1 286,2	529,0
23	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях				
24	Базовая прибыль на простую акцию	22		-	-
25	Разводненная прибыль на простую акцию	23		-	-

Председатель Правления **В.И. Подковыров**

Главный бухгалтер **М.А. Шаповалова**

Дата подписания 30 мая 2013 г.

Консолидированная финансовая отчетность по состоянию на 1 апреля 2013 года размещена на странице интернет-сайта ОАО «Белагропромбанк»:
http://www.belapb.by/rus/about/bank-activity/indexes/finansovaya-otchetnost-bankovskogo-holdinga/konsolidirovannaya-kvartalnaya-otchetnost/

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ДЫДАКТЫ ПЕДАГОГІКІ

Шмат размоў — і было, і ёсць — пра навучальны працэс у школе: то ён дванаццацігадовы, то адзінаццаці... То з пяцідзённым тыднем, то з шасцідзённым... Укараняюцца новыя падыходы, методыкі выкладання прадметаў, мяняецца ці не ўсё і пастаянна.

Маё ж пакаленне заканчвала 8 альбо 10 класаў, пасля якіх пры жаданні кожны мог вучыцца далей — хто ў вучылішчы, хто ў тэхнікуме... Нават ва ўніверсітэты мы паступалі! Прычым без рэпетытараў! Адно — да настаўнікаў часам звярталіся альбо самі вучні, альбо іх бацькі — прасілі, каб дапамагалі. Тыя, як правіла, не адмаўлялі: рыхтавалі да экзаменаў, хто па дабраце душэўнай, а хто і з разлікам... Як, прынамсі, мае добрыя знаёмыя, настаўнікі фізікі... Праўда, «разлік» той да жонак яны не даносілі: выкарыстоўвалі — скажам так — на добры настрой...

Шыла, як вядома, у торбе не схаваеш: чуткі пра іх самадзейнасць, пра «злоўжыванне» дайшлі да раённага начальства. А можа, і «добразычліўцы» данеслі? Ці нават родная жонка (у аднаго з фізікаў яна ў райана працавала). Карацей, «зламыснікаў» вырашылі правучыць — праверыць іх на адпаведнасць прафесіі. Прызначылі дату.

І вось тая атэстацыя. Выклікаюць першага настаўніка і, як двоечніка якога, пачынаюць пытаць. Загадчык райана просіць, прынамсі, каб назваў ён прозвішчы самых вядомых дыдактаў педагогікі.

Фізік памаўчаў, падумаў, а потым давай загінаць пальцы, давай называць: перш-наперш — прозвішча-імя... загадчыка райана, яго намесніка, уласнай жонкі...

Эмоцый было — цераз край! Нехта, каб мог, пакаціўся б ад рогату, нехта — «узарваўся» б ад гневу... Але ж гэта не на вуліцы, не каля піўной, гэта — не бабы на базары, а райана...

Загадчык яго першым не вытрымаў: падскочыў, пачырванеў, як бурак — паказаў настаўніку на дзверы.

Той, вядома ж, выйшаў...

І, дзякаваць Богу, сухім з каламутнай вады — па-ранейшаму працаваў, па-ранейшаму, чым мог, дапамагаў вучням.

Атрымліваецца, што веданне прадмета ды вопыт яго выкладання і ёсць самы лепшы дыдактычны матэрыял. Іншым яго не падменіш.

Аляксандр Матошка,

г.п. Расоны.

«ДОЖДЖ ЗМЫЕ...»

Гэтая прыгода адбылася з адным досыць высокім начальнікам. Праўда, высокім у сваім горадзе ці нават і ў вобласці. А вось у сталіцы...

Значыць, надумаў гэты чалавек (назавём яго Львовічам) у адпачынак паехаць. І не на Нарач — яму туды без праблем — а далёка за межы, і ў Мінск падаўся, каб візу адкрылі.

Чын чынам там: пасольства, парадак, чарга. І ні начальнікаў у ёй, ні падначаленых — роўныя ўсе. Хто сядзіць, хто стаіць... Чакаюць. Але ж часу пры гэтым шкада... Да таго ж у Львовіча патрэба адна ўзнікла.

— Ты тут пасядзі, — загадаў ён жонцы, — а я адыдуся... Хвілін на дзесяць.

Ну вядома ж, не ўпершыню яму быць у Мінску — горад не чужы. Ведаў, што паблізу, прынамсі, гасцініца ёсць, ён падчас камандзіровак спыняўся там, адразу на ўваходзе запаветныя літаркі бачыў — «М» і «Ж».

А дзверы адчыніў... Не той каленкор. Ну зусім... І швейцар, як чорт з табакеркі:

— Чаго жадаеце?

Разгубіўся Львовіч: няёмка ж сказаць, чаго (канкрэтна)... Да таго ж і літар патрэбных на месцы няма...

Сышоў: ну не клінам жа свет на гэтай гасцініцы? Цэнтр горада, можна сказаць — значыць, павінна ж быць прыбіральня! У крайнім выпадку ў кавярню можна зайсці...

І чалавек прасцейшы, смялейшы гэта б лёгка зрабіў, прычым нікому нічога не кажучы... А Львовіч — ён не такі. Ён чалавек інтэлігентны, далікатны. У такіх за правіла, зайшоўшы ў кавярню за столік сесці і хоць бы кавы якой заказаць. А ўжо потым рушыць да патрэбных дзвярэй — нібыта рукі памыць...

Але ж гэта ўсё з часам... А ў Львовіча ён адкуль: жонку на 10 хвілін пакінуў. А ўжо і 20 прабегла.

Прыказку ўспомніў, што язык да Кіева давядзе. І дворнічыха якраз... Як на шчасце — вуліцу падмятае, за гаспадыню тут. Значыць, ведае?

Падышоў. Так і так, маўляў, справа жыццёвая: падкажыце...

Жанчына б, падобна, з радасцю, але... Лоб пад кепкай пачухала (што азначала: нічога тут паблізу няма) і раптам выдала:

— А пайшлі. Я цябе... у сваю завяду!

Рушыла... Львовіч за ёй.

Ідзе, праўда, і думае, якія кантрасты: у яго вось, досыць вялікага начальніка, асобнай прыбіральні няма і ніколі не будзе — разам з усімі ходзіць, а дворнічыха — мае. І смела вядзе... Праўда, чамусьці далекавата...

Быццам пачула яна — спынілася (у пустым двары), паглядзела вакол, кажа:

— Можна тут. Дождж змые...

Бажыўся потым Львовіч, што пры іншых абставінах нізавошта б *там*... А пры гэтых... Азірнуўся, пераканаўся, што ніхто не бачыць, зрабіў сваю справу і, падзякаваўшы, з палёгкай рушыў назад — у сваю чаргу.

Адно па дарозе бянтэжыла: а што калі зараз пра той запаветны «маленькі дамок» папытаецца жонка? Яе ж у тое самае месца не пашлеш?

Хоць дарогу Львовіч і помніў...

Л.Г.

г. Гродна

СУКЕНКА ТАКСАМА БЫЛА ПРЫГОЖАЯ

...Мы, зусім маладыя, працавалі тады ў адным вытворчым аддзеле: працавалі з праектнай дакументацыяй, з заяўкамі на матэрыялы, з графікамі выканання работ... Усё гэта патрабавала выключнай акуратнасці, выключнай адказнасці, але, як часта бывае, зусім не цанілася: плацілі за працу няшмат. Таму мужчын у нашым аддзеле, можна сказаць, не было — пераходзілі на вытворчасць. А вось жанкі — заставаліся. І пры гэтым, як бы ні былі загружаны, заўсёды знаходзілі час пагаманіць, пасакрэтнічаць, абмеркаваць праблемы. У тым ліку — сямейныя.

Маўчала пра іх хіба наша Аленка — вельмі прыгожая, спакойная маладзіца. А вось вочы яе — заўсёды сумныя — гаварылі: няма ў доме ладу.

Як маглі, падтрымлівалі жанчыну, павучалі: маўляў, калі што, не цярпі, не паказвай моды, а то...

Алена парад не любіла, але ж, як высвятлялася, пэўныя высновы рабіла.

Неяк, прынамсі, прасуючы бялізну, убачыла праз адчыненае акно, што муж дахаты ідзе. А на лаўцы якраз іншыя мужчыны... Пытаюцца ў яго: «Міша, ты куды так спяшаешся?». Ён у адказ: «Ды пайду — сваю бабу паганяю».

Ёй як анучай па зубах: цэлы дзень адпрацавала, у абед па крамах пабегала — усё купіла, есці наварыла, у хаце прыбрала, стаіць во, адзежу прасуе... А «гаспадар» яе грошы прапіў, вочы заліў ды яшчэ і ганяць яе хоча?!

Карацей, наблізіўся той з ваяўнічым выглядам, а жонка прас угору і на яго: адыдзі, маўляў, а то...

Сказала так, замахнулася — і незнарок у лоб яму трапіла. А прас жа гарачы...

Муж, што здзівіла, нават не войкнуў, не закрычаў. Ён — ад той неспадзеўкі — аслупянеў, не іначай!

Усе назаўтра пыталіся: «Міша, а што гэта ў цябе за шнар?» «Ды жонка, — смяяўся, — у лоб дала».

Значыць, хоць нешта ды разумеў чалавеча? А далей — болей...

У тыя часы (вы, магчыма, помніце?) дэфіцыт быў — лічы, што на ўсё. А тут Аленка наша ў камандзіроўку з'ездзіла і — пашчасціла дзеўцы — такую сукенку адхапіла!.. Мы, убачыўшы, проста ахнулі, бо і да твару ёй, і па фігуры, і модна, і зручна — хоць кожны дзень апранай. А яна, бачым, адзін дзень пафарсіла — і ўсё. Пытаемся: «Ты чаму гэта? На Вялікдзень пакідаеш ці як?». А яна ледзь не ў слёзы: «Ды няма, — кажа, — новай сукенкі. Міша мой на стужкі парэзаў».

Нам, жанчынам, аж мову адняло. А потым наперабой: як гэта парэзаў? Чаму? Навошта? Лена кажа: «Не спадабалася, што без яго купіла». «Во шаленец! Во дурань! — загаманілі мы. — Няўжо даруеш?!»

Яна нам нічога не адказала. Але ж план прыдумала. Аднаго разу мужык яе да бацькоў у вёску паехаў, прыгожы спартыўны касцюм там па блаце купіў — дома ў шафу павесіў. Сабраўся назаўтра апрануць — куртка ёсць, а штаноў няма. «Можа, ты куды перавесіла ці схавала?» — пытае ў Аленкі. «Пад ложкам глядзі», — адказвае тая.

Нагнуўся муж, і сапраўды — сінеюцца там, ляжаць. Выцягнуў — на вузкія палоскі парэзаныя.

«Думала, біцца да мяне палезе — але не: плюнуў, закінуў абнову назад і з хаты», — расказвала нам жанчына.

...Вось так пачыналі яны сваё сумеснае жыццё. Цяпер, здараецца, бачу, як завяршаюць. Аленка па-ранейшаму спакойная, упэўненая ў сабе, займае адказную пасаду. Міша яе неяк рана пастарэў, але ж жыве — жыве ў сям'і, са сваімі дзецьмі, са сваімі ўжо ўнукамі.

Валянціна П.,

г. Ляхавічы.

ЯК МЫ РАТАВАЛІ ДЗЯДЗЬКУ

Было гэта ў часы маёй ранняй маладосці. Я тады хадзіла ў дзясяты клас, жыла ў вёсцы. Нават не ў ёй самой, а крыху паводдаль — у завулачку хат на восем, аддзеленым безыменнай рачулкай. Ціхае месца.

Гучныя, як і ўсюды, размяшчаліся ў нас у цэнтры. Там былі і школа, і крама, а таксама клуб, дзе па суботах і нядзелях адбываліся танцы. Але мы з сяброўкай Соняй на іх не хадзілі: нам настаўнікі не дазвалялі. А вось у кіно мы бегалі. Спачатку з ёй удзвюх, потым — ужо ўтрох, з настаўніцай: у яе, новенькую, зусім маладзенькую, проста без памяці закахаўся наш сусед, курсант Харкаўскага лётнага вучылішча, жаніўся, перавёз да сваіх бацькоў. Сам паехаў давучвацца, а Вольга Васільеўна засталася яго чакаць: нікуды ні з кім не хадзіла, апроч як у тое кіно — са мною і Соняй.

Дык вось. У чарговы раз мы згаварыліся, сустрэліся, рушылі — нават подбегам, бо вельмі холадна было... Але ж на дарогу пры гэтым глядзелі...

Здалёку ўбачылі — напярадзе нешта чарнеецца: чалавек на зямлі ляжыць. Нахіліліся — добра знаёмы нам калгасны каваль дзядзька Серафім.

Неяк расштурхалі яго, сталі падымаць, узяўшы пад рукі. А ў яго... порткі перашкодзілі — на калені спаўзлі. Як спутаны. Зусім не можа ісці.

Што было рабіць — на дарозе ж яго не кінеш! Сталі падцягваць мы тыя порткі. А ў дзядзькі, як на ліха, ні дзяжкі на поясе, ні апліка, ні гузіка... Адно застаецца — у руках трымаць.

Карацей, толькі нарэшце мы неяк прыладзіліся: удзвюх пад рукі дзядзьку вялі, а трэцяя ззаду — за штаны «адказвала». Гэта, дарэчы, было самае складанае, таму за дарогу мы некалькі разоў мяняліся месцамі.

Намучыліся, вам не расказаць! Але ж прывялі каваля дадому, а самі тут жа назад, у кіно.

Толькі назаўтра даведаліся, што дзядзька Серафім у суседні Клецкі раён ездзіў на млын, вазіў малоць зерне і не толькі сваё, але і суседскае. Дзе загуляў ды напіўся. Дзе дзеўся яго конь і мяхі з мукою — цяпер не ў памяці. У памяці — што лютаваў мароз. Таму дзядзька Серафім быў, як водзіцца, у сподніках. Калі б без, мы, дзяўчаты, яго наўрад ці ўратавалі б.

Ірына Рудкоўская,

в. Хатынічы, Ганцавіцкі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

■ Шпацыр па Камароўцы

«Чарнічная» радасць і «бульбяное» здзіўленне

Першыя грыбы і ягады з лесу паціху «мігруюць» на рыначныя прылаўкі. Клубніцы, чарэшня і іншая сезонная смаката ўжо некалькі тыдняў «даймае» найбольш эканомных пакупнікоў сваімі цэнамі. А між іншым, чарніцы цяпер прадаюць па мінулагодняй цане, у той час як суніцы падаражэлі.

Фота Анатоля КІПЕЦЬЧУКА.

— Зараз якраз найбольшы выбар, толькі гадзіну як прывезлі ягады на рынак, — рэкламуе мне свой тавар прадавачка з дзіўнай высокай прычоскай.

На прылаўку сапраўды стаяць дзясяткі два паўлітровых шкляначак з суніцамі і чарніцамі. У некаторыя тавар яшчэ дасыпаецца. Жанчына размаўляе са мной, набіраючы ягады ў жменю з вялікага вядра:

— Пакаштуйце, толькі ўчора вечарам збіралі.

Пытаюся пра кошт. За паўлітра чарніц жанчына просіць 20 тысяч рублёў, а такая ж колькасць суніц абыдзецца на 10 тысяч даражэй. Вырашаю прайсці далей і ацаніць «маштабнасць» прапановы. На Камароўцы і суніц, і чарніц дастаткова. У прынцыпе, яны не надта падаражэлі з мінулага года. Суніцы тады каштавалі 25 тысяч за кілаграм, цяпер жа — 30 тысяч, а чарніцы і ўвогуле прапануюць па леташняй цане, што надта радуе.

У многіх прадаўцоў на прылаўках стаяць і паўлітровыя вядзерцы лісічак. Сярод жоўтых грыбкоў цяжка заўважыць вялікія «экзэмпляры» — усе дробныя. Кошт у іх супадае з «сунічным» — таксама 30 тысяч за паўлітра (летась, між іншым, лісічкі ў гэты час каштавалі 15 тысяч).

Наглядзеўшыся на грыбы дробныя, захацелася знайсці штосьці «пасур'ёзней». Пасля доўгага «прыглядання» да камароўскага тавару нарэшце знаходжу жаданае — два вядзерцы падасінавікаў. Побач «прымасціліся» паўлітровыя пасудзіны з больш дробнымі грыбкамі.

— Трохлітровае вядзерца — 120 тысяч. Трохі меншае аддам за 100, а паўлітровікі — па 30 тысяч, — расказала прадавец адзіных «сапраўдных» на ўсю Камароўку грыбоў.

— Відаць, доўга збіралі? — цікаўлюся ў яе прычынай такога кошту.

— Муж увесь выхадны прахадзіў, — коратка адказала жанчына.

Побач, дарэчы, прадавалі маладую бульбу з уласных агародаў. Трэба сказаць, што на латках «прывятнікаў» яна каштуе на 3—5 тысяч танней, чым сярод іншай прадукцыі на галоўных рынкавых радах. Там, у асноўным, за кілаграм просяць 15 тысяч, чаму нельга не здзівіцца. Летась у гэты час самыя вялікія і адборныя клубні каштавалі 5 тысяч за кілаграм.

Нарэшце «спусцілася з нябёсаў» цана на чарэшню. Замест 100 тысяч, якія прасілі прадаўцы колькі тыдняў таму, цяпер патрэбна заплаціць ад 30 да 40 тысяч за кілаграм. Зусім зніклі дарагія замежныя клубніцы. Самыя буйныя ягады «беларускага паходжання» каштуюць 35 тысяч за кілаграм, а заплаціўшы 6 тысяч, можна набыць кілаграм дробных (калі хопіць цярпення іх упарадкаваць, таксама неблагі варыянт для варэння). «Сярэднія» клубніцы каштуюць 18 — 20 тысяч.

Патаннела прыкладна на 5 тысяч у параўнанні з коштам, які быў пару тыдняў таму, і ўся зеляніна. Кроп і пятрушка, напрыклад, прадаюцца па 5 тысяч за 100 грамаў, а рукала, базілік, тархун, шпінат каштуюць 10 тысяч рублёў за 100 грамаў. Так што ёсць у камароўскіх цэнах і чаму падзівіцца, і на чым зэканоміць.

Лічыльнік «Звязды»

(цэны за кілаграм, калі не пазначана іншае)

АБРЫКОСЫ — 20 — 22 тысячы
ПЕРСІКІ — 32 — 35 тысяч
АПЕЛЬСІНЫ — 14 тысяч
ЛІМОНЫ — 27 тысяч
ГРЭЙПФРУТЫ — 28 тысяч
БАНАНЫ — 11 — 12 тысяч
ЯБЛЫКІ — 13 — 16 тысяч
ВІНАГРАД — 25 — 28 тысяч
АВАКАДА — 18 тысяч (за шт.)
ПЕРАЦ — 27 — 37 тысяч
ПАМІДОРЫ — 16,5 — 27,6 тысячы
БАКЛАЖАНЫ — 30 тысяч
КАБАЧКІ — 7,5 — 10 тысяч
АГУРКІ — 5 — 7 тысяч
ЧАСНОК — 2 — 3 тысячы (за шт.)
МОРКВА — 22 тысячы
САЛАТА — 10 тысяч
ЦВЁРДЫ СЫР — 50 — 90 тысяч
СВІНІНА (паляндвіца) — 85 тысяч
ЯЛАВІЧЫНА (паляндвіца) — 110 — 140 тысяч
КУРЫНАЕ ФІЛЕ — 49 — 53 тысячы
ЯЙКІ КУРЫНЫЯ — 10 — 13 тысяч (дзясятак)

Ганна ГАРУСТОВІЧ

■ Навіны сталіцы

Да канца года адкрыюцца яшчэ 4 гіпермаркеты

У сталіцы да канца гэтага года плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 4 гіпермаркеты. Яны будуюцца на скрыжаванні пр. Незалежнасці і МКАД, у жылым раёне Лошыца, на вул. Прытыцкага, на скрыжаванні Даўгінаўскага тракту і МКАД (апошні — гіпермаркет па продажы будаўнічых матэрыялаў). Пра гэта журналістам расказаў першы намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Аляксей Раманаў. Такім чынам, к канцу 2013 года ў Мінску будуць функцыянаваць 19 гіпермаркетаў. У 2014 годзе плануецца ўвесці яшчэ 12 буйных гандлёвых аб'ектаў агульнай плошчай каля 80 тыс. кв. м.

Развіццё гандлёвай сеткі ў Мінску адбываецца ў адпаведнасці з зацверджанымі схемамі, якія штогод актуалізуюцца, патлумачыў А. Раманаў. Першая схема прадугледжвае размяшчэнне ў горадзе буйных аб'ектаў, якія маюць гандлёвую плошчу не менш за 3,5 тыс. кв. м. Сёння ў сталіцы функцыянуюць 42 такія прадпрыемствы гандлю, яшчэ 43 знаходзяцца на стадыі праектавання і будаўніцтва. Другая схема датычыцца размяшчэння аб'ектаў рознічнага гандлю і грамадскага харчавання крокавай даступнасці. У яе ўвайшлі 300 пляцовак у мікрараёнах горада, якія выдзяляюцца інвестарам пад будаўніцтва па выніках правядзення аўкцыёнаў.

Сёлета ў сталіцы адкрыта 177 аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання, у тым ліку 134 крамы гандлёвай плошчай 28,3 тыс. кв. м, 2 гандлёвыя цэнтры (36 тыс. кв. м) і 41 аб'ект грамадскага харчавання на 3188 пасадачных месцаў. Прырост гандлёвых плошчаў, які чакаецца за кошт будаўніцтва буйных аб'ектаў у гэтым годзе, складзе каля 90 тыс. кв. м. Гэта амаль удвая больш. чым у 2012 годзе, удакладніў А. Раманаў.

«Мінск-Навіны»

Даты — Падзеі — Людзі

1821 год — нарадзіўся Аляксандр Максімавіч Семянтоўскі, беларускі і расійскі археолаг, фальклярыст, этнограф і краязнаўца. У 1860—1890-х гадах — сакратар Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта, рэдактар неафіцыйнай часткі «Витебских губернских ведомостей», пазней — рэдактар «Памятной книжки Витебской губернии». У якасці прызнання заслуг у 1862 годзе Семянтоўскі быў абраны членам-супрацоўнікам Вольнага эканамічнага таварыства, у 1863 годзе — членам-супрацоўнікам Рускага геаграфічнага таварыства, а ў 1864-м — членам-карэспандэнтам Маскоўскага археалагічнага таварыства, у 1867 годзе ён стаў карэспандэнтам Расійскага таварыства аховы жывёл. Аўтар навуковых прац па археалогіі, статыстыцы, побыце і культуры насельніцтва Віцебшчыны. Сабраў каштоўныя звесткі пра многія беларускія замкі, замчышчы і курганы. Вялікім унёскам у нацыянальную духоўную скарбніцу стала складзенае А. Семянтоўскім апісанне знакамітага крыжа Еўфрасінні Полацкай. Памёр у 1893 годзе.

1881 год — у Мінску адкрыта падпольная друкарня «Черного передела». У Пецярбургу друкарня «правалілася», і новую гэтай народніцкай арганізацыі вырашылі стварыць далей ад сталіцы. Выбар прыпаў на Мінск. У арганізацыі друкарні актыўны ўдзел прыняў Г.В. Пляханаў, які прыязджаў у 1880 годзе ў горад ў другі раз. Друкаваліся ў Мінску таксама часопіс «Чёрный передел», газета для працоўных «Зерно» і пракламацыі, яны распаўсюджваліся па ўсёй Расіі.

1933 год — нарадзіўся (г.Магілёў) Уладзімір Рыгоравіч Цішкоўскі, беларускі вучоны ў галіне эндакрыналогіі, кардыялогіі, рэўматалогіі і сексалогіі, доктар медыцынскіх навук (1984), прафесар (1985). Аўтар навуковых прац па вывучэнні стану наднырачнікаў у хворых на рэўматызм, дыягностыцы і лячэнні вострага інфаркту міякарда, цукровага дыябету.

Было сказана

Андрэй ВОЛЯН, палітычны дзеяч, філосаф, ідэолаг Рэфармацыі:

«Чалавек, які не спазнаў мудрасці, не здольны як след распараджацца і сваім багаццем».

У гэты цудоўны сонечны дзень сардэчна віншуем нашу дарагую, любімую матулю, бабулю, прабабулю **Яўгенію Ільінічну ХАЛЗАКОВУ** з в. Іграева Слуцкага раёна з 75-годдзем.

Жадаем моцнага здароўя і сіл на тое, што ўвагі просіць, хай кожны дзень, табой пражыты, паболей радасці прыносіць.

Гады спыніць, на жаль, не маем рады,
А ў юбілей мы хочам пажадаць
Натхнення, сонца, божае спагады,
А мы цябе заўсёды будзем шанаваць.

Родныя з Мінска, Слуцка, Хоцімска, Бялынічаў і Грабянца.

Дарагія пляменнікі **Таццяна і Міхаіл ТАРАСЕВІЧЫ** з Мінска!

Прыміце мае сардэчныя віншаванні з нагоды сярэбранага вяселля!

Зычу ўсяго самага добрага вашай сям'і.

Ваша Новік Таісія Іванаўна.

Организация **ЗАКУПИТ** оптом от 3 тонн
ОХЛАЖДЕННУЮ СВИНИНУ
2-ой категории у ИП и юр.лиц по безналичному расчету
ООО "Евроторг" УНП 101168731
Тел.: 8 (044) 7888 503

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.37	21.46	17.09
Віцебск	4.18	21.44	17.26
Магілёў	4.27	21.36	17.09
Гомель	4.34	21.23	16.49
Гродна	4.54	21.59	17.05
Брэст	5.05	21.50	16.45

Месяц

Поўня 23 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Марфы, Марыі, Фёклы, Аляксандра, Аляксея, Кірылы.*
К. *Паўліны, Інакенція, Тамаша, Яна.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+21..+23°С	КІЕЎ	+27..+29°С	РЫГА	+21..+23°С
ВІЛЬНЮС	+24..+26°С	МАСКВА	+22..+24°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+20..+22°С

УСМІХНЕМСЯ

— Хачу хамяка.

— Яго трэба даглядаць, сачыць за ім, прыбіраць, рэгулярна карміць, мяняць ваду, гуляць з ім.

— Хачу стаць хамяком.

Самае страшнае ў грамадскім транспарце — гэта не кантралёры і не алкаголікі, і нават не брытагаловыя хуліганы, а два пятыя класы, якія вяртаюцца з цырка.

Бальніца. Жанчына з праблемамі ў інтымным плане на прыёме ў псіхолага. Урач:

— А вы паспрабуйце разнастаіць ваша сексуальнае жыццё. Напрыклад, перапраніцеся ў любімага мужам персанажа з анлайн-гульняў.

Пацыентка:

— Ну і дзе я вазьму касцюм танка?

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н.КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, Л.СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 24.022. Індэкс 63850. Зак. № 2675.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 21 чэрвеня 2013 года.